Літ ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

20 ЛЮТАГА 2004 г. № 8/4245

АНОНС!

Набліжаецца 60-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Установа «Літаратура і Мастацтва» праводзіць агульнанацыянальную акцыю па стварэнні кнігі «Наша Перамога». Запрашаем усіх, хто зацікаўлены, да супрацоўніцтва.

Культура — шлях да гарманізацыі грамадства і чалавека. *(Гутарка з міністрам культуры Беларусі Леанідам ГУЛЯКАМ)*

2-3

ФОРУМ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

XI МІНСКАЯ МІЖНАРОДНАЯ КНІЖНАЯ ВЫСТАВА-КІРМАШ

КНІГІ БЕЛАРУСІ 2004

17 лютага ў павільёне Нацыянальнага выставачнага цэнтра «БЕЛЭКСПА» адкрылася XI Міжнародная кніжная выстава-кірмаш «Кнігі Беларусі—2004».

СТАР. 3

ЗЕМЛЯКУ, ПАЭТУ-ПЕСНЯРУ...

У Касцюковічах прайшлі ўрачыстасці з нагоды юбілею з дня нараджэння Аркадзя Куляшова.

Для раёна юбілейная дата — 90-годдзе народнага паэта — значная падзея. Рыхтавацца да яе пачалі загадзя. У школах, бібліятэках правялі літаратурныя чытанні, вечарыны і лекторыі, удзельнікамі якіх у большасці былі вучні школ. Напярэдадні юбілею ўлады паклапаціліся і пра тое, каб перавезці некаторыя экспанаты Новасаматэвіцкага літаратурнага музея — стэнды, асабістыя рэчы, кнігі паэта — у Касцюковіцкі краязнаўчы музей.

— Зроблена гэта для таго, — расказвае намеснік старшыні райвыканкама Віктар Сугак, — каб найбольшая колькасць прыхільнікаў таленту нашага паэта-земляка змаглі дакрануцца душой да вялікай паэзіі.

Шостага лютага літаратурную выставу экспанатаў у краязнаўчым музеі, пасля шасцісотага прыхільніка творчасці Куляшова, наведалі яго родзічы — дачка Валянціна, унук Уладзімір і праўнучка Алеся.

А ўрачысты вечар распачаўся з дакументальнага фільма пра Аркадзя Куляшова. На родным вясковым падворку яго сустракае маці: на вачах слёзы радасці.

Наступныя кадры фіксуюць паэта ў наваколлі вёскі Саматэвічы: у бярозавым гаі, на лугах і ўзгорках, берагах паўнаводнай Бесядзі, сярод вяскоўцаў і вучняў.

Менавіта пра сустрэчы з людзьмі, але больш дэталёва, чым у кіно, расказала пра паэта яго дачка, Валянціна Куляшова. Яна таксама нагадала творчую спадчыну бацькі: паэтычныя зборнікі, пераклады А. Пушкіна, М. Лермантава, І. Катлярэўскага, А. Малышкі і многіх іншых паэтаў, плённую працу Куляшова-драматурга.

Расказала Валянціна Аркадзьеўна і пра выключную працаздольнасць бацькі. У прыватнасці, пра тое, што Аркадзь Куляшоў усе свае творы пісаў лежачы.

Дарэчы, пра гэта распавядае на старонках "ЛіМа" (№ 4, 1946 г.) і былы рэдактар газеты "Сцяг Савецкі" падпалкоўнік В. Фарбераў.

"Бывала зойдзеш апоўначы да яго ў зямлянку. Усе спяць. Адзін Аркадзь ляжыць задуменна на тапчане. Раптам ён пераварочваецца са спіны на жывот, бярэ сшытак і хутка запісвае некалькі строф, затым зноў кладзецца дагары і абдумвае наступную страфу..."

Пра арыгінальнасць, самабытнасць, сапраўдны народны талент Аркадзя Куляшова расказалі паэт Алесь Пісьмянкоў і празаік Леанід Левановіч выступоўцы з Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя А. Куляшова.

Цікавымі ўспамінамі падчас вечарыны падзяліўся і Леў Мінавіч Белянінаў, які ў свой час працаваў дырэктарам Саматэвіцкай сярэдняй школы. Падчас адной з сустрэч Леў Мінавіч запытаўся ў Куляшова, чаму ён прыязджае ў Саматэвічы!

— Разумееш, — адказаў паэт, — тут жа мае карані, вось гэта прырода, краявіды... Калі вырас у такім асяроддзі, куды б ні закінуў лёс, пачынаеш сумаваць па родных мясцінах.

Ён сапраўды любіў прыроду, плынь задуменнай Бесядзі, родны Касцюковіцкі край. Зялёныя дубравы і ельнікі, высокае неба і спеў жаваранка заўсёды жылі і будуць жыць у яго паэзіі.

Алесь ПАТАПЕНКА

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

З новага года максімальна скарочана паступленне "ЛіМа" ў розніцу. Адзіная магчымасць застацца нашымі чытачамі — падпісацца на газету!

Кошт індывідуальнай падпіскі:
(Індэкс — 63856)
на 1 месяц — 2600 рублёў;
на 3 месяцы — 7800 рублёў.

Кошт ведамаснай падпіскі:
(Індэкс — 63857)
на 1 месяц — 4100 рублёў;
на 3 месяцы — 12300 рублёў.

Пэўна, не трэба тлумачыць, што галоўнымі часткамі агульнага паняцця "культура" (так як і слова "культура" пры перакладзе) з'яўляюцца: развіццё, адукацыя, выхаванне, вырошчванне і шанаванне. Больш таго, гэтыя пяць складнікаў выступаюць каталізатарам, які пастаянна стымулюе людзей да пошуку адказаў на шматлікія пытанні самаідэнтыфікацыі і месца чалавека ў гэтым свеце... Пра гэта разам з журналістамі "ЛіМа" сёння разважае міністр культуры Беларусі Леанід ГУЛЯКА.

ЛЕАНІД ГУЛЯКА: КУЛЬТУРА — ШЛЯХ ДА ГАРМАНІЗАЦЫІ ГРАМАДСТВА І ЧАЛАВЕКА

РАЗВІЦЦЁ:

— Леанід Паўлавіч, чалавецтва пераступіла парог чацвёртага года новага тысячагоддзя. Але мне здаецца, мы яшчэ не жывём будучым, а займаемся тым, што падсумоўваем вынікі мінулых трагедый і подзвігаў. Таму, напэўна, многіх хвалюе пытанне: якімі мы прыйшлі ў гэтае тысячагоддзе? Ці можаце вы, адказваючы на гэта пытанне, даць агульную характарыстыку нашых суайчыннікаў і нашай краіны з пункту гледжання міністра культуры Рэспублікі Беларусь?

— Так, мы пераступілі парог новага тысячагоддзя. Але давайце прыгадаем, хто вызначыў гэтыя "часавыя парогі" — тысячагоддзі, стагоддзі, дзесяцігоддзі... Гэта зрабілі самі людзі, і гэты суб'ектыўны падзел часу і выклікае ў нас суб'ектыўныя спадзяванні, што за новым "парогам" нас чакае нешта незвычайнае. На справе ж мы ўсе проста рухаемся ў часе, і ў кожны момант мы такія, якімі зрабіў нас час. А з гэтым звязана і тое, што мы перажываем мінулае і разважаем пра будучыню. Такая разважлівасць — неад'емная рыса чалавека, сутнасная яго асаблівасць. Калі ж гаварыць пра нейкую агульную характарыстыку, як вы кажаце, нашых суайчыннікаў і нашай краіны, то сёння, на маю думку, час, гісторыя, лёс, даюць нам унікальную магчымасць калектыўна адшукаць, выпрацаваць, вызначыць, нарэшце, ва ўмовах суверэннага існавання нашу нацыянальную ідэю, беларускую пуцяводную зорку, святло, якое і будзе ў рэшце рэшт вызначаць наша заўтра. І ў гэтым пошуку не апошнюю ролю адыгрывае менавіта культура. Менавіта тут я бачу самую істотную рысу нашага ўступлення ў новае тысячагоддзе.

— Тэракты ў Амерыцы, у еўрапейскіх краінах, вайна ў Іраку адкрылі новую эру гвалту. Як жыць Беларусі паміж дабром і злом, як ісці па шляху росквіту і дабрабыту, улічваючы на гэтым шляху тое, што "толькі прыгажосць (а значыць і мастацтва, культура) выратуе свет"?

— Вядомы афарызм "прыгажосць уратуе свет" я б вытлумачыў як "гармонія выратуе свет". Гарманічнае для чалавека і ёсць прыгожае. Таму давайце ўсе разам будаваць беларускае гарманічнае грамадства, гарманічнае ва ўсім — у працы, у адданасці сваёй краіне, у адносінах да іншых народаў, у палітычных, маральных, міжасабовых зносінах і г. д. І ў нас ёсць для гэтага падставы і магчымасці. Беларусы маюць велізарны культурны патэнцыял, яго трэба выкарыстоўваць і ўзмацняць. Культура па прыродзе сваёй і ёсць шлях да гарманізацыі чалавечых узаемадачыненняў. Пры гэтым я маю на ўвазе культуру ў шырокім сэнсе. У гэтай высакароднай і лёсавызначальнай працы ёсць месца кожнай асобе.

— Леанід Паўлавіч, што вы лічыце самым галоўным у культуры новага тысячагоддзя і... гэтага года?

— Самае галоўнае ў культуры новага тысячагоддзя я бачу ў тым, каб настойліва і паслядоўна рабіць "культурную работу", вызначаную асаблівасцямі нашага часу. І ў сказаным няма таўталогіі, бо жыццё чалавека і чалавецтва - ёсць не што іншае, як назапашванне культурнага набытку і вопыту. Што ж тычыцца задач 2004 года, то канкрэтна я магу весці гаворку толькі ад імя Міністэрства культуры. Пазнаёмцеся з нашым гадавым планам і вы ўбачыце, што задачы года і канкрэтныя, і цікавыя, і прыярытэтныя для краіны.

АДУКАЦЫЯ:

— Леанід Паўлавіч, адзін з накірункаў вашага міністэрства — асветніцкі. У чым ён выяўляецца?

— На мой погляд, асветніцкі напрамак дзейнасці Міністэрства культуры не існуе адасоблена ад іншых накірункаў і формаў работы ўсёй галіны культуры. Калі ўзяць любую адзінку інфраструктуры сістэмы міністэрства, — ад сталічнага тэатра, нацыянальнага музея і да сельскага клуба, то асноўны сэнсавы стрыжань іх існавання — данясенне разнастайных вынікаў творчай дзейнасці майстроў мастацтваў да самага шырокага кола грамадскасці, з аднаго боку, а з другога — далучэнне гэтых самых шырокіх колаў грамадскасці да ўключэння ў непасрэдны працэс мастацкай творчасці, прадастаўленне магчымасцяў для творчай самарэалізацыі асобы. Акрамя таго, выданне літаратуры па розных відах мастацтва краіны, правядзенне вялікай колькасці такіх мерапрыемстваў, як фестывалі, агляды, конкурсы, творчыя турніры, канцэрты, выстаўкі — усё гэта таксама праяўленне і сведчанне менавіта асветніцкай працы нашага міністэрства.

— За якімі бакамі агульнага жыцця вы найбольш плённа сочыце, чаму аддаяце перавагу: літаратуры, драматургіі, выяўленчаму мастацтву, музыцы, кіно і г. д.?

— Як міністр культуры, я не магу сабе дазволіць сачыць за нечым больш плённа, а за нечым — менш, тым больш аддаваць перавагу літаратуры, драматургіі, музыцы, выяўленчаму мастацтву і г. д. Усе гэтыя віды мастатваў — мой аднолькавы клопат, бо дасягненні кожнага з такіх відаў — уклад у скарбонку нашай краіны, а праблемы любога з іх — люстэрка праблем нашага грамадства.

— Мінск заўсёды з'яўляецца цэнтрам канцэнтрацыі культуры. У сталіцы часта праходзяць Дні культуры расійскіх рэгіёнаў. І тут узнікае пытанне: ці ведаюць мінчане аб традыцыях, быце, мастацтве беларускіх абласцей? Дарэчы, ці праводзяць Дні культуры рэспублікі ў абласцях?

— Па-першае, не толькі ў Мінску праходзяць Дні культуры расійскіх рэгіёнаў. Але і беларуская культура з годнасцю прадстаўляе сябе ў расійскіх рэгіёнах. За апошнія гады праводзіліся Дні культуры Беларусі ў Краснадарскім краі, Кемераўскай вобласці, Кузбасе, Яраслаўлі, Рэспубліцы Карэлія, Санкт-Пецярбургу, Маскве і многіх іншых гарадах і абласцях Расійскай Федэрацыі. Трэба адзначыць, што выступленні беларускіх прафесійных і аматарскіх калектываў мастацкай творчасці ў рамках гэтых Дзён культуры заўсёды суправаджаюцца аншлагам і самым станоўчым прыёмам з боку расійскай публікі, якая кожны раз бывае ўражана багаццем, адметнасцю і разнастайнасцю праяў беларускай культуры. Што да ведання мінчанамі аб традыцыях, побыце, мастацтве беларускіх рэгіёнаў, то шырокімі, нават можна сказаць, масавымі магчымасцямі для атрымання такіх ведаў мог не скарыстацца толькі самы лянівы. Дастаткова сказаць, што на працягу мінулага года ў сталіцы адбыліся Дні культуры ўсіх абласцей, дзе былі прадстаўлены канкрэтныя выступленні майстроў мастацтва, выстаўкі прафесійных і самадзейных мастакоў, выстаўкі-кірмашы народных рамёстваў, традыцыйная кухня ды многае іншае. Я ўжо не кажу пра магчымасці набыцця ведаў аб культуры рэгіёнаў праз разнастайную даведачную, энцыклапедычную, навукова-папулярную літаратуру. Пасля правядзення прэзентацыі рэгіянальных культур у сталіцы ўзнікла ідэя прадстаўлення творчых "справаздач" сталіцы перад беларускімі рэгіёнамі. У 2003 годзе адбыліся Дні культуры Мінска на Гомельшчыне і Брэстчыне, а ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, была праведзена XVII Міжнародная дабрачынная акцыя "Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця", у якой прынялі ўдзел такія знакамітыя творчыя калектывы, як "Песняры", "Свята", тэатр казкі "Фантазія" і іншыя.

ВЫХАВАННЕ:

— Леанід Паўлавіч, ці не здаецца вам, што мастацтва становіцца павярхоўным, як бы прымяраецца да густу большасці. Чалавек перастае над сабой працаваць, перастае цягнуцца за ўзвышаным...

— Характар сучаснага мастацтва сапраўды выклікае занепакоенасць, бо ў ім заўважна знізілася, як бы адышла на задні план такая яго складаная рыса, як "ідэйна-выхаваўчая роля". Але адміністрацыйныя захады тут не самыя лепшыя. Роля мастацтва цесна звязана з характарам шматлікіх грамадскіх працэсаў. Многае тут дыктуе рынак, рынкавыя адносіны. Цяга чалавека да ўзвышанага шмат у чым мае стыхійную падаснову. Яна не можа знікнуць, але можа скажацца або паслабляцца. Патрэбен час для змянення мастацкіх густаў большасці. Але патрэбны і арганізацыйныя намаганні, каб уплываць на такія працэсы. Ваша пытанне ставіць праблему быцця чалавечага духу, а такія праблемы ў адзін момант і адміністрацыйнымі сродкамі не вырашаюцца.

— Вось вам сведчанне ліберальнасці грамадства: сёння ўсім ёсць месца ў культуры. А гэта прыводзіць да таго, што сапраўдныя таленты пачынаюць самаўхіляцца, пісаць і ствараць больш дзеля сябе. Калі вы згодны, дык як пазбегнуць вялізнай масы шэрасці, якая так ці іначай трапляе ў культурнае жыццё краіны?

— Фактычна на гэта пытанне я толькі што адказаў — зразумела, у агульнай форме. Шэрасць многіх мастацкіх твораў — не смецце, якое можна вымесці з эстэтычнай хаты. Гэта спляценне найскладанейшых пытанняў таленту, адказнасці мастака, адукацыі, узроўню эстэтычнага развіцця і многіх іншых састаўляючых. Кожны від мастацтва ў пэўны гістарычны момант свайго развіцця — гэта піраміда, на вяршыні

якой знаходзяцца геніі і таленты, а ніжэй — мноства тых, хто да першых не адносіцца, але актыўна працуе, кіруючыся самымі рознымі матывамі творчасці. Палохацца гэтага не трэба, але аналізаваць і шукаць адпаведныя шляхі і сродкі ўплыву на ход мастацкіх працэсаў, безумоўна, неабходна. У значнай ступені мы гэта і робім.

— На наш погляд, у Беларусі амаль няма сучаснай сацыяльнай драматургіі і сучаснай сацыяльнай прозы. А гэта сведчыць не аб крызісе ў творчай сферы, а аб абсалютнай інфантыльнасці.

— Я не стаў бы адназначна сцвярджаць, што ў сучаснай беларускай літаратуры адсутнічаюць сацыяльныя матывы. Вельмі верагодна, што ў нас проста не хапае аналітычнай крытыкі, якая адсочвала б і публічна канстатавала тэндэнцыі развіцця драматургіі, прозы і іншых літаратурных жанраў. Што тычыцца "абсалютнай інфантыльнасці" аўтараў, то да іх ліку ніяк нельга аднесці старэйшае і сярэдняе пакаленне, прадстаўленае імёнамі Аляксея Дударава, Алеся Жука, Анатоля Жука, Алены Васілевіч, Івана Пташнікава і многіх іншых пісьменнікаў Беларусі. У творах маладзейшых, згодзен, могуць заўважацца праявы інфантылізму, аднак "хвароба", мабыць, даравальная, бо рана ці позна праходзіць па меры чалавечага і грамадзянскага сталення творцаў.

ВЫРОШЧВАННЕ:

— Леанід Паўлавіч, як вы лічыце, дзе кропка зліцця культуры і ідэалогіі?

— Пункт яднання культуры і ідэалогіі ў светапоглядзе чалавека, і менавіта светапогляд асобы я б раіў мець на ўвазе, калі мы сёння спрабуем адшукаць нацыянальную ідэю. Светапогляд — гэта ўменне адказваць на тры абагульненыя пытанні: што такое навакольны свет, што такое грамадства, што такое я ў свеце і грамадстве. Гэта задачы для кожнага на ўсё свядомае жыццё.

— Ідэі славянства, такія папулярныя ў грамадстве, на якой стадыі развіцця яны знаходзяцца?

— Коратка і адназначна на такое пытанне адказаць нельга, бо за ім стаіць мноства праблем гісторыі, эканомікі, этнаграфіі, філасофіі, мовазнаўства, культуралогіі і г. д., на якія розныя людзі і адказваюць па-рознаму. Апошні з'езд славістаў, што адбыўся ў 2003 годзе ў Любляне, паказаў, што праблематыка гэта знаходзіцца зусім не на апошнім месцы ў свеце па значнасці і прыярытэтнасці.

— Вядомы рускі гісторык Васілій Ключэўскі аднойчы назваў інтэлігента дыягностам. "Нават не лекарам народа, — разважыў ён. — Народ сам заліжа і залечыць сваю рану, калі яе адчуе. Толькі ён не ўмее своечасова заўважыць яе. Своечасова заўважыць і зазначыць яе — справа інтэлігенцыі". Вы, як ніхто іншы, павінны ведаць: як і чым жыве інтэлігенцыя, ці кажа яна аб "ранах" сваёй краіны. Калі так, дык якія сімптомы адзначаюць людзі творчых прафесій?

— Васілій Ключэўскі справядліва падкрэсліў адну з функцый інтэлігенцыі — быць "дыягностам" народа, грамадства. Але на маю думку, беларуская інтэлігенцыя — паняцце зараз уяўна-колькаснае. Яе функцыі малавыразныя. Разам з тым, неаспрэчна, у нашым грамадстве ёсць асобныя інтэлігенты найвышэйшай якасці, гарту, духоўнасці. Відаць, гэта агульны працэс у свеце — паступовае знікненне інтэлігенцыі як сукупнай сацыяльнай сілы. Невыпадкова паняцце "інтэлігенцыі" ўзнікла ў асобнай краіне і ў пэўную гістарычную эпоху.

ШАНАВАННЕ:

— Вось кажуць: "Спачатку было Слова" і забываюць дадаць: "І Слова было Бог". Леанід Паўлавіч, ці верыце вы ў Бога? Або ў нейкія чалавечыя каштоўнасці, якія вышэй за ўсё?

— Пытанне рубам: ці верыце ў Бога? ...Як вядома, рэлігія — гэта аднаўленне сувязі паміж душой, духоўным вопытам асобнага чалавека і тым, што раптам называюць "сусветным духам". І ў такім сэнсе ўсе людзі рэлігійныя, або, кажучы бытавой мовай, вераць у Бога. Але акрамя таго, ёсць людзі, цесна звязаныя з царквой (па-руску "воцерковленные"). Гэта розныя рэчы. Зразумела, і я спадзяюся на перамогу тых духоўных з'яў, што стаяць за словамі "чалавечнасць", "маральнасць", "пазнанне неспазнанага".

— Леанід Паўлавіч,ці верыце вы ў слова, у тое, што яно можа ўпарадкаваць хаос жыцця?

— Магутнасць слова — рэч агульнавядомая. Але выяўляецца яна толькі ў адзінстве слова і справы. Пра гэта варта памятаць заўсёды.

Вольга КУРТАНІЧ,
Марына ЦЯРЭШЧАНКА

Зварот

Мінскай пісьменніцкай арганізацыі да ўсіх абласных пісьменніцкіх арганізацый, да ўсіх пісьменнікаў

Чарговы раз пытанне аб Доме творчасці "Іслач" выносіцца на абмеркаванне, і пры гэтым кожны раз канстатуецца, што Дом творчасці знаходзіцца ў стане заняпаду. Называюцца прычыны: адсутнасць фінансавых сродкаў у СБП і "Беллітфондзе" на яго ўтрыманне. Пры гэтым, як з боку кіраўніцтва творчага Саюза і "Беллітфонду", так і ад асобных пісьменнікаў паступаюць самыя розныя прапановы па далейшым лёсе Дома творчасці "Іслач". Сярод іх і такая: перадаць яго пад апеку аднога маскоўскага літфонду, які, займеўшы правы саўласніка, закансервуе будынкі, з мэтай рэканструкцыі ў "лепшыя" часы і г.д. (Нагадаем, што ў Маскве амаль уся былая маёмасць Саюза пісьменнікаў СССР, а гэта не толькі маёнткі-офісы, паліклініка і Перадзелкіна, але і дамы творчасці ў Ялце, Піцундзе, Кактэбелі, Дубалтах даўно прададзены і прыватызаваны).

Ёсць, на наш погляд, годнае для ўсёй нашай пісьменніцкай суполкі рашэнне. Рашэнне, якое дазволіць і ўратаваць "Іслач" ад поўнага разбурэння, і дасць магчымасць пісьменнікам карыстацца плошчамі Дома творчасці для адпачынку і працы.

Паколькі Саюз беларускіх пісьменнікаў і "Беллітфонд" не маюць сродкаў, каб утрымліваць Дом творчасці ў належным стане Мінская пісьменніцкая арганізацыя прапануе перадаць Дом творчасці пад апеку дзяржавы з тым, каб пасля неабходнага рамонту выкарыстоўваць яго для аздараўлення дзяцей, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У дагаворы перадачы прадугледзець, што пэўная частка (якая – узгадніць пры афармленні дакументаў) Дома творчасці, застаецца для карыстання пісьменнікам і яны ў адпаведнасці з гэтым рашэннем самастойна размяркоўваюць пуцёўкі.

Просім усіх пісьменнікаў падтрымаць нашу прапанову.

Старшыня Выканкама
Мінскай пісьменніцкай арганізацыі:
Павел Вераб'ёў

Члены Выканкама:
Таіса Бондар
Мікола Мятліцкі
Віктар Праўдзін
Міхась Пазнякоў
Уладзімір Саламаха
Раіса Баравікова
Уладзімір Гніламёдаў

ПАДЗЕІ

ФОРУМ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

17 лютага ў павільёне Нацыянальнага выставачнага цэнтра "БЕЛЭКСПА" (вул. Янкі Купалы, 27) адкрылася XI Міжнародная кніжная выстава-кірмаш "Кнігі Беларусі—2004".

Напачатку намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Лапцёнак даў слова віцэ-прэм'еру РБ Уладзіміру Дражыну, які сказаў пра значэнне выставы-кірмаша, як форума, дзе сабраліся кнігавыдаўцы і кнігараспаўсюджвальнікі Беларусі, Расіі і Украіны, каб прадэманстраваць дасягненні ў выдавецкай і паліграфічнай справе сваіх краін.

Ад імя расійскай дэлегацыі выступіў намеснік міністра па справах друку і СМІ РФ Валерый Сіражэнка. Ён зазначыў, што кірмаш дае магчымасць наладзіць супрацоўніцтва са сталымі і вернымі партнёрамі ў кніжным бізнесе.

Пасля таго, як віцэ-прэм'ер РБ Уладзімір Дражын і міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч урачыста перарэзалі чырвоную стужку — выстаўка-кірмаш распачала сваю работу. Наведвальнікі накіраваліся да стэнда выдавецтва "Мастацкая літаратура", дзе адбылася прэзентацыя кніг Янкі Брыля "З людзьмі самнасам", Уладзіміра Караткевіча "Ладдзя роспачы" і Пятра Васючэнкі "Жылі-былі паны Кубліцкі і Заблоцкі". У гэты дзень свае кнігі прэзентавалі таксама выдавецтвы "Беларусь", "Беларуская навука", "Народная асвета" ды "Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі".

У другой палове дня адбыліся семінар і нарада па пытаннях супрацоўніцтва Асацыяцыі кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў Беларусі з калегамі з Расіі. Былі ўзнагароджаны лепшыя кнігарні нашай рэспублікі па выніках продажу кніг дзяржаўных выдавецтваў.

Выстава-кірмаш "Кнігі Беларусі—2004" доўжылася тры дні. У яе рамках адбыліся прэзентацыі вядучых дзяржаўных і прыватных выдавецтваў Беларусі, Расіі, Украіны, а таксама семінары "Камплектаванне расійскіх бібліятэк літаратурай, выдадзенай у Беларусі", "Інфармацыйныя тэхналогіі і стандарты інфармацыйнага абмену ў кніжнай галіне", арганізаваныя Міністэрствам інфармацыі РБ, Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі, КРУП "Белкніга", "Макбелам" і Расійскай кніжнай палатай.

Увагу наведвальнікаў прыцягнулі і выданні РВУ "Літаратура і Мастацтва": "Мы — беларусы", "Чарнобыльская рана", "Беларусь мая, Песня мая..." ды іншыя.

Сёння ў Гомелі, завяршаючы штогадовы кніжны форум Беларусі, у кнігарні № 3 урачыста адкрыўся аддзел украінскай кнігі.

А. ГАЎРОН

ПАРТЫЗАНСКІ РАЗВЕДЧЫК ФЁДАР ЯНКОЎСКІ

Аднойчы я вяртаўся з Дома творчасці "Іслач" разам з Фёдарам Янкоўскім. У аўтобусе мы сядзелі побач, разгаварыліся. Суразмоўнікам Фёдар Міхайлавіч был адмысловым. Узгадалі і вайну. Ён прызнаўся, што яго некалі ўразіла балючае прысвячэнне майго рамана "Шчыглы": памяці чатырох братоў... Распытаў пра лёс кожнага. Я адказаў, што старэйшы, Фёдар, загінуў на фронце, малых, Толіка і Міколку, даканалі халадэча і галоднае жыццё ў спаленай вёсцы. Міхаіла дагнала вайна ў сталыя гады — адгукнуліся пакуты маленства...

Фёдар Міхайлавіч слухаў, на твары была спагада, у вачах боль і шкадаванне. Мабыць, балюча адгукнулася свая незагойная рана: кніга "Беларуская фразеалогія" прысвечана памяці дарагіх родных Карпа, Савы, Вольгі, Інесы Янкоўскіх, якія загінулі ад рук фашыстаў. Пры якіх абставінах гэта здарылася, папытацца я не адважыўся. Нейкі момант мы маўчалі, потым Фёдар Міхайлавіч загаварыў зноў:

— Раскажу вам адну гісторыю з партызанскага жыцця. Масква папрасіла партызанаў вывезці з акупаванага Мінска бабулю і двух хлопчыкаў. Абяцалі ўзнагароды брыгадзе, цэлы груз на парашуце. Аўтаматы, патроны, тол і бікфордаў шнур, біноклі і ракетніцы. Нават лёгкі кулямёт. У штаб брыгады выклікалі начальнікаў атрадных разведак. Ну, і мяне — таксама. Паставілі задачу... Паслалі адну групу — няўдача. Другую — тое самае. Даручылі мне. Угаварыў я сувязную...

Пазней пра гэтую гісторыю я прачытаў у кнізе Фёдара Янкоўскага "Радасць і боль". Дамо слова аўтару:

"І едзе Юля Трушкевіч, гаспадыня з Углян, за дачушкаю Зінай у Мінск, дзе тады быў страшны кожны крок, кожны паварот і позірк".

Паехала і няма. Ці не мацней за ўсіх перажываў начальнік разведкі: "Свідраваў душу грэх: паслаў матку выручаць чужых дзяцей, ну, а яе? А сама яна і яе Тодар? А сваякі і суседзі?"

І толькі на чацвёртыя суткі разведчыкі ўбачылі падводу, на якой ехала Трушкевічыха, Зіна і двое хлапчукоў: старая бабуля адмовілася ехаць. Згаладалы і схуднелы конь ледзь перастаўляў ногі.

"Першы раз у жыцці пацалаваў я тады руку, — піша Ф. Янкоўскі. — Жаночую. Юліну. Матчыну руку. Было цяжка сказаць ёй і адно слова: паслаў, усё адно як забыўся, што Юлю проста магла напаткаць смерць, магла быць жахлівая смерць Юліных дзетак, гаспадара, сваякоў, суседзяў... жылі ж між двух фашысцкіх гарнізонаў, як у пачварных лапах..."

Пасля вайны аўтар не раз сустракаўся з Юляй Трушкевіч, заўсёды яна пыталася, ці не адгукнуліся тыя хлопцы. Калі чакалі самалёта, навучалі іх, каб помнілі імя цёткі, якая іх выратавала. Але ніхто не адгукнуўся.

"Ці не пачвара яна, вайна? Ненавісная яна, ненавісніца", — заканчвае Ф. Янкоўскі свой аповед.

Моцна сказана! Мацней ужо і не скажаш. А яшчэ хачу адзначыць, што аўтару не давялося нічога выдумляць. Апавяданні Ф. Янкоўскага пацвярджаюць думку Льва Талстога, што ў будучай літаратуры не давядзецца нешта прыдумляць, фантазіраваць, а толькі апісваць сапраўдныя падзеі. Яшчэ раней пра гэта пісаў Шэкспір: "Важна раскрыць глыбіню канкрэтнага факта і нічога не трэба выдумляць". Сваёй творчасцю Фёдар Янкоўскі спраўдзіў прароцтвы двух геніяў.

• • •

А цяпер пра першае знаёмства (завочнае) з Фёдарам Янкоўскім. Было тое ў далёкім 1957-м. У той год я паступіў на завочны факультэт аддзялення журналістыкі БДУ, з Койданава (Дзяржынска), дзе адпрацаваў год пасля Магілёўскага культасветвучылішча, вярнуўся дамоў, на Касцюкоўшчыну, уладкаваўся загадчыкам клуба ў вёсцы Гаўрыленка, што на самай мяжы з Расіяй. І вось аднойчы з чорнай талеркі-рэпрадуктара пачуў, што ў Мінску выйшла кніга "Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі", якія сабраў Фёдар Янкоўскі, што гэтае цікавае выданне можна заказаць "Кніга-поштай". Неадкладна накатаў ліст у Мінск і пачаў чакаць. Напрыканцы снежня, акурат пад Новы год, паштарка ўручыла важкі пакунак. У ім — кніга Ф. Янкоўскага. Радасці маёй не было канца. Мабыць, ніколі пад Новы год я не атрымліваў лепшага падарунка.

Кніжку прыказак і прымавак я перачытаў шмат разоў. Чытаў з алоўкам, упадабаныя прыказкі ці прымаўкі пазначаў "птушкамі". Наўгад разгарнуў кніжку і ўбачыў свае паметкі. Што мяне тады зацікавіла? "Таго на кут, у каго мазалі цвярдзейшыя", "таўкач муку пакажа", "увосень і верабей багаты". Наступная прымаўка падкрэслена алоўкам – гэта ўжо почырк бацькі: "У добрага пільшчыка піла вострая". Не дзіва, што яго зацікавіла гэта прымаўка: давялося бацьку сябраваць не толькі з пілой-папярочкай, якою пілуюць дровы, а і з вялікай, цяжкою "прадольнаю" пілой: напрыканцы вайны ў Бранску ён пілаваў дошкі, нават узначальваў брыгаду пільшчыкаў. І кнігу Янкоўскага ён, відаць, праштудзіраваў добра, пакуль я тры гады служыў на флоце.

"Беларускую фразеалогію" Ф. Янкоўскага я купіў, калі яшчэ не быў знаёмы з аўтарам. А пазнаёміцца з ім хацелася. Неяк і цешча Алена Георгіеўна заінтрыгавала: "Вось ты ў рэдакцыі працуеш. А ці ведаеш Фёдара Янкоўскага?" Я адказаў, што маю ягоныя кніжкі, шмат чуў пра яго, але асабіста не знаёмы.

— Ён партызаніў у нашых мясцінах. І ў нашай хаце не раз быў. Мы ў вайну жылі на хутары. На Канатопцы. А тут, у Клімантах, у Янкоўскага каханка была...

Крынічную рачулку Канатопку, якая падзяляе Маладзечанскі і Вілейскі раёны, я ўжо добра ведаў, не раз і стронгу ў ёй лавіў. Паказалі мне і котлішча былога хутара. Думка, што я хаджу па сцежках, якія некалі выхадзіў партызанскі разведчык Янкоўскі, а цяпер вучоны-мовазнаўца, часта наведвала мяне. Іншым разам з'яўлялася жаданне напісаць пра яго нарыс. Але ці то часу, ці то смеласці бракавала, ці стрымлівала тая акалічнасць, што давядзецца пісаць пра цешчу і цесця, былых партызанскіх сувязных, а як быць з "каханкай" героя нарыса? Карацей, тэлефанаваць Фёдару Янкоўскаму не адважыўся.

У студзені 1969 года я перайшоў з "Сельской газеты" ў газету "Літаратура і мастацтва". Вось у лімаўскім пакоі я і пазнаёміўся з Фёдарам Янкоўскім. І было тое напрыканцы 69-га. У пакой зайшоў невысокі чарнявы, брывасты, акуратна апрануты чалавек, зняў капялюш, спытаўся, ці ёсць у рэдакцыі Павел Місько. Я адказаў, што Павел паехаў на дзяжурства па нумары ў Дом друку.

— Прабачце, а вы тут працуеце? Як ваша прозвішча?

Я запрасіў госця сесці, коратка расказаў пра сябе. Пра кнігу прыказак і прымавак, якую атрымаў па "Кнізе-пошце", пра цесця і цешчу.

— Шараметы? Памятаю. І ў Канатопе, і ў Клімантах ого колькі разоў даводзілася быць! Трэба калі-небудзь нам з'ездзіць. Перадавайце прывітанне.

На тым і развіталіся. Расказаў я сваім пра знаёмства. Цешча дыпламатычна зазначыла:

— Ты не настойвай, каб сюды ехаць. Можа, яму няёмка. Люба тут...

— Ну дык і што? Ён быў малады. Яна яшчэ маладзейшая.

Забягаючы наперад, скажу, што пазней у аповедзе "Людзям трэба з людзьмі жыць" я прачытаў: "І Шарамет устаў перад вачыма... Ідзём разам. Прыселі на прызбе з ім. Гаспадарным, разважным, памяркоўным".

Спрэчку сваякоў я добра запомніў і пры сустрэчах з Фёдарам Міхайлавічам не заводзіў гутарку пра партызанскі цешчын край. Ды і бачыліся мы рэдка. Але жыццё нас звяло бліжэй. У 1975 годзе я пачаў працаваць загадчыкам аддзела навукі і мастацтва часопіса "Полымя". Вёў рубрыку "Культура мовы". Патэлефанаваў Янкоўскаму, папрасіў напісаць што пра культуру мовы. І праз нейкі час ён прынёс выдатны артыкул. Пасля гэтага мы сталі сустракацца даволі часта. Дарыў Фёдар Міхайлавіч свае кнігі, падпісаныя надзіва прыгожым, акуратным настаўніцкім почыркам.

А зараз пра адну нечаканую сустрэчу з Янкоўскім у вёсцы Максімаўка, дзе ён партызаніў. Адбылася сустрэча на пачатку сямідзесятых. Я прыехаў на выхадныя ў Кліманты, суседнюю вёску, пачуў пра адкрыццё помніка Сымону Рак-Міхайлоўскаму, выдатнаму дзеячу нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, аўтару музыкі "Зоркі Венеры". Вядома ж, пайшоў.

Помнік — гэта сказана недакладна. Каля крамы высіліся вялізныя, першародна-прыгожыя валуны. На сярэднім — мемарыяльная дошка. Валуны даставілі ў Максімаўку, родную вёску Сымона Рак-Міхайлоўскага, дзякуючы высілкам тагачаснага сакратара Маладзечанскага райкама партыі Вячаслава Ляшковіча і апантанага гісторыка Генадзя Каханоўскага. З Мінска прыехалі Янка Брыль, Фёдар Янкоўскі і Арсень Ліс. Паклікалі ў гурт гасцей і мяне, але ад прамовы я адмовіўся, бо маіх заслуг у адкрыцці мемарыяльнага знака не было. Нядоўга выступаў і Янкоўскі. Болей гаварыў пра Сымона Рак-Міхайлоўскага, чым пра сябе, пра свае партызанскія ўспаміны, сказаў, што "Зорка Венера", музыку да якой напісаў іхні зямляк, будзе гучаць вечна, як і будзе жыць беларуская мова.

Пасля афіцыйнай часткі мы перакінуліся словам. Фёдар Міхайлавіч пашкадаваў, што мала часу, не ўдасца пахадзіць па вёсцы, сустрэцца з людзьмі, што Максімаўка для яго вельмі дарагая, тут упершыню на свае вочы ён убачыў славутую кнігу "Беларусы" Карскага. Вось як напісаў пра гэта Ф.Янкоўскі ў абразку "У сядле пад паветкаю":

"Партызан першы раз убачыў, узяў у рукі, гартаў акадэміка Карскага на той зямлі, дзе хадзілі ногі, засталіся назаўсёды сляды, чуецца дыханне, біццё сэрцаў Янкі Купалы, Антося Лявіцкага, Браніслава Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, юнага Максіма Танка...

На мілай Радашкаўшчыне.

Пад паветкаю, не саскочыўшы з сядла.

Сяргей Рак паказаў тады і пазычыў — "толькі на тыдзеньчык" — мне з тузін "Маланкі", нумары заходнебеларускага часопіса".

Гэтыя радкі яскрава сведчаць, што на мілай Радашкаўшчыне партызанскі разведчык Фёдар Янкоўскі адчуў сябе беларусам. Ці не тут адзін з вытокаў яго апантанага служэння роднаму слову?

• • •

У кастрычніку 2002-га я прыехаў у вёску Кліманты. Ад Максімаўкі яе аддзяляе адно пыльная жвіроўка. Кліманты шмат разоў узгадваюцца ў апавяданнях Фёдара Янкоўскага. Вось абразок "Сход".

"У жніўні тысяча дзевяцьсот сорак трэцяга года разведчыкі склікалі сход у вёсцы Кліманты на Маладзечаншчыне. Такой кароткай прамовы я ніколі не гаварыў. Вось яе тэзісы і яе асноўны змест:

— Трэба хлеб.

Наступіла кароткае маўчанне. Не якое яно, а маўчанне поўнай згоды. Сабраліся не асобныя падпольшчыкі: ўся вёска-падпольшчыца.

Дапоўніў мяне наш сувязны, потым настаўнік, Валодзя Буркевіч, выхаванец Віленскай беларускай гімназіі:

— Трэба ж, мусіць, каб збажынку найлепшым чынам ачысцілі і высушылі..."

Хлеба клімантоўцы далі. Калі прывозілі ў атрад, то наказвалі, каб хавалі не ў адным месцы.

На гэты раз прыехаў я ў Кліманты, каб знайсці каго з тых, хто памятае партызанскага разведчыка Фёдара Янкоўскага. Найперш завітаў да Зосі Аляксандраўны Баран, даўняй сяброўкі маёй цешчы, таксама заўзятай пчаляркі. Цяпер я ў Клімантах бываю рэдка, бо пайшлі з жыцця мае цесць і цешча, партызанскія сувязныя, стаіць пустая хата, на вуглу якой яшчэ трымаецца выгаралая ад сонца зорка — знак: у гэтай хаце жыве ветэран вайны.

Дык вось, ветэранаў вайны амаль што не засталося. Пачала Зося згадваць: і таго няма, і таго няма...

— Сяброўка Янкоўскага Люба Векіш часта хварэе. Ёй ужо за восемдзесят. Нічога яна не раскажа... Я трохі памятаю. Мне тады было гадоў пятнаццаць. Янкоўскі заходзіў да нас у хату. Бацька мой быў чалавек паважаны, аўтарытэтны. Янкоўскі прасіў, каб я з дзяўчатамі схадзіла ў Радашкавічы. Бальніцы патрэбны дровы. Шукаюць, хто б папілаваў. І вось мы, чацвёра дзяўчат, ішлі ў Радашкавічы, пілавалі дровы. У сталоўцы пры бальніцы поварам рабіў Андрэй Баран. Калі абедалі, ён, быццам між іншым, мог сказаць, што праз дзень ці два немцы будуць ісці на Манылы. Або на цагельню. І пра блакаду паведамляў... — цётка Зося памаўчала, уздыхнула.

• • •

Зноў перачытваю выбранае Ф. Янкоўскага, "Радасць і боль", якое выйшла ў "Мастацкай літаратуры" ў 1995 годзе. О, як бы ўзрадавала кніжка ейнага аўтара! Але гэтага не адбылося. І да маёй чытацкай радасці прымешваюцца смутак і боль. Пражыў Фёдар Янкоўскі семдзесят адзін год і амаль два месяцы. Памёр 13 лістапада 1989 года. Не, не ўсе свае планы і задумы ён здзейсніў. І не толькі творчыя. Мы ж яшчэ збіраліся наведаць мілую і ягонаму і майму сэрцу Радашкаўшчыну...

Фёдар Янкоўскі мог загінуць на фінскай, дзе быў паранены, заледзянець у снезе, як загінулі тысячы. Не раз глядзеў смерці ў вочы падчас вайны з немцамі, перажыў смерць сваіх блізкіх. Аяе не зламаўся, выстаяў, выдаў дзесяткі кніг, меў шчырых сяброў і ўдзячных вучняў. Яго разумела і падтрымлівала сям'я. Яго ведалі і шанавалі ў свеце.

Вясёлы і шчаслівы Фёдар Янкоўскі на здымку, які адкрывае кніжку выбранага "Радасць і боль".

Нізка кланяюся Фёдару Янкоўскаму, мужнаму партызанскаму разведчыку, прыгожаму Чалавеку, адданаму рыцару Слова.

Леанід ЛЕВАНОВІЧ

ДЗІВОСНАЯ ПТУШКА... ТАЛЕНТ

Нядаўна мне пашчасціла трапіць на кінапрэм'еру. Гэта была беларуская стужка, створаная ў аніміалістычным жанры, новым для беларускага экраннага мастацтва. Але ж і ў нашай краіне ёсць творцы з арыгінальным светапоглядам, з самабытным, характэрным для беларусаў бачаннем прыроды: дзякуючы менавіта іх пошукам аніміалістычны жанр быццам бы і нарадзіўся на Беларусі наноў.

Ігар Бышнёў — рэжысёр фільма "Апошнія арлы", які стаўся нагодай для сённяшняй гаворкі. Гэтая, адна з апошніх і, здаецца, найбольш удалых работ І. Бышнёва апавядае пра рэдкіх драпежных птушак і пра навукоўцаў, якія іх вывучаюць. Фільм, створаны па заказе Міністэрства культуры РБ сумесна з вытворчым аб'яднаннем "Беларускі відэацэнтр", атрымаў ужо некалькі ўзнагарод на фестывалях рознага ўзроўню. Бадай, галоўная з узнагарод — Гран-пры чацвёртага Нацыянальнага фестывалю беларускага фільма, які адбыўся ў Брэсце ў лістападзе мінулага года. Важна, што аўтар фільма мае не дылетанцкае дачыненне і да праблем пярнатых сваіх герояў — птушак, і да тых людзей, якія прафесійна імі займаюцца, бо сам даўно належыць да слаўнай кагорты беларускіх арнітолагаў. Найцікавейшая кніга пра птушак, якая траплялася мне, — гэта "Птушкі над Бярэзінай" І. Бышнёва. Ды і кандыдацкую дысертацыю Ігару Іванавічу "дапамаглі" абараніць таксама птушкі, якіх больш за 10 гадоў ён вывучаў у Бярэзінскім біясферным запаведніку і вывучае дагэтуль...

Фільм "Апошнія арлы" — далёка не адзіны ў багатай відэакалекцыі яго шаноўнага стваральніка. Ён зняў цэлы шэраг аніміалістычных стужак, якія неаднаразова дэманстраваліся на міжнародных фестывалях і форумах, дзе ніколі не заставаліся незаўважанымі і абавязкова адзначаліся журы. А тэлегледачы, напэўна, памятаюць шматлікія экавідэаролікі сацыяльнай рэкламы, якія час ад часу з'яўляюцца на "хатнім "экране". Гэта таксама работа І. Бышнёва. Да таго ж, ён — цудоўны мастак і фатограф, які традыцыйную працу ў названых галінах паспяхова разнастаіць, сумяшчаючы, напрыклад, малюнак і пейзажную фатаграфію (іх камбінацыю называе экафантомам).

Але ў які жанр ні скіроўваў бы свой шматгранны талент І. Бышнёў, усе яго работы атрымліваюцца надзвычай запамінальнымі сваім асаблівым лірыка-драматычным настроем. Іх аўтар быццам заклікае: "Глядзіце, людзі, якая крохкая прыгажосць прыроды! Не трэба чапаць яе бруднымі рукамі і бруднымі думкамі!.."

Шаноўныя чытачы, калі імя Ігара Бышнёва сталася для вас адкрыццём толькі сёння, дык паверце, што вы з ім яшчэ сустрэнецеся. Не выключайце тэлевізар, калі аднойчы натрапіце на яркія і прыгожыя фільмы накшталт "Жывой вады" ці "Лясных хованак", а, наадварот, пасадзіце перад ім вашых дзяцей — ім будзе цікава і карысна (15-20 хвілін перад экранам не павінны асабліва нашкодзіць дзіцячаму здароўю). Затрымайцеся і ў кнігарні, каб пагартаць кніжкі І. Бышнёва: выдатныя каляровыя альбомы "Спеў глушца" і "Скарбы прыроды Беларусі". А хутка з'явяцца і новыя альбомы, кніжкі, фільмы...

Пажадаем іх аўтару ўдалых творчых пошукаў і светлага натхнення.

Святлана ПРАКОФ'ЕВА

НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма "Апошнія арлы".

ЗАХАРАВА, 19

РЭДАКЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЯ ЎСТАНОВА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

прымае да разгляду:

выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;

выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг (ад рэдагавання рукапісу да выдання і распаўсюджвання кніжнай прадукцыі);

арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19, тэл.: 284-85-25.

Выдавецкая ліцэнзія — ЛВ № 570 ад 23 кастрычніка 2002 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"; e-mail: minsk@lim.by

НОРАВЫ

ЗА ДОЎГІМ РУБЛЁМ У КАРОТКАЙ СПАДНІЧЦЫ

У Мінску прайшоў грамадскі форум па прадухіленні гандлявання жанчынамі ў Еўропе. На ім было канстатавана, што Беларусь уваходзіць у дзесятку краін, прадстаўніцы якіх трапляюць у рабства за мяжу, што гандаль жанчынамі з'яўляецца сучаснай формай гандлявання рабамі, што існаванне вярбоўкі і прыгнятанне жанчын для сексуальнай эксплуатацыі пагражае статусу жанчыны ва ўсім свеце.

Статыстыка — рэч няўмольная. Дзесяцігоддзямі Азія была галоўным пастаўшчыком жанчын для сексіндустрыі багатых дзяржаў (найбольш распаўсюджаныя — Турцыя, Грэцыя, Кіпр, Італія, Германія, Галандыя, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты) і толькі распад Савецкага Саюза вывеў некаторыя краіны СНД, у прыватнасці, Расію, Украіну, Беларусь на першыя месцы па пастаўках жанчын для прастытуцыі.

Па неафіцыйных дадзеных аб'ём гандлявання жанчынамі ў свеце, як таварам для сексіндустрыі, вызначаецца ад сямі да дванаццаці мільярдаў долараў у год. Калі ж задацца мэтай, каб падлічыць, колькі жанчын было прададзена для сексуальнай эксплуатацыі, то гэта не ўдасца нікому. Гандаль з'яўляецца тайнай, жанчыны, у большасці, маўчаць, гандляры небяспечныя.

Вядома, што гандлярам і сутэнёрам такі бізнес прыносіць больш высокія прыбыткі, чым, напрыклад, гандаль наркотыкамі і зброяй. Рызыка — мінімальная. Міграцыйныя працэсы дазваляюць ім устанаўліваць сувязі з дабравольнымі пасобнікамі ў дыяспарах усяго свету і працаваць унутры міграцыйнага насельніцтва, тым самым выбудоўваць транснацыянальныя злачынныя сеткі, якія выявіць вельмі цяжка. Выкарыстоўваючы камп'ютэрныя тэхналогіі і складанасці ў міжнародных фінансавых разліках яны свабодна пераводзяць і ўкладваюць грошы, атрыманыя ад кожнай незаконнай здзелкі, у тым ліку і ад гандлю жанчынамі.

Тым не менш, аперацыя, якая праводзілася Гродзенскім упраўленнем Камітэта па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю Беларусі і Федэральнай крымінальнай паліцыяй Германіі ноччу чацвёртага сакавіка 2001 года ў Аўстрыі і Германіі, у рамках сумеснага расследавання справы па падазрэнні ў гандлі жанчынамі і затрыманні членаў злачыннай міжнароднай групоўкі, дазволіла выявіць 16 арганізатараў гандлявання людзьмі і 42 жанчын, якія займаліся прастытуцыяй.

Транснацыянальны гандаль беларускамі распачаўся падчас перабудовы, калі былі ліквідаваны абмежаванні на міжнародныя падарожжы. Развал Савецкага Саюза адкрыў межы не толькі для падарожжаў, міграцыі, прыватнага гандлю, што, вядома, вельмі садзейнічала дзейнасці злачынных арганізацый, якія займаліся ценявой эканомікай, але і запоўніў жанчынамі з новых незалежных краін секс-індустрыю заходнееўрапейскіх краін, у прыватнасці, бардэлі, масажныя салоны, бары, рэстараны.

Якія ж метады выкарыстоўвалі і выкарыстоўваюць зараз гандляры, каб заманіць жанчыну ў свае сеткі. Рабілася гэта, ды і зараз працягваецца, старымі метадамі: праз абвестку ў газеце, маўляў, прапануем добрыя заробкі маладым, прывабным жанчынам для работ, якія не патрабуюць высокай кваліфікацыі, праз фотаконкурсы, праз арганізацыю шлюбных агенцтваў.

Дарэчы, апошні метад, які яшчэ называецца як "нявеста па пошце", найбольш бяспечны для арганізаваных злачынных груп, паколькі большая частка агенцтваў працуе праз Інтэрнет.

Гандлярамі практыкуецца яшчэ адзін метад — турыстычны. Па прыездзе ў краіну, прызначаную для падарожжа, у жанчыны адбіраецца пашпарт, каб была паслухмянай, бо нелегальнае становішча прадугледжвае арышт паліцыяй і дэпартацыю.

Абяцаныя заробкі, ад дзвюх і больш тысяч долараў у месяц, жанчыны не атрымліваюць. Большую частку даходаў заўсёды забірае гандляр і вярбоўшчык-сутэнёр.

Вывезеныя жанчыны не атрымліваюць дапамогі ад грамадскіх і сацыяльных службаў, няма і службаў, якія б займаліся ахвярамі гандлю.

Словам, гандаль жанчынамі для сексуальнай эксплуатацыі — праблема народаў усяго свету. У Канвенцыі Генеральнай Асамблеі Аб'яднаных нацый "Аб спыненні гандлю людзьмі і эксплуатацыі прастытуцыі" гаворыцца, што "прастытуцыя і звязаныя з ёй злачынствы па гандлі людзьмі, з'яўляюцца несумяшчальнымі з годнасцю і каштоўнасцю чалавека, сям'і і грамадства".

Янка ЗАЛУЖНЫ
Фота А. ПАТАПЕНКІ

Кнігі "Мы — беларусы", "Беларусь мая, Песня мая...", "Чарнобыльская рана" і "Чырвоную кнігу для дзяцей" можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу: 284-66-71; 284-84-62.

З ЧАГО ПАЧНЁМ?

У ПОЛІ ЗРОКУ НАТАЛЛІ ДЗЯНІСАВАЙ

Вядомы амерыканскі пісьменнік Курт Ванегут называў навуковую фантастыку "коміксамі без карцінак". На маю думку, некаторыя творы моднай на сучасным этапе беларускай прозы гэтага накірунку ўсёй сваёй сутнасцю сцвярджаюць тое самае.Ды і ў рэшце рэшт, падобнае вызначэнне можна аднесці да твора любога жанру.

"Некалі ў Амерыцы сябры Згуртавання амерыканскіх фантастаў дзеля забавы склалі спіс урада Злучаных Штатаў, надаўшы пасады калегам па пяру ... Згуляйма нашымі, так бы мовіць, фігурамі: Адам Глобус — галоўны банкір, Андрэй Федарэнка — міністр асветы..." — гэтак распачаў адзін са сваіх крытычных артыкулаў Даніла Жукоўскі .

Безумоўна, кожны можа працягнуць спіс у адпаведнасці са сваім густам і літаратурнымі прыхільнасцямі. І цалкам верагодна, што нехта надасць пэўную пасаду, напрыклад, Сержу Мінскевічу, які, дарэчы, даўно і трывала замацаваў за сабой статус пісьменніка-фантаста.

№1 часопіса "Маладосць" змяшчае раман — фэнтэзі С.Мінскевіча "Сад замкнёных гор". Чытаючы гэты твор, я разважала над тым, што прымушае ці падштурхоўвае аўтара звяртацца да фантастыкі, і як узнікаюць ва ўяўленні разнастайныя нерэальныя (ва ўсякім выпадку, на першы погляд) вобразы і сюжэтныя калізіі.

Думаю, не памылюся і не адкрыю нічога новага, калі скажу, што творы такога кшталту нараджаюцца ад творчага спалучэння навукі і мастацтва, верагоднага і неверагоднага, веры і сумнення. Падобная літаратура ў першую чаргу мае справу не столькі з чалавекам, колькі з чалавецтвам у цэлым, бо ёй уласціва касмізацыя масавай свядомасці. Пад касмізацыяй, як мастацкім метадам, трэба разумець паказ чалавека ў першую чаргу ў яго адносінах да Сусвету, пасля — да гісторыі, а затым ужо ў "міжчалавечых" стасунках. Гэта ўсё адбываецца, калі мы маем справу з прафесійна створанай фантастыкай.

С.Мінскевіч, канечне, не дылетант. Яго раман мае стройную сюжэтную лінію, якая, што асабліва падкупае, асноўваецца на тэме кахання. У захапляльна-прыгодніцкім творы побач з рознымі брыдкімі напаўфантастычнымі істотамі дзейнічаюць прыгожыя людзі (асабліва жанчыны, за што Сержу вялікае жаночае дзякуй!). Аднак, хацелася б большай сусветна маштабнай глыбіні і гістарызму — каб сапраўды адбылася касмізацыя.

Другі фантастычны твор студзеньскай "Маладосці" — апавяданне Андрэя Паўлухіна "Нікелевы плывец". Тут касмізацыі і блізка няма. Затое ёсць суквецце стылёвых хібаў, з дапамогай якіх ствараюцца тыя самыя "коміксы".Вось для прыкладу адзін з іх: *"Яны ўжо вярнуліся ў пакой. Калян крануў сенсар на сцяне. Адсунуўся квадратны сегмент, агаляючы нішу. Певень, высалапіўшы язык, перабіраў лапамі па шэрым трэку бегавога трэнажора"*.

Пры чытанні апавядання ўзнікае ілюзія неверагоднай лёгкасці напісання фантастыкі. Рэцэпт просты: лыжка вобразнасці на вядро розных тэхнічна — тэрміналагічных "наваротаў". Усё перамяшаць, дабавіць трошкі гібрыдных персанажаў і выпякаць не больш за дзесяць хвілін.

Перафразіраваўшы вядомую прыказку, можна сказаць: не ўсё тое фэнтэзі, што напісана прозай. Зараз мода не толькі на фантастыку, але і на мемуарыстыку. Між іншым, мне заўсёды здавалася, што

Кажуць, што, як сустрэнеш новы год, так яго і правядзеш. Праўда гэта ці не — жыццё пакажа, але заўсёды хочацца верыць у лепшае і пачынаць з лепшага...

Літаратура — дама капрызлівая і сваявольная, таму невядома, чаго ад яе чакаць у гэтым годзе. Аднак, першае спатканне ўжо адбылося ...

людзі, якія пішуць свае ўспаміны, — перакананыя аптымісты, бо ўпэўнены, што ў мінулым яшчэ можна нешта выправіць...

У "Полымі" жыццялюб Навум Цыпіс у "Накідзе літаратурнай біяграфіі", аналізуючы пэўныя этапы пройдзенага жыццёвага шляху, дзеліцца з чытачамі жыццесцвярджальным і мудрым выказваннем сваёй бабулі:"Нават да самога жыцця нельга ставіцца занадта сур'ёзна. Сур'ёзна трэба ставіцца толькі да смерці".

У "Маладосці" "галоўны банкір" Адам Глобус месцамі грубавата, месцамі шчымліва-лірычна, але бадзёра, з палкасцю і натхненнем прамаўляе "Словы пра жонку Алену".

Віктар Шніп абнародвае ці не залішне падрабязныя дзённікавыя запісы "Распрэжаны "Пегас" канца васьмідзесятых", пры знаёмстве з якімі становіцца зразумела, што меў рацыю англійскі пісьменнік Філіп Гедала, які сказаў: "Аўтабіяграфія — рэдкасная магчымасць расказаць усю праўду пра нашых знаёмых".

"Міністр асветы" Андрэй Федарэнка выступае з кароткім эсэ-успамінам "Сечка" пра тое-сёе са сваіх сустрэч з некаторымі літаратарамі і літаратурнымі творамі. Беларускі празаік таксама бачыць карысць у такім відзе творчасці: *"А што — выгодная справа. Час не марнуецца. Ілюзія далучанасці да творчага працэсу. Вольнае, жанравымі ўмоўнасцямі не скутае пісьмо. Невычэрпнасць матэрыялу — аб чым думаю, тое й пішу. Эканомія нерваў. Адны плюсы!"*

Мушу адзначыць, што так званую міністэрскую пасаду А.Федарэнка, мяркуючы па публікацыях у першых нумарах "Маладосці" і "Полымя", атрымаў заслужана. І эсэ, і раман "Рэвізія", надрукаваны ў "Полымі" № 1, прысвечаны праблемам *"нашага пісьменніцкага племені"*, што аналізуюцца, як кажуць, з веданнем справы, дэталёва і разам з тым займальна.

Адносна нядаўняя гісторыя нашай літаратуры — тутэйшыя, іх набыткі, заслугі і пралікі звярнулі на сябе ўвагу празаіка ў рамане "Рэвізія". У творы сапраўды адбываецца рэвізія самой літаратуры, яе творчага багажу, рэвізія маралі і духоўнасці, нацыянальнай самакаштоўнасці, ментальнасці не толькі таго, але і сучаснага пакалення літаратараў. Заўсёды актуальныя праблемы што і як пісаць, патрабаванні шчырасці і адказнасці пісьменніка ў першую чаргу перад самім сабой фармулююцца і вырашаюцца героямі твора часам па-максімалісцку жорстка і бескампрамісна: *"Так. Менавіта гэта і прапаноўваю. Каб хтось свядома напісаў такі твор, за які як мінімум яму свяціла б турма.А як максімум — расстрэл"*.

Аднак, героі твора, як і іх прататыпы, сваімі ўчынкамі міжволі сцвярджаюць, што змагацца за прынцыпы значна лягчэй, чым жыць па гэтых жа прынцыпах...

Ёсць у рамане і дэтэктыўны паварот сюжэта і "фантастычны элемент", звязаны з другім, паралельным,пражытым стагоддзе назад, жыццём галоўнага героя, у якое ён рэгулярна вяртаецца падчас трызненняў.

Не перарываючы, так бы мовіць, агляду празаічнай плыні часопісаў, скажу колькі слоў пра іншую палымянскую прозу за студзень 2004 года.

Тут маюць месца рэалістычная аповесць Паўла Місько "Анофелес і К"; тэматычна дробнае і сюжэтна неразвітае апавяданне Яўгена Кантылёва "Запозненае знаёмства"; бытавое апавяданне Ніны Рыбік пра традыцыйна цяжкі лёс вясковай жанчыны "Калі барабаніць дождж".

А зараз пяройдзем да прозы сярод мастацтваў — паэзіі (паводле вызначэння Наваліса).

У "Маладосці" на паэтычных старонках — трыялеты і "нетрыялеты" Міхася Пазнякова, як заўсёды стылёва адточаныя лірычныя вершы Таццяны Мушынскай, грамадзянская лірыка Юркі Голуба. Аднак, на тое і "Маладосць", каб прываблівацъ у першую чаргу творамі маладых.

Дэбютант першага нумара — Вадзім Корань.Хлопец мае чуллівую душу, па-філасофску глядзіць на свет, імкнецца да метафарычнай вобразнасці радка:

Наступнай вясною
Сонца ў палон
Возьмем,
Рукі апалім,
Вусны падорым промням —
Гаварыць навучымся
Жэстамі.
Не забіць
Апошняга матылька
Надзеі.

...а ля спрадвечных пірамід
Расстрэльваюць багоў...

Павел Гаспадыніч у паэзіі не пачатковец, што, безумоўна, адчуваецца ў вобразнай сістэме яго твораў, дзе ёсць цікавыя здабыткі, напрыклад, *"спацелыя шчокі дамоў"*, *"Параскіданы лісты// Жоўтага натхнення"*. Але часам ва ўгоду рыфме Павел дапускае недарэчныя параўнанні:

Майго спеву утрапенне
У абдымках сініх сцюж...
Ты пакінула, напэўна,
Каб успомніў, быццам вуж

Не сакрэт, што паэзія ствараецца не толькі з эмоцый і думак, але, як любы літаратурны твор, са слоў. Таму іх трэба падбіраць уважліва, каб не быць патэнцыйным аўтарам "коміксаў без карцінак."

У "Полымі" №1, як бы нагадваючы пра элітарнасць часопіса, змяшчаюцца творы толькі сталых, прафесійных аўтараў: філасофскія вершы Міколы Мятліцкага, іранічныя —Уладзіміра Мазго і сацыяльна-бытавыя — Анатоля Зэкава.

Між іншым заўважу, што ў апошняга ёсць стылёва неахайныя творы з цьмяна выказанай думкай:

З-пад снегу,
з чэрава зямлі,
з тае далёкай даўніны
на поле лезуць валуны.

І то ж не змеціш сам,
калі
яны ўкрыюць поле спрэс
і перакрыюць травам дых...

Кожны без выключэння паэт сутыкаецца з праблемай метафарычнасці, ці, калі так можна сказаць, метафаратворчасці. Заўсёды хочацца сказаць ярка, знайсці свежы вобраз. І тут ужо нехта піша інстынктыўна, а нехта, давяраючы сэрцу, правярае яго розумам.

Праўда, найбольш глыбокае спалучэнне логікі з эмацыйна-вобразным адлюстраваннем жыцця адбываецца ў публіцыстыцы, якая прызвана аператыўна асэнсоўваць актуальныя праблемы сучаснасці. Публіцыстыка першых нумароў адпавядае гэтаму.

"Полымя" адкрываецца артыкулам Таісы Бондар *"Будучыня залежыць і ад нас"*, у якім пісьменніца сцвярджае: *"Духоўная згода, узаемнасць і цярпімасць — галоўныя састаўныя адзінага маральнага закону для чалавека і Сусвету, следаванне якому можа ўратаваць людства і Зямлю ад самазнішчэння, утаймаваць стыхіі, што выйшлі з берагоў, павярнуць цывілізацыю на шлях эвалюцыйных пераўтварэнняў..."*

У "Маладосці" Таццяна Ільіна разважае на тэму моладзі і беспрацоўя ў артыкуле *"Жыццёвая пазіцыя нулявая ці не? "і між іншым адзначае, што "Насамрэч толькі сур'ёзны, самастойны, незалежны чалавек, не звяртаючы ўвагі на акалічнасці жыцця, можа знайсці сябе. Галоўнае, каб была мэта"*.

Літаратурны 2004 год пачаўся шматабяцальна — ярка, імкліва, у нечым нават экстравагантна — можна спадзявацца, што сумаваць не прыйдзецца. Зрэшты, і крытыкуецца звычайна тое, што дае надзею — жывое і зменлівае.

«ЧАСТАЧКА КАЛЯРОВАЙ НІТКІ...»

Абяцаюць нам новы раскошны дом,
Але *тут* нам жыць і канаць,
Тут пад кожным навекі здабытым бугром
Нашы продкі забітыя спяць.

Яны аддалі нам меч і касу,
Слова з вуснаў, цяпер нямых...
І нам немагчыма пайсці адсюль
І пакінуць са смерцю іх.

Ул. Караткевіч

ПЯРСЦЁНАК АПОШНЯГА ІМПЕРАТАРА

Пралог

На чалавека палююць часцей, чым на звера.
Іншыя гома сапіенсы, вядома.
Прынамсі, ягоны анёл-ахоўнік схаваўся, мусіць, нуль за тую аблачыну і роспачна захінае светлы твар лёгкімі рукамі, каб не бачыць перапэцканага гразёю і крывёю падапечнага. Той уцічаміўся спінай у зарослую кісліцай яміну пад вывернутым карэннем сасны і дрыжыць ад стомы і адчаю, і дыхае хрыпла і хутка, як і належыць зацкаванаму звяру. І ўжо, мабыць, нічога чалавечага не засталося ў ягоных запалых вачох... Хіба той самы сіні колер, за які сябры называлі яго Валошкаю... Чалавек, нібыта спрабуючы пазнаць самоту. Следчыя шчыра рагаталі над спробай пяці студэнтаў стварыць Каралеўства Беларусь. <...> Асабліва здзекаваліся над патэнцыяльным каралём. Ён выявіўся надзіва ўпартым. Нават схітрыўся збегчы падчас перасылкі. Ратуючыся ад пагоні загінуў". Усё ж, відаць, аднаму з тых студэнтаў пашанцавала выжыць... Хто ён? Тут "апазнавальнаю" прыкметаю служыць крумкач, што "як чорны анёл-ахоўнік" заўсёды сядзіць на плячы "зэка № 1-756". Відавочна, што гэта тая самая птушка, якая засталася ў спадчыну Магдаліне Дарбут ад Івана Канстанцінавіча Хмеля.

Такім чынам, дыялектыка развіцця сюжэта выяўляе таленавітую і арыгінальную аўтарскую канцэпцыю, якая культывуе спецыфічную "чытацкую дыскцыпліну" — вымушае быць пільным і паслядоўным, падпарадкуе харызматычнаму накірунку апавядальнай плыні, а сама пісьменніца бачыцца здольным знаўцам тэхналогіі кіравання свядомасцю. Бясследна знікае тая самая "раздражнёнасць", чытач адчувае сябе "далучаным" да сутнасці прыватна-аўтарскай мастацкай дактрыны, яе саўдзельнікам, апантаным жаданнем разблытаць і звязаць у адзіную нітачку заблытаныя сувязі чалавечых лёсаў. Як вядома, што "ўсе дарогі вядуць у Рым", так робіцца відавочным, што ўсе фабульныя перыпетыі вядуць да цэнтруючага персанажа — Магдаліны Дарбут. А яна — галоўная гераіня — як экстрасенс-праваднік наладжвае сеансы сустрэч чытачоў з мінуўшчынай, сама высвятляе нечаканыя, невядомыя ёй раней абставіны жыцця ўласных продкаў, пакутліва прапускаючы праз сваю свядомасць страшныя рэаліі з жыцця папярэднікаў, разумеючы, што "мяжа між добрымі намерамі і паскуднымі справамі сцёрта мільярдамі крокаў...".

Дынаміка сюжэта пачынае найбольш актывізавацца з эпізоду знаёмства Магды з "выдатным спецыялістам" у галіне гісторыі Канстанцінам Сташынскім. Гэты персанаж пісьменніца абмалёўвае амаль як антыпода "самавітага інтэлектуальнага Марка".

Спакваля, спачатку хістка і няпэўна ў фабульных штрыхах, а пасля і ўвачавідкі замацоўваючыся ў сюжэце, выяўляецца разуменне пісьменніцай тых асноў, маральнага грунту, на якім прарастае каханне. Л. Рублеўская праводзіць выразную думку аб тым, што духоўная блізкасць, адзінства поглядаў-значна мацнейшыя за пачуццё сацыяльнай абароненасці, своеасаблівай грамадскай "сытасці", якую даюць прэстыжны дыплом аб адукацыі і ўплывовы жаніх. Дзякуючы тонкаму, датклівому мастацкаму афармленню аўтарам спецыфікі пачуццяў герояў, іх душэўных станаў, фінальныя падзеі аповесці ўспрымаюцца не толькі натуралістычна, цалкам зразумела, больш таго — яны ўжо чакаліся, абумоўленыя папярэдняй логікай. Эпізод сутыкнення на Кальварыйскіх могілках з падлеткамі-наркаманамі, якія да ўсяго астатняга лічаць сябе ці то "скінхедамі", ці то проста "пакрыўджанымі светам" — робіцца спецыфічным каталізатарам духоўнай сутнасці герояў. "Няўпэўненая" ў сабе Магда выяўляе сапраўдную мужнасць, застаецца побач з Кастусём да апошняга, Кастусь — у імя ідэі, дасягнення мэты — здольнасць на гераізм, а Марк — спачатку ўласцівую яму заўсёды практычнасць, а пасля (мабыць генетычную) хітрасць і подласць. Генетычная сувязь з мінуўшчынай мае ўвасабленне і ў лёсе Магды, чые вершы персаніфікуюць светапогляд яе дзеда — "беларускага караля" паэта Алеся Валошкі.

Такім чынам, чытачы аповесці Л. Рублеўскай сталі сведкамі і нібыта віртуальнымі ўдзельнікамі чароўнай вандроўкі ў мінуўшчыну, пазнаёміліся з адметнымі героямі розных часоў, у тым ліку і нашага часу. Відавочна, што пісьменніца кіруецца ва ўласнай творчасці запаветамі Ул. Караткевіча, які здолеў даць нам "ключ ад нашага дома", а яна, як руплівая гаспадыня, дапамагае асвойвацца ў гэтым доме.

Нельга не пагадзіцца з меркаваннем В. Шынкарэнкі, якая адзначыла "плённасць намаганняў у распрацоўцы адметных мастацкіх форм, скіраваных на асэнсаванне мінуўшчыны, у беларускай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў". Відавочна таксама і тое, што плеяда сучасных пісьменнікаў выступае ў ролі аналітыкаў, адлюстроўвае свой прыватны пункт гледжання на былое, але выразна прасочваецца пэўная тэндэнцыя — сувязь у творах мінуўшчыны і сучаснасці, выяўленне духоўных асілкаў, якія былі ва ўсе часы, і, безумоўна, ёсць сёння. Аповесць Л. Рублеўскай з'яўляецца своеасаблівай маральнай падтрымкай сучасніку, стымулам да пільнасці, каб не парывалася сувязь часоў, каб "памяць не жабравала на пагосце". Гэта думка па-мастацку каларытна і выразна інтэрпрэтуецца ў рытарычным пытанні напрыканцы аповесці: "Хто ведае, можа, мой ці ваш лёс — таксама працяг, частачка гэтай каляровай ніткі?"

Лада АЛЕЙНІК

Гісторыя, якая разгарнулася ў аповесці Людмілы Рублеўскай «Пярсцёнак апошняга імператара», выклікала ў мяне на працягу чытання неадназначныя эмоцыі. Пралог, дзе пакутліва-пафасная смерць (калі так можна сказаць пра смерць) невядомага змагара за радзіму, якога «сябры называлі Валошкаю», не выяўляе ні дакладнага часу падзей (хоць інтуітыўна і зразумела, што гэта колькі стагоддзяў таму), ні сутнасці здзейсненага чалавекам «злачынства». Нават думкі героя, знясіленага ўцёкамі ад пагоні, — прыкрыя і самаіранічныя — не прасвятляюць становішча: «Чаму яны з сябрамі заўсёды ўяўлялі радзіму ў абліччы Чароўнай Дамы, няшчаснай і адначасова жорсткай, за якую варта памерці і ад якой нельга чакаць удзячнасці? Рамантыкі...»

Далейшыя раздзелы твора выяўляюць усё новых дзеючых асобаў — адзінкамі і цэлымі кагортамі — паміж якімі пакуль што не ўсталёўваюцца відавочныя сувязі. На пачатку — вяртанне ад даўніны ў сучаснасць, у раён «маскоўскіх камуналак». Маладая дзяўчына Магдаліна Дарбут, студэнтка Літінстытута, выконваючы «грамадскае даручэнне» (наведваць адзінокіх старых людзей, «распытваць іх пра надзённыя патрэбы»), знаёміцца з дзіўным чалавекам, Іванам Канстанцінавічам Хмелем, які памірае праз некалькі дзён, пакінуўшы яе адзінай спадкаемніцай. Праз гэтую спадчыну дзяўчына «вылятае» з інстытута, дзе «блюдуць» чысціню нораваў, а той стары, як высветлілася, быў рэпрэсіраваны «вораг савецкай улады».

Л. Рублеўская нібыта наўмысна вымалёўвае вобразы неяк няпэўна, абстрактна. Пэўныя рысы даволі хутка набывае толькі Магдаліна — ужо бачны ўпарты характар, цікавасць і цікаўнасць да навакольнага свету, але таксама выразна відаць і няўпэўненасць дзяўчыны ў сабе, схільнасць падпарадкоўвацца практычнаму Марку. Сам жа Марк, жаніх дзяўчыны, адначасова і яе падтрымка, галоўны дарадчык, заступнік, не выклікае ніякіх супярэчлівых пачуццяў — пісьменніца дакладна прадставіла цудоўнага, вельмі «станоўчага» чалавека або, як кажуць, «мару любой жанчыны».

Чарговыя раздзелы аповесці — «Два крыжы» і «Кальварыйскія вароны» — зноў адлічваюць час назад. У адным раздзеле — гэта шлях на цэлыя стагоддзі, у другім — пачатак XX ст. Зноў вынікаюць новыя постаці, але паранейшаму фабульныя адзінкі ніякім чынам не уніфікуюцца ў пэўнае кола сувязей, не набываюць сінкрэтычнай з'яднанасці. Вось тут і з'яўляецца своеасаблівая раздражнёнасць — ну, спадарыня пісьменніца, ці не занадта згушчаюцца фарбы? Кожны асобны раздзел аповесці — па-свойму арыгінальны, загадкавы і ўплывовы — робіць свой уплыў на чытача. А чытач знаходзіцца ў становішчы сомелье, які, пакаштаваўшы цудоўнага напою, не мае права выпіць да дна цэлы кубак, а павінен спрабаваць усё іншыя.

Сувязі ў часе і асяроддзі герояў набываюць абрысы вельмі паступова. Так, мабыць першай згадкай на дачыненне Магдаліны Дарбут да персанажаў з далёкай мінуўшчыны з'яўляецца фраза ў раздзеле «Два крыжы» — «сын падкаморага Юрася Дарбута нарадзіўся праз сем месяцаў...» Супадзенне прозвішчаў выпадковае? Ідэнтыфікацыя гераіні яшчэ не зроблена, але пачатак на гэтым шляху пакладзены. Пісьменніца, хітруючы, здаецца, цудоўна разумее, што чытач ужо стаў адэптам сюжэта, яго замбіраваная свядомасць цалкам належыць яе ўладзе, таму адразу «адкрываць карты» не мае сэнсу. Але першапачатковае каштаванне чытачом сплочана — ён цалкам адданы аўтарскай волі — таму ўзнагароджваецца порцыяй інфармацыі.

Раздзел «Сібірскія крумкачы» адкрывае таямніцу лёсу той кампаніі, якая калісьці на Кальварыйскіх могілках даследавала радавод аднаго са сваіх сяброў ды абмяркоўвала шляхі ўтварэння «Каралеўства Беларусь». Але ж яны ўсе загінулі? «Іх узялі <...> праз тры месяца

НАРАДЗІЛАСЯ ЖАНЧЫНАЙ

Жыве ў Беларусі паэтэса, кандыдат "мовазнаўчых" навук і проста добры чалавек, цікавы і арыгінальны. Гэта Таццяна Траханкіна. Яна нарадзілася ў Іжэўску ў 1971 годзе ў сям'і, як заўважае яна сама, "паэтаў-аматараў". Выхоўвалася і вучылася ў Наваполацку. У вольны час Таццяна перакладае творы нямецкіх паэтаў — рамантыкаў і неарамантыкаў — на рускую мову, якія ў Таццяніным перакладзе нядаўна былі апублікаваны ў часопісе "Всемирная литература".

Біяграфія маладой паэтэсы небагатая на падзеі. У 1997 годзе яна закончыла Белдзяржуніверсітэт, а потым — аспірантуру. Абараніла кандыдацкую дысертацыю, працуе ў тым жа Інстытуце мовазнаўства ў аддзеле беларуска-рускіх моўных сувязей. Літаратурны дэбют паэтэсы адбыўся ў калектыўным зборніку "Русло". Вершы друкаваліся ў айчынных перыядычных выданнях, паэтычным зборніку маладых аўтараў "Побеги" (Мінск — Полацк, 1998). Таццяна — сябра літаб'яднання "Полоцкая ветвь". Вершы яе прываблiваюць свежасцю думкі, наватарскім пошукам у галіне формы. Марыць маладая паэтэса напісаць п'есу, у якой яна выказала б свае погляды на свет...

Мяркуйце самі аб мастацкіх вартасцях Таццянінай паэзіі:

Я живу столько лет ожиданием
радостной встречи,
Что обронит мечта, как бродяга,
последний кусок.
И тогда я за всё, и тогда я на всё
вам отвечу,
Чтобы вечным не стал
моего ожидания
срок.

Што ж, чаканне — даволі няўдзячная справа... Ці не лепей дзейнічаць?.. Не адкладваючы, як кажуць, і не марудзячы. Навошта згадваць былое, мінулае — не ў гэтым жа шчасце...

Да, с любовью не повезло.
Но не век же ползать
от горя!
Пора в гору.

Вось якраз такі і сімпатычная нам, думаецца, лірычная гераіня Таццяны сваёй актыўнай жыццёвай пазіцыяй, любоўю, спачуваннем і шкадобай, выказанай у дачыненні да навакольных людзей. Простыя словы, якімі напісана аб простых рэчах. А сказана і па-людску, і не так, як усе.

Не икона я.
И не латаю
Душ чужих
от застарелых ран,
А толпа с охотою швыряет
Мне грехов своих
ненужный хлам —
Я грехов, увы, не отпускаю.

І калі пазнаёмішся бліжэй з паэзіяй Таццяны, ды і з ёю самой, цябе не пакіне ўжо адчуванне палёту, з якім жыве паэтэса і якое перадаецца іншым. Хай бы ўзлёт яе быў высокім, а палёт доўжыўся бясконца! Расці, Таццяна, і не забывайся пра сваё захапленне паэзіяй, што так самотна можа пачуваць сябе ў храме навукі. Верыцца: ты яшчэ скажаш важкае слова ў нашай літаратуры.

Пусть даже кто-то,
обо мне услышав,
С усмешкой сплюнет
сквозь щербатый рот —
Я поднимусь
неизмеримо выше,
Чем этот одичавший небосвод.

З пажаданнем высокага і годнага паэтычнага палёту —

Святлана ЯВАР

«БЕЛАЯ БАЛАДА» Ў ДОМЕ ДРУЖБЫ

5 лютага ў сталічным Доме дружбы адбылася вечарына "Беларусь - белая балада", прысвечаная развіццю беларуска-балгарскіх літаратурных сувязяў.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел сябры Беларускага таварыства дружбы, прадстаўнікі Пасольства Балгарыі ў Беларусі, літаратары, студэнцкая моладзь. Гучалі вершы беларускіх і балгарскіх пісьменнікаў; адбылася дыскусія аб двухбаковых літаратурных зносінах.

Па словах вядучай вечара, намесніка кіраўніка таварыства "Беларусь—Балгарыя" Аксаны Бубновай, "ні з адной іншай літаратурай свету ў сучаснай беларускай літаратуры няма лепшых стасункаў, чым з балгарскай". Пра гэта сведчаць шматлікія падзеі, якія адбываліся на працягу апошніх трох гадоў у Мінску і Сафіі: выданне зборнікаў нашых паэтаў Якуба Коласа, Янкі Купалы, Сяргея Законнікава, Вольгі Іпатавай у перакладзе на балгарскую, зборнікаў вершаў балгарскіх паэтаў пра Беларусь. І, як вы памятаеце, у 2000-м годзе ўбачыла свет "Анталогія беларускай паэзіі" .

Мікалай АНІШЧАНКА

ПАЭЗІЯ БАРАЗНЫ

У Слонімскай друкарні выйшлі пад адной вокладкай вершы, пісьмы і артыкулы заходнебеларускага паэта Алеся Мілюця (1908-1944). Кніжка мае назву "Паэзія баразны". Сабраў спадчыну паэта, напісаў прадмову да кніжкі і па-мастацку яе аформіў Мікола Бусько. Алесь Мілюць родам з вёскі Скорычы Карэліцкага раёна. Да вайны друкаваўся ў заходнебеларускай прэсе, а калі пачалася вайна — пайшоў на фронт і загінуў ва Усходняй Прусіі. Асобнай кнігай раней яго творы не выдаваліся. Паасобныя вершы паэта былі надрукаваны ў калектыўных зборніках "Мы іх не забудзем", "Сцягі і паходні", "Крывёю сэрца" і "Ростані волі".

Складальніку кнігі ўдалося знайсці вершы Алеся Мілюця ваеннага часу. Таму акрамя паэтычных радкоў, якія былі напісаны ў другой палове 30-х гадоў, чытач упершыню зможа пазнаёміцца з вершамі, што з'явіліся і ў пачатку 40-х гадоў. Не ўсе яны роўныя ў мастацкіх адносінах, але некаторыя запамінаюцца сваімі цікавымі вобразамі і параўнаннямі:

Нехта дужы, і смелы, і горды
Расчасаў па загонах чупрыны,
І запелі шчаслівым акордам
Стрэхі хат і дарог каляіны.

Алесь Мілюць пэўны час працаваў бухгалтарам сельпо, а пасля ў многіх вёсках заснаваў кааператыўныя суполкі, ды і назвы ў іх былі беларускія, такія, як напрыклад "Сноп", "Надзея" і іншыя. У кнізе Алеся Мілюця ўпершыню надрукаваны ягоны рэферат, з якім паэт выступаў на з'ездзе ўправы кааператываў у Турцы ў 1937 годзе, а таксама артыкулы і выступленні "Нашы заданні і патрэбы" і "Кааперацыя на абсягу гміны Турэц", дзе аўтар разважае наконт кааперацыі, ён у прыватнасці піша, што "кааперацыя — гэта не толькі прамысловасць і гандаль, як, магчыма, некаторыя гэта бачаць, а ў сваю чаргу, — гэта школа нашага заможнага жыцця".

У кнізе "Паэзія баразны" змешчаны таксама лісты Алеся Мілюця з фронту да старэйшай ягонай сястры Марыі. Амаль у кожным пісьме паэт хваляваўся пра сваю сястру: "Ты ж, дарагая сястрыца, не плач і не шкадуй, а глядзі толькі сябе. Галоўнае не прастуджвайся. Апранайся і абувайся як мага цяплей, таму што цяпер цябе няма каму абараніць...". Кніга Алеся Мілюця выйшла накладам 1000 паасобнікаў і складальнік шчыра дзякуе старшыні Карэліцкага райвыканкама Івану Шматко за фінансавую падтрымку гэтага выдання.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПРЭЗЕНТУЕ «ЗЬНІЧ»

Сёння, 20 лютага, у Беларускім паэтычным тэатры аднаго акцёра "Зьніч" — сустрэча з Анатолем Вярцінскім. Адбудзецца прэзентацыя новай кнігі паэта "Жанчына. Мужчына. Каханне". Вечар прадоўжыцца паказам спектакля "Любіць!" паводле твораў А. Вярцінскага.

23 лютага будзе паказаны адзін з лепшых спектакляў тэатра — "Кроткая" паводле Ф.Дастаеўскага. Пастаўлены ў 1996 годзе (рэжысёр Уладзімір Забела, сцэнограф Барыс Герлаван, музыка Алега Залётнева), ён апошнім часам не з'яўляўся на афішы "Зьніча". Між тым, увасабленне класікі ніколі не страчвае сваёй актуальнасці, асабліва калі ў цэнтры ўвагі — душа, каханне і трагічная адзінота чалавека, звычайнага і непаўторнага. У гэтым зноў пераканае "Кроткая" і яе адзіны выканаўца — бліскучы акцёр, майстар пераўвасаблення, заслужаны артыст Беларусі Уладзімір Шэлестаў.

Імпрэзы адбываюцца ў тэатральнай зале па адрасе: вул.Савецкая, 15 (касцёл св. Сымона і св. Алены). Пачатак а 19-й гадзіне.

С. Б.

ПАСПЯШАЙ!

Таіса БОНДАР

СВІТАЕ ВЕК ЭПОХІ ВАДАЛЕЯ...

* * *

Каб спазнаць, што каму
ў гэтым свеце мілей,
Трэба жыць, проста жыць,
не чакаючы смерці.
Мець, каму пакланіцца, —
адна з прывілей
Незалежнага, вернага, вольнага
сэрца.

Незалежнага, вернага, вольнага
ў тым,
Што спрадвек вызначае
духоўную сутнасць
Тут, пад небам, у промнях
святла залатым,
Дзе нічога не значаць
адсутнасць, прысутнасць...

Па законах Зямлі нараджаецца плоць,
І душы не ўзляцець над Зямлёю,
не ўзняцца
Без любві да ўсяго, што даруе
Гасподзь,
Без любві да Яго, Ўсемагутнага
Збаўцы.

І таму я ўслаўляю любоў і прашу
За Зямлю, над якой развінаюцца
крылы
Неабдымнае высі,
прашу за душу,
Улюбёную ў чыстую сінь небасхілу.

* * *

Знасілася неба спадзеўкі
На дзень шчаслівейшы, на лёс,
А сэрца не ўзгадвае слёз,
Пралітых па зжытаму веку.

А сэрца не хоча здавацца,
І радасць вось-вось зацвіце:
Гасподзь, па Сваёй дабраце,
Самоту раззяе палацам.

І ўспыхне ў завоблачнай высі
Не сонца, а ўсмешка Хрыста.
Знасілася неба? Прыўстань,
Устань над сабой, падзівіся!

Усё патанае ў любові,
Якою праменяцца дні.
Пагасла надзея? Зірні!
Усе сем нябёсаў з табою!

І я прыўстаю. І дзіўлюся
На сонца, на светлы абраз
І ў сэрцы, і ў небе над Руссю,
Які не згасаў і не згас.

* * *

Людзі — толькі людзі... І калі
Неба збудзіць душы для палёту,
Пэўна, не ўсвядомяць на зямлі
Ў зорным атачэнні адзіноты.

Ну, рванеш кашулю на грудзях:
Збрыдла! моташна! сячыце вузел!
А як доўжыў, так і доўжыць шлях
Рух па крузе, зноў і зноў па крузе.

Людзі — толькі людзі... Мітусня
Паглынае дні, гады, стагоддзі:
Дзе лілася кроў — шуміць трысняг,
Дзе ўзвышаўся храм — аблокі
ходзяць.

І паўсюль — галеча і жуда
Спусташэння, пустаты духоўнай,
Бо ніхто ніколі не ўзжадаў
Памаліцца за свой род грахоўны.

А былі ж падзвіжнікі — былі! —
І ў ашрамах, і ў скітах таёжных.
Што ж так цяжка дыхаць на Зямлі,
Што ж за шлях унука так
трывожна?

* * *

Свет да прадаўшых Бога не дабрэе...
Сівы рабін каля Святой Гары,
Угнуўшыся над трэбнікам старым,
Гундосіць пра абранніцтва габрэяў.

Абранніцтва?! Хрыста —
укрыжавалі,
Збаяўшыся святла Яго душы!
Прыйдзі Ён распачатае вяршыць,
І сёння б узвялі на крыж без жалю.

Каго змянілі два тысячагоддзі?
Хто змог пераступіць цераз заклён,
Што продкі колісь кінулі на кон,
З былым сваім і будучым у згодзе?

Адлік пайшоў назад. І час адплаты
Цяпер не за гарамі, як было.
Ужо ліецца на зямлю Святло
Таго, прад Кім да веку вінаваты.

* * *

Колькі каляровай мішуры
З цягам часу сцежкі назбіралі!
Фотакарткі, споміны, шары,
Запрашэнні, шалікі, каралі...

Перабраць бы, выкінуць, забыць,
А душа ізноў пагляд адводзіць,
Бы баіцца неўзнарок разбіць
Злепак часу, крохкі па прыродзе.

Ён нябачны, так, але заўжды —
І таемны схоў, і знак ахоўны.
Пацямнее — і чакай бяды,
Разаб'ецца — і твой век няпоўны.

А душа... Каму, калі не ёй
Апярэджваць той ці іншы ўчынак?
Пасяджу сам-насам з цішынёй,
Патужу без бачнае прычыны.

І ўздыхнуўшы (лгуць календары!),
Засланюся ад былога ўсмешкай:
Столькі непатрэбнай мішуры
За гады паназбіралі сцежкі...

* * *

Не хачу крыўдаваць — і крыўдую
На няўмольны выпадак зрэдчас:
Паляваў на мяне маладую
Ці ўсур'ёз, ці адно напаказ.

А загнаў — і пакінуў у пастцы:
Хочаш — плач,
хочаш — сцежку грызі,
Са спадзеўкай, што сілы прыдасца
І адчай не пакіне ў гразі.

Я не плакала, не, я гукала
У цямрэчу, у дождж, што слабеў,
Да Таго, каго ведала мала,
Каму верыла больш, чым сабе.

Ён — адзіны, Хто мог памагчы мне,
Хто адвёў і цямрэчу і смерць...
Цэлы век — у жыцця за плячыма,
З гэткай ношкай ужо не ўзляцець.

А здаецца: лячу, як ляцела,
Над дажджом, за гуканнем сваім,
У прастор, што, як храм апусцелы,
Прамяніцца святлом залатым.

* * *

Пазачассе. Па грэбню эпох
Свет, знаёмы да зморычынкі, рвецца.
Боль такі, што спыняюцца сэрцы,
Енк такі, што не чуе нас Бог.

Больш не чуе. Ні ў храме, ні ў полі,
Ні ў касмічнай прасторы над ім.
Час люструе ў бяздонні сваім
Толькі ўспышкі адчаю і болю.

Толькі ўспышкі... Імгненні тугі...
Усё роўна, хто стане ахвярай...
Ураганы. Паводкі. Пажары.
Катастрофы. Наплывы смугі.

Шлях даўно і для ўсіх тупіковы.
Страх даўно і для ўсіх — павадыр.
І каб міг суцяшэння! Каб слова!
Пад нагамі пахруствае жвір...

І не ўзгадваем: Слова было!
Светлы водсвет Яго — ў запаветах,
Што пакінуты Госпадам свету
І дагэтуль крынічаць Святло.

* * *

Не заснуць да дня: то грымоты,
То — праз іх — галасы начы.
Непрыручаная самота
Агрызаецца і бурчыць.

Мо дарэмна штоноч спрабую
Спалучыць усе сем нябёс
У адну сцяжыну — любую! —
Праз уласны няжзыты лёс?

Мо губляю замнога сілы,
Выпрабоўваючы душу?
Я не знаю: яна прасіла —
Я спагады ў яе прашу...

Не спагады ж, урэшце, трэба
Дачакацца, а цішыні,
Над якою ў бязмежжы Неба
Зацвітаюць стагоддзі-дні.

Дзесьці там, у адным з суквецця ў,
Будзе знічкаю ззяць мой дух —
Толькі б клікаў вышынны вецер,
Толькі б зноў разамкнуўся круг.

* * *

Уцягнутая ў ракавіну неба,
Душа зямлі пазыку аддае,
Даўно ні ў чым не чуючы патрэбы:
Знікаюць сны — ахоўнікі яе.

Не сняцца больш дзівосныя сады
У дыяментавым зіхценні кветак,
Не вабяць крылы сонечнага ветра
Над светам незнаёма маладым.

Я там была не раз. Я знаю шлях.
І не спяшаюся пакінуць цела
Распаду, груганню, што наляцела,
Круга расцерушыўшы сум і страх.

Перш трэба разагнаць іх, адагнаць
Ад поля,
дзе сяўба вось-вось пачнецца.
Спіць Дух народа? Але Ён прачнецца!
Паўсюдна ноч? Але не ёй світаць!

Марудна, ледзь заўважна для Зямлі
Світае век эпохі Вадалея,
І знаю: ён дрымоту адалее,
Каб дух народа сілай наталіць.

* * *

Няўжо і гэты, новы век —
бяскрылы?
Ні дзейснай мары, ні надзей, ні сноў.
Святыні зніклі, ці пакрыты пылам,
Не цэніцца ніводная з асноў.

І толькі рух па крузе —
круг за кругам —
Праследжвае прадвызначаны лёс,
І аднаго падхліствае папругай,
Другога гне, каб адвучыць ад слёз.

Ужо ж няважна па якой прычыне
Ніхто не хоча паслужыць Жыццю,
Як служаць Богу, Маці ці Айчыне,
А валачэ свой шлях, нібы ланцуг.

Ланцуг парвецца, як заўсёды рваўся,
А шлях прадоўжыць свой няспешны
рух
Не ў прастрані рэальнасці, не ў часе,
А ў царстве мары, дзе пануе дух.

Клён

Ён стаяў у канцы нашага невялікага саду, збоку, каля самай агароджы, якая абступала сядзібу. Высокі, стройны, прыгожы клён прыкметна вылучаўся сярод іншых дрэў. Адразу за клёнам пачыналіся "глінкі" — старыя і свежыя яміны, з якіх вяскоўцы капалі гліну. За "глінкамі" ішла палявая дарога. Цягнулася яна паўз агароды. У вёсцы чамусьці ўсе называлі яе "сценка". Гэтай дарогай кожнае лета, жывучы ўжо ў горадзе, я крочыў да бацькоўскай хаты. Яшчэ здалёку распазнаваў густую вершаліну клёна. Цёплая пяшчота аблівала маё сэрца — хутка я пералезу праз агароджу, прайду ціхім спелым садам, буду дыхаць сакавітым пахам медуніц і кропа, а затым увайду ў родную хату, светлую, прапахлую свежым хлебам.

На ўсё жыццё запомніўся мне гэты клён. Менавіта на ім раней, чым на іншых дрэвах садзіліся вясною шпакі і пачыналі высвіствацъ свае радасныя

Міхась ПАЗНЯКОЎ

песні навасёлаў. Калі з палёў і агародаў сыходзіў снег, і на ўзмежках паяўлялася зялёная траўка, мы, вясковыя хлапчукі і дзяўчынкі, ладзілі каля яго свае гульні. Кожны лічыў за гонар залезці на самую вершаліну клёна і заспяваць: "Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы..." А крыху пазней, у маі, калі з'яўляліся хрушчы, мы трэслі кляновае голле ўвечары або ранкам, стараючыся адзін перад адным больш сабраць сонных яшчэ жукоў.

Вельмі захапляў нас клён увосень, якая шчодра аблівала яго яркай пазалотай. Прыбяжыш да клёна, а пад ім такі святлісты дыван — вачэй не адарваць. Танцуеш ад радасці за такое хараство.

Многія ў вёсцы, калі пяклі хлеб, бралі лісце з нашага клёна, каб усцілаць ім под печы. А яно заўсёды было шырокае, чыстае, нейкае святочнае. Штовосень мы акуратна засушвалі лісты, і потым усю зіму хату ўпрыгожвалі кляновыя букеты.

Памятаецца і вельмі прыкрае. ...Тады я вучыўся ў другім класе. Была вясна. Сакавік. Мне чамусьці захацелася паспрабаваць свежага кляновага соку. Прыхапіўшы бацькаву сякеру і трохлітровы слоік, я пайшоў да нашага клёна. Надсек у адным месцы, але сок не капаў, а цёк па ствале. Надсек у другім месцы, атрымалася лепей. Падставіў слоік. Пайшоў у хату. Чакаю, пакуль набяжыць хоць трохі соку. Ды тут бацька прыйшоў з працы. Гляджу і вачам сваім не веру: нясе ў руках мой пусты слоік. Сэрца ў мяне як абарвалася. Дасталося мне тады на арэхі... Цэлую гадзіну стаяў, прывязаны бацькам да клёна: "піў сок"...

Замазаў тата раны на ствале клёна, але доўга яны не зажывалі. Плакала дрэва...

Праз год зноў нехта надсек клён. Не шанцавала дрэву і пасля. Некалькі разоў ранілі яго, нібы некаму замінала гордае і шчырае хараство дрэва. І кожны раз я адчуваў сябе вінаватым, быццам гэта я нявечыў клён.

А мінулай восенню яго не стала — паваліла бура. Наляцела віхура на вёску, паваліла платы, сарвала некалькі чарапічных дахаў, загубіла і наш клён.

Прыехаўшы летам у водпуск, я не пазнаў здалёку бацькавай сядзібы. У шэрагу высозных дрэў, якія абступілі сад, віднеўся прагал, адсутнічала штосьці адметнае, дарагое. Мне зрабілася вельмі балюча. Зразумеў, што тады, у дзяцінстве, я надсек зарубкі не на кляновым, а на сваім целе, і яны пякуць цягучым, несціханым болем.

Цукеркі

У маленстве мне занадта нястрымна хацелася цукерак. Пэўна, таму, што крамы ў нашай вёсачцы не мелася, ды і сям'я ў нас была вялікая — шасцёра малых. Паспрабуй накупляйся на ўсіх, калі маці даводзілася пазычаць грошы нават на хлеб. Час той нялёгкі, канец пяцідзесятых гадоў: краіна яшчэ залечвала цяжкія ваенныя раны.

Каціласа клопатнае лета. Увосень я ішоў ужо ў другі клас. Патрэбна было купляць школьныя падручнікі, і мы з сяброўкам сабраліся ў суседнюю вёску, куды ў мясцовую школу аўталаўка з райцэнтра падвозіла на продаж падручнікі.

Маці дала мне (тады яшчэ хадзілі іншыя грошы) дзесяць рублёў, якіх якраз павінна хапіць на кнігі. Дзесятку яна паклала мне ў левую кішэньку пінжака, дастала з шафы новую хустку.

— Кнігі акуратна ўвяжаш, не пагубляй па дарозе, не забрудзь.

— Мамачка, дай на цукеркі, — пачаў прасіць я.

Мне дапамаглі малодшыя брат і сястра.

Маці паглядзела на майго аднакласніка Лёшку, які сціснуў у кулаку некалькі карамеляў і ці са дзве трымаў у роце, зноў развязала насоўку і дала рубель.

— Пакладзі ў правую кішэньку. Купіш цукерак, толькі ж усе не паеш.

З хаты я выходзіў самым шчаслівым.

— Глядзі, Міхасік, не пераблытай грошы, — папярэдзіла маці, — дзесятка — на кнігі, а рубель — на цукеркі.

Да суседняй вёскі, куды мы накіраваліся, было тры кіламетры. Па дарозе Лёшка пачаставаў мяне цукеркай. Яна хутка растала ў роце — смачная-смачная...

— Прадай мне цукерак, — не стрываў я і працягнуў сябруку рубель, як толькі мы выйшлі за крайнюю хату нашай вёскі.

Лёшка нібы чакаў гэтага, дастаў з кішэняў дванаццаць карамеляў. Восем я адлічыў, каб прынесці дамоў, адну разгарнуў і паклаў у рот.

Пакуль мы дайшлі да школы, у мяне засталося толькі шэсць цукерак. Я нічога не мог парабіць — з кожнай хвілінай цукерак хацелася больш і больш.

Падручнікаў не набылі. Аўталаўка з райцэнтра не прыязджала, і мы вырашылі пачакаць з гадзіну. Хадзілі па школьным двары. Лёшка захапіўся спартыўным гарадком, а мне ўсё карцела расправіцца з апошнімі цукеркамі. Адну за адной я з'еў і іх.

— Відаць, кніг сёння не дачакаемся, — вырашыў аднакласнік. — Пайшлі дадому.

Але вяртацца без цукерак мне не хацелася: дома ж меншыя чакаюць.

— Я пачакаю яшчэ, а ты ідзі, — угаварыў я Лёшку.

Як толькі той знік за прысадамі, я заспяшаўся да крамы.

Пакупнікоў там тоўпілася шмат, аднак я без ваганняў стаў у чаргу. Спачатку надумаў, што куплю толькі на рубель, ды чым бліжэй пасоўваўся да прадаўшчыцы, тым настойлівей нехта другі ўва мне падказваў, прымушаў: "купі на ўсю дзесятку, хопіць усім і надоўга..."

Цукеркі розных гатункаў у яркіх квяцістых абгортках спакусна пазіралі на мяне са скрыняў, што стаялі за прадаўшчыцай.

Яна, мабыць, колькі хоча іх есць, — думалася мне, — як добра. Эх, каб мая мама працавала тут!..

— Чаго табе, хлопчык? — абарвала мае думкі прадаўшчыца.

— Цукерак: дзюшэсу і барбарысу — на ўсе! — выпаліў я, паклаўшы на прылавак дзесятку.

— Што? — здзівілася тая. — Ты не памыліўся?!

— На ўсе! Мама сказала, вось і хустку дала — увяжыце, — цвёрда адказаў я, адчуваючы як агонь сораму апякае мяне ўсяго.

Калі вярнуўся дадому, маці корпалася ў градах. Мяне з радасным крыкам сустрэлі меншыя брат і сястра. У хаце я высыпаў цукеркі на стол. Значная частка іх хутка знікла. Я пазіраў на вясёлую карціну за сталом, шчаслівы, што столькі радасці ў хаце.

Праз некалькі хвілін увайшла маці. Хтосьці з дзяўчынак збегаў і пачаставаў яе карамелямі, выхваляючыся, што Міхась прынёс іх многа-многа. Яна паглядзела на стол, яе твар ад спалоханага зрабіўся гнеўным.

— Я ж цябе папярэджвала, каб толькі на рубель купіў! Ах ты, горачка маё, неслух паганы, — залямантавала маці, хапаючы рэмень.

— Не бі, не бі яго, мамуля, не бі, — кінуліся абараняць мяне меншыя.

Маці шпульнула ў кут рэмень і, выціраючы слёзы, выйшла з хаты.

Цукеркі мы елі тыдні тры, але ўжо без той радасці, з якой накінуліся на іх у першы момант. Маці больш не папракала мяне за растрату, ні на другі дзень, ні пасля. Толькі вочы ў яе былі сумныя.

Цяпер, праз многія гады, калі я ўспамінаю гэты выпадак, мне робіцца вельмі прыкра і балюча, бо выразна бачу маміны заплаканыя вочы. Як мне хочацца ўспамінаць яе вясёлай! Выкінуць бы гэты ўспамін. Няхай бы я тады вярнуўся дадому разам з Лёшкам... Ды з памяці гэтага ўжо не выкрасліш і нічога не пераробіш...

Алеська

На аўтобус, якім мог бы пад'ехаць да роднай вёскі, я не паспеў. І вырашыў дабірацца пешшу, напрасткі праз лес. Гадзіны дзве, прыкінуў я, — і буду ў бацькоўскай хаце.

Раскашаваў пачатак ліпеня. Надвор'е стаяла цёплае, сухое. Я нават узрадаваўся, што ёсць магчымасць прайсціся па дарагіх мясцінах, пабыць сам-насам з прыродай, якая помніць мяне яшчэ малечай. У такія хвіліны лёгка і хораша думаецца і ўспамінаецца.

Выйшаў за чыгуначную станцыю, пратэпаў з кіламетр па гравійцы і звярнуў на вузкую палявую сцяжыну, што вяла да лесу. Злева каласілася, шапацела жыта, з якога міла пазіралі сінія-сінія васількі. Справа лапушылася бульба.

Перад самым лесам сустрэў маленькую дзяўчынку з літровым слоікам у руцэ. Заўважыўшы мяне, яна вельмі ўзрадавалася.

— А вы таксама ў лес, дзядзечка? — бойка запыталася дзяўчынка.

— Так, — адказаў, — за гэтым лесам ёсць вёска, у якой я нарадзіўся.

— Тады і я з вамі да лесу, а то мамка напалохала мяне. Не хадзі, кажа, Алеська, у лес адна. Там ваўкі водзяцца.

— Праўду мамка казала табе, Алеська, — адной нельга хадзіць у лес, заблукаць можна.

— А вы мяне ведаеце? — здзівілася спадарожніца.

— Цяпер ведаю, а раней не. Ты ж сама імя сваё назвала.

— Ой, а я і не заўважыла, — засмяялася малая. — З вамі ўжо і не боязна мне, аніколечкі.

— У ягады сабралася? — пацікавіўся.

— Ага! Суніц трэба маме назбіраць. Захварэла яна. А доктар кажа, што ёй патрэбны вітаміны і ўсё самае смачнае і свежае.

— Малайчына. Толькі чаму ж адна выправілася ў лес?

— Не было з кім. Галька, мая сяброўка, да сястры ў горад паехала, а Лёнік на рыбалку збег. Ім добра...

Яна змоўкла, і я ўлавіў у яе маўчанні прытоеную скруху.

— Няхай бы тату з работы дачакалася, — падказаў я. — Адной і ягады сумна збіраць.

— Тата ў лес не ходзіць. У яго ўжо двойчы трактар забіралі, а ўсё роўна без гарэлкі жыць не можа. Я прасіла, каб не піў. Ён абяцае, але... Маму шкада, захварэла...

У мяне ў сярэдзіне як бы нешта абарвалася.

— Нічога, — пачаў супакойваць Алеську. — Маці паправіцца абавязкова. Зараз мы з табой суніц назбіраем, а для яе гэта сапраўды найлепшыя лекі. Ды і татка адолее сваю хваробу. Не век жа яму пакутаваць...

Мы ўвайшлі ў лес, як даўно знаёмыя. Цёплая Алесьчына далонька ў маёй руцэ і пачутае з яе вуснаў поўнілі сэрца пяшчотай і болем: "Заўтра ж схаджу ў праўленне калгаса, пагавару са старшынёй, адшукаю яе тату..." — вырашыў я.

Ягад ў лесе было шмат. Ярка-чырвоныя, духмяныя, яны радавалі вока, здавалася, самі прасіліся ў рукі. Не заўважылі, як назбіралі поўны слоік.

Я правёў дзяўчынку да самай гравійкі, перадаў ёй слоік, напоўнены сакаўнымі суніцамі, і мы развіталіся.

Ідучы да лесу, некалькі разоў азірнуўся. Кожны раз, нібы адчуваючы, Алеська паварочвалася ў мой бок, і на яе твары свяціла цёплая ўсмешка. Перад уваходам у засень дрэў я азірнуўся яшчэ раз. Алеська стаяла і махала мне ручкай...

Матчына надзея

Матчына сэрца! Колькі цеплыні, святла і чысціні нараджаецца, віруе ў ім! Матчына любоў! Што можа быць глыбей за яе?! Хіба толькі любоў да Радзімы, да роднага краю. Матчына вера, матчына надзея! Яны бясконцыя, як само жыццё.

Чым далей, тым больш і вастрэй адчуваю іх жыццядайнасць, усёмагутнасць, іх веліч. І не толькі таму, што з кожным годам усё далей і далей маё апошняе развітанне з матуляй — шчырай і клапатлівай, як пчолка, добрай, уважлівай і чулай, як ніхто. Не толькі таму, што ўсё часцей кліча да сябе невялікая вёсачка Забродзе на Быхаўшчыне, амаль бязлюдная, але па-ранейшаму атуленая садамі, бэзам, клёнамі і ліпамі. Забытая і сумная, у якой блукае маё хутканогае залатое дзяцінства...

На ўсё жыццё ўзрушаны я сілай матчынай любові, веры і надзеі. Да апошніх дзён у душы будзе заставацца вобраз маёй бабулі Матруны Зыкавай. Нарадзіла адзінаццаць, выхавала сямёра дзяцей. Вайна адабрала яшчэ двух сыноў. Васілька, партызанскага разведчыка, пахавала сама, рызыкуючы жыццём. Ды, відаць, не рызыка гэта была — пад носам у фашыстаў тайна пахаваць сына-партызана. Гэта — праява мужнасці. На Пецьку, "самага меншанькага", атрымала пахавальную. Ды не паверыла ёй Маці. Трыццаць два гады чакала сына. У кожны выхадны дзень, у кожнае свята спачатку жвава, а як пастарэла, то з кійком, паволі спяшалася да бетонкі сустракаць свайго Пецьку. Усе трыццаць два гады прыслухоўвалася да гудзення машын, да начных шумаў, чакала: можа, Пецька прыехаў? Можа, сын стукае ў шыбу? — і цвёрда верыла: ён прыедзе! А разам з ёю, ужо як пачаў разумець і думаць, чакаў дзядзьку Пецю і я. Калі ж дарослыя казалі, што ён ніколі ўжо, мабыць, не вернецца, я моўчкі прымаў гэта за абразу, плакаў, забіваўся ў куток, і пачынаў верыць яшчэ больш. Крыўды як не было. Хіба мог я трымаць яе ў душы, калі побач была бабуля, якая і за 85 год не развучылася заставацца ласкавай, не страціла душэўнай гаючасці і чысціні.

Паміраючы, бабуля пытала: "Хто гэта прыйшоў? Гэта не Пеця? — і прасіла: "ён аб'явіцца яшчэ, чакайце..."

І я чакаў... І кожны незнаёмы ветэран вайны для мяне як дзядзька Пеця.

ЦІ ВАРТА ХАВАЦЦА ЗА СЦЕНЫ?

Студэнцкі тэатр Беларускага дзяржаўнага універсітэта называецца "На балконе". Бо там ён і месціцца — на балконе шостага паверха галоўнага корпуса знанай навучальнай установы, за межамі якой, дарэчы, таксама ведаюць гэты аматарскі творчы калектыў (ён двойчы, у 2001 і 2002 гадах, станавіўся лаўрэатам тэатральнага фестывалю ў Эдынбургу). На балконе і разгортваецца дзея, назіраць за якой могуць адначасова не больш як 30 гледачоў.

Нядаўна тут адбылася чарговая прэм'ера, трапіць на якую пашчасціла і мне.

... Адмысловыя дэкарацыі: срэбра і пазалота сцен; пасярод сцэны — невялікі залаты гадзіннік; на маленькім століку — мініяцюрныя кубачкі; у куце — грамафон. Прыцемненае святло, гучанне цудоўнай музыкі. Такім чынам ужо да пачатку спектакля ствараецца атмасфера таямнічасці, нібы трапляеш у нейкае іншае вымярэнне. Зрэшты, гэта адпавядае назве спектакля "ЗN, або Нешта Нявыказанае Намі...", пастаўленага па п'есе Т.Уільямса Сяргеем Турбанам (мастак Сяргей Кармазін, харэаграфія Алега Тарасава і Сяргея Бушчыка).

І вось на сцэне з'яўляюцца яны: ужо немаладая гаспадыня дома Карнэлія (Святлана Латышава) і яе сакратарка Грэйс (Вольга Астравух). Гэтая маленькая, крохкая жанчына адразу ж выклікае спачуванне: жыве побач з сухой, чэрствай Карнэліяй, якая, здаецца, не здатная на цёплыя пачуцці. Але ж ці ўсё гэтак проста!.. За маскай холаду і нячуйнасці можа хавацца няшчасны чалавек са сваімі слабасцямі, душэўнымі пакутамі, жаданнем пяшчоты і разумення.

Ратуючыся ад адзіноты, гераіні спектакля шукаюць узаемнай падтрымкі, перажываючы складаную псіхалагічную сітуацыю, калі ўсё, што жыве ў душах гэтых жанчын, вырываецца вонкі праз 15 гадоў іх знаёмства.

Сітуацыю спектакля кожны глядач "прымервае" на сябе, і міжволі задумваешся: як часта і мы ў сваім жыцці нешта недагаворваем і потым самі праз гэта пакутуем. Можа, людзям не варта ўзводзіць сцены адно перад адным — і тады ў свеце будзе менш адзіноты!..

Вядома, у тэатры "На балконе" іграюць непрафесійныя акцёры. Але рэжысёр Сяргей Турбан, які працуе з імі, дапамагае кожнаму раскрыць артыстычны талент. Нягледзячы на тое, вялікая ў яго роля на сцэне ці эпізод.

Вольга ЛЕШЧАНКА

НА ЗДЫМКУ: сцэна са спектакля.

Шляхетны духам, багаты пражытымі гадамі Яўген ЧАМАДУРАЎ — народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Таджыкістана, Літвы, Расіі, акадэмік Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР — сустрэў ужо дзевяты дзесятак.

ШАНЦАВАЛА ЗАЎСЁДЫ. НАВАТ ПРЫ СТАЛІНЕ

"Напэўна, кожны мастак аднойчы нечакана для сябе засяроджваецца на думцы: вось і надышоў час азірнуцца назад, угледзецца ў пройдзенае жыццё. Разабрацца ў старонках мінулага. Успомніць, якія падзеі, сустрэчы, акалічнасці вызначылі і выхавалі твае густы, ідэалы, творчую эстэтыку і погляды (...). У слоўніку Даля (...) знайшоў слова "чемодур" — на старажытнай паўночнай, вяцкай гаворцы гэта значыць "самавар" (...). Аднак слова "чемодур" знікла з жывога моўнага ўжытку ў XVI стагоддзі. І гэта давала падставу меркаваць, што пасля XVI стагоддзя мае продкі прысвоіць сабе аднакарэннае прозвішча не маглі. Высветліў: прозвішча Чамадуравых упершыню ўпамінаецца ў рускіх летапісах і дакументах як прозвішча служылых людзей у Казані (...).

Бацька маёй маці, Аляксандр Фёдаравіч Фон-Гелер, быў з абруселага, хрышчанага ў праваслаўе, нямецка-саксонскага сямейства (...). Маці расказвала, што Аляксандр Фёдаравіч (...) заканчваў старадаўні Лейпцыгскі універсітэт. Светапогляд, ідэалы, перакананні майго дзядулі фарміраваліся ў вірлівым студэнцкім асяроддзі, дзе папулярнымі былі ідэі Французскай рэвалюцыі 1848 года і тагачаснага паўстання ў Саксоніі. Завяршыўшы адукацыю, ён вярнуўся ў Расію горным інжынерам, пачаў працаваць на вугальных шахтах. Неўзабаве ажаніўся з Наталляй Міхайлаўнай Раеўскай — яна мела знакамітых у рускай гісторыі сваякоў, ды не мела сродкаў для жыцця: была беспасажніца. Здаецца, не дажыўшы і да трыццаці гадоў, Наталля Міхайлаўна памерла, пакінуўшы на мужа чатырох дзяцей. Аляксандр Фёдаравіч вырашыў неўзабаве змяніць занятак, прысвяціўшы жыццё геалагічнай палявой разведцы па золаце.

Воляю лёсу дзеці вымушаны былі пераадолець цяжкую дарогу ў Сібір — паўтарыць той шлях, што ў 1827 годзе выпаў на долю іхняй траюраднай бабулі Марыі Міхайлаўны Раеўскай, якую бацька выдаў замуж за дзекабрыста Валконскага".

Такая вось цытата з успамінаў Яўгена Чамадурава, што друкаваліся калісьці на лімаўскіх старонках. Нядаўна ён, старэйшы сцэнограф краіны, адзначыў свае 90. На яго "біяграфічнай карце" — Сібір, Паволжа, Пецярбург, Таджыкістан, Украіна, Масква; дарогі шматлікіх замежных вандровак. Балгарыя, пры Міністэрстве культуры якой два гады (1953-55) ён быў грамадскім саветнікам па пытаннях мастацтва. І, вядома ж, Беларусь, з якой у Я.Чамадурава звязана праца галоўным мастаком Вялікага Акадэмічнага тэатра оперы і балета, выкладанне ў Дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер Акадэмія мастацтваў).

У 1988 г. мне давялося пазнаёміцца з нататкамі Яўгена Рыгоравіча - будучай кнігай успамінаў, над якой ён тады працаваў. Нібыта патрымала ў руках люстэрка назіральнай мастакоўскай памяці, у якой — і ўласны радавод выбітнага чалавека, і аб'ектыўныя падзеі гісторыі, перажытыя ім асабіста, і сустрэчы: з Астравумавай-Лебедзевай, Лансэрэ, Ахлопкавым, Назымам Хікметам, Эрэнбургам; з Будзённым; са Сталіным... На старонках "ЛіМа" (газета за 21.10.1988 г.) удалося змясціць, зразумела, толькі сціплыя фрагменты багатага дакументальна-гістарычнага, з густам белетрызаванага матэрыялу.

•

Часу ды падзей з тае пары мінула — ага! Ды калі нядаўна сабралася сталічная творчая грамада на вернісаж, зладкаваны да 90-годдзя Я.Чамадурава ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, высветлілася зусім не святочная акалічнасць. Лёс унікальнага рукапісу — неахопнага і захапляльнага сваім жывым аповедам рукапісу кнігі "Без бога, царя и отечества", на жаль, дагэтуль не вырашаны, выдаўца так і няма. Зрэшты, гэта была, бадай, адзіная непрыемнасць, якая звярнула на сябе ўвагу ва ўрачыстай і па-сяброўску цёплай атмасферы юбілейнай імпрэзы.

Паважны ўзрост, выбрыкі надвор'я, капрызы здароўя, сумніў — а ці зможа прысутнічаць асабіста? — саміх арганізатараў невялічкай персанальнай выстаўкі... Нягледзячы ні на што, знаны імяніннік здолеў, у коле сямейнікаў, малодшых сяброў, музейшчыкаў ды ўсіх неабыякавых гасцей Музычнага завулка, годна спраўдзіць чын героя сустрэчы. Яго віншавалі намеснік міністра культуры Беларусі В.Гедройц, старшыня Беларускага саюза мастакоў У.Басалыга, колішнія калегі, вучні. Колькі было сказана пра душэўны арыстакратызм і творчы талент Я.Чамадурава; пра яго мудрасць, эрудыцыю, ненатольную дапытлівасць і шырыню светапогляду; адказнае стаўленне да прафесійнага абавязку і абыякавасць да ўнутрыцэхавых інтрыг; пра дзівосную мужчынскую абаяльнасць і любоў да жыцця! І пра яго захапленне Беларуссю, беларускай прыродай, беларусамі, у чыю гісторыю культуры ён, рускі чалавек, увайшоў гэтак шчыра, самааддана і арганічна. Гаварылася і пра яго дар настаўніцтва. Пра высокую тактоўнасць. Пра няўменне (ці нежаданне) падладжвацца пад сітуацыю, "хадайнічаць за сябе". І яшчэ пра тое, што яму ў жыцці заўсёды... проста шанцавала.

Калі надышоў момант для абавязковага слова ў адказ, юбіляр адмовіўся ад мажлівасці гаварыць седзячы. Зала, уражаная ўсё яшчэ велічнай яго паставай у элегантным смокінгу, магутным голасам, а галоўнае — яснасцю і дасціпнасцю думкі, слухала няспешны аповед.

"Дзевяноста гадоў — гэта дзевяноста. Але калі я штодня гуляю са сваім сябрам, сабакам Джоні па двары і заўважаю, што нікога паблізу няма, мы з ім бегаем, — з усмешкай прызнаўся Яўген Чамадураў. І зусім сур'ёзна прадоўжыў: — Напэўна, невыпадкова ў Маскве адбылася тая сустрэча, калі (падчас прэм'еры аформленага мною балета на лёдзе) падышоў пазнаёміцца Рыгор Якаўлевіч Кісялёў, колішні міністр культуры Беларусі. У нас адбылася вялікая размова, пасля якой мне захацелася апынуцца на Беларусі, быць тут. Здавалася, Беларусь такая блізкая да Расіі, і ў той жа час усё ў ёй гэтак нечакана, з такімі сюрпрызамі!.. Прыехаў. І як нідзе, я тут спакойна і творча працаваў. Імкнуўся спазнаць незнаёмыя з'явы, далучыцца да самабытнай культуры, гісторыі... Напэўна, вынікам сталіся тыя цёплыя словы сённяшняга прызнання, якія мяне зусім расчулілі.

Не ведаю, як атрымалася, але мне і праўда шанцавала. Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў у Лансэрэ і Астравумавай-Лебедзевай. Прычым, Ганна Паўлаўна чамусьці ўзяла нада мной, 19-20-гадовым, своеасаблівае вышэйшае духоўнае шэфства. Запрашала па вы-хадных на сямейныя абеды: маўляў, Жэня, гэта трэба вам, гэтага вы нідзе не ўбачыце, нідзе не атрымаеце. За абедам, апроч яе мужа, акадэміка медыцыны Лебедзева, збіраліся іншыя цікавыя людзі, размовы якіх і стасункі з якімі былі для мяне сапраўды другой акадэміяй.

Праз 6 гадоў навучання мяне пакідаюць у Пецярбургу — працаваць на кінастудыі. А я адмаўляўся, бо ведаў: старэйшыя выпускнікі, размеркаваныя туды ж, за год працы спраўна атрымлівалі зарплату, ды нічога пры гэтым не рабілі, — мяне такое не задавальняла. А тут прыехала дэлегацыя таджыкаў — запрашаць да сябе тэатральнага мастака. Я і пагадзіўся: экзотыка, Памір, праца ў акадэмічным драматычным тэатры... І зноў шанцуе: першым маім спектаклем аказаўся "Атэла", хаця мог быць дзіцячы ранішнік. Спектакль трапляе на тэатральную дэкаду ў Маскву, яго паказ у МХАТе наведвае Сталін, і з ложы даходзяць чуткі, што яму спадабалася. Нейкія "чыны" з ледзянымі вачамі прапануюць мне кудысьці прайсці — і я той ночы апыньваюся ў гасцях у Сталіна. Глядзім фільм "Волга-Волга". Раніцай у гатэлі выходжу па газеты і не паспяваю разгарнуць, як ужо бачу: я ўзнагароджаны ордэнам. А мне — 25 гадоў!

І гэтак — па ўсім жыцці: незвычайны збег акалічнасцяў, неспадзяваных стасункаў-сутыкненняў. Калі ў Літве рыхтавалі да маскоўскіх гастроляў прэм'еру оперы "Князь Ігар", да мяне звярнуліся з просьбай выратаваць спектакль, бо яго мастачка, не паспеўшы дарабіць касцюмы, пайшла ў дэкрэт. На такую сур'ёзную справу заставалася толькі тыдні два, а я ж на той час працаваў ужо ў Маскве, з Ахлопкавым, у тэатры імя Маякоўскага. Яму патэлефанавалі з Вільні, растлумачылі сітуацыю, папрасілі, каб мяне на нейкі час не загружалі. І дзякуючы школе Лансэрэ, які навучыў мяне вельмі хутка працаваць, праз 15 дзён я змог прадставіць эскізы касцюмаў — цэлых сто. Адразу ж вылучылі на званне заслужанага дзеяча мастацтваў Літвы...

Наогул, можна сказаць, што дзякуючы менавіта Лансэрэ я прыйшоў да тэатра і зрабіўся оперным мастаком. Ён гаварыў: "Жэня, ты можаш быць цікавым гістарычным жывапісцам". Так, студэнты пісалі сюжэты кшталту "Раніца ў калгасе" і да т.п. Я ж — нешта пра Пугачова ды іншых нешматлікіх народных герояў, чые імёны і тады не былі забароненыя. Лансэрэ казаў пра наяўнасць у маіх работах пачуцця гістарызму, а я падумваў: што ж буду пісаць? Гэта ж быў час... Трэба ведаць, які гэта быў час, 30-я гады. А я тады прыхвоціўся бегаць на спек-

таклі ў Малеготу, Малы ленінградскі оперны тэатр. Мяне захаплялі оперныя спектаклі. А між іншым, там разгортваліся ўсе сюжэты гісторыі, паўставалі гістарычныя героі, якія змагаюцца за ідэал, за вышэйшыя формы любові, сцвярджаюць патрыятызм. І гэта не забаранялася, нават заахвочвалася афіцыйна. Я сказаў сабе: стоп! Вось — гісторыя, і на яе няма забароны, значыць, і для мастака няма абмежаванняў. На двух апошніх курсах я перавёўся на тэатральнае аддзяленне і заняўся гісторыяй усур'ёз: наведваў музеі, бібліятэкі, архівы. Узбагачаў веды, многае пераправяраў.

Што да музычнай адукацыі... Заняцца ёю грунтоўна не выпадала. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны маці запрасіла піяністку-бабульку даваць мне тройчы на тыдзень урокі музыкі, з умовай, што хатнюю настаўніцу будуць у нас карміць. А з немцам, каб навучаў сваёй мове, даводзілася разлічвацца грашамі. І раптам — вырашаю ісці ў мастацкае вучылішча, што таксама вымагала грошай. Маці мусіла адмовіцца ад настаўніка-немца, я вучыўся і працаваў, у будаўнічы тэхнікум паступіў, каб набыць адпаведную спецыяльнасць і зарабляць... Давучваўся ў прыватнай школе, атрымліваючы так званую льготу. У Акадэмію мастацтваў паступіў 18-гадовым і аказаўся самы малады — тагачасным студэнтам было па трыццаць пяць, людзі вярталіся з грамадзянскай вайны...

Столькі часу мінула!.. Дайшоў я да Беларусі. Спадабалася мне вялікая сцэна тэатра оперы і балета. Такіх у колішнім Савецкім Саюзе было толькі дзве: у Вялікім тэатры ў Маскве ды ў Навасібірску. Мяне хвалявала праца над эпічнымі опернымі палотнамі. Афармляць спектаклі кшталту "Вяселля Фігара" або "Севільскага цырульніка" мне нават не прапаноўвалі. А вось "Барыс Гадуноў"... Чатыры разы аформіў гэты гігант! Двойчы ў Амерыцы, двойчы ў тэатрах Савецкага Саюза. У тым ліку была і мінская прэм'ера..."

•

Убор цара Барыса, дарэчы, упрыгожыў юбілейны вернісаж (да яго падрыхтоўкі актыўна спрычыніўся загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела музея А.Міхаленя). Госці вечарыны, адольваючы досыць крутыя лесвічныя маршы, пераводзілі дух, накіроўваліся ў выставачную залу і... І не маглі схаваць сваё захопленае здзіўленне, калі праз колькі хвілін убачылі тут высокую постаць у чорным гарнітуры з артыстычным гальштукам-матыльком: зрабіўшы ўзыходжанне на высокі трэці паверх, Я.Чамадураў выглядаў бадзёра, не спяшаўся адпачыць, зацікаўлена разглядаў і, жвава жэстыкулюючы, каменціраваў выстаўку сваіх работ, заўважыўшы, між іншым, з хітрынкай: "Я ўжо некаторыя і не памятаю".

Больш як 70 экспанатаў, пераважна эскізы дэкарацый ды касцюмаў да оперных спектакляў, адлюстравалі тонкую повязь выяўленчага мастацтва і музыкі, дазволілі адчуць гарманічны космас музычнага тэатра, у якім стваraў (які стварыў!) цудадзей-сцэнограф. Легендарная "Алеся" Я.Цікоцкага, оперы "Яснае світанне" А.Туранкова, "Калючая ружа" Ю.Семянякі, "Барыс Гадуноў" і "Хаваншчына" М.Мусаргскага, "Арэстэя" С.Танеева, балеты "Выбранніца" ды "Альпійская балада" Я.Глебава, "Святло і цені" Г.Вагнера, "Дон Кіхот" Л.Мінкуса, аперэта І.Кальмана "Сільва"...

Зразумела, у музеі ўдалося паказаць толькі невялічкую частку таго, што магло б скласці своеадметны візуальна-вобразны аповед пра вялікі творчы свет мастака тэатра. Свет бязмежна багаты, як сама гісторыя жыцця і пакут чалавека на зямлі, адлюстраваная ў фальклоры і ў летапісах, у сямейных паданнях і ў хроніках дакумента. У вобразнай памяці, у энцыклапедычным досведзе і ў неўтаймоўнай фантазіі выбітных творчых асоб. Выбітных і непаўторных, як Яўген Чамадураў.

С. БЕРАСЦЕНЬ

Андрэ МАРУА

Сэсіль і Ральфу Карзон

САБОР

У 18... годзе адзін студэнт спыніўся на вуліцы Сэнт-Анарэ перад вітрынай гандляра карцінамі. У вітрыне было выстаўлена палатно Манэ "Шартрскі сабор". Манэ тады ніхто яшчэ не захапляўся, акрамя некалькіх аматараў, але юнак меў добры густ. Прыгажосць гэтай карціны яго зачаравала. Шмат дзён ён прыходзіў зноў, каб паглядзець на яе. Урэшце рашыўся ўвайсці і спытацца пра кошт.

— Напрамілы Бог, — прамовіў гандляр, — яна тут ужо даўно. За дзве тысячы франкаў я яе вам саступлю.

Студэнт не меў такой сумы, але ён належаў да адной правінцыйнай сям'і, у якой грошы вадзіліся. Адзін з ягоных дзядзькоў сказаў яму перад тым, як ён ад'язджаў у Парыж: "Я ведаю, што значыць быць маладым. Калі тэрмінова што спатрэбіцца, напішы мне". Студэнт папрасіў гандляра не прадаваць палатно на працягу васьмі дзён і напісаў дзядзьку.

Маладзён меў у Парыжы каханку, якая была замужам за чалавекам шмат старэйшым за яе. І яна нудзілася, была трошкі вульгарная, але ж вельмі ладная. Увечары таго дня, калі студэнт пытаўся пра кошт "Сабора", яна сказала яму:

— Я чакаю заўтра візіту адной сяброўкі па пансіёне, яна прыязджае з Тулона, каб пабачыцца са мной. Мой муж не мае часу, каб забаўляць нас, таму разлічваю на вас.

Сяброўка прыехала назаўтра. Ды ў суправаджэнні яшчэ адной. Студэнт павінен быў шмат дзён суправаджаць жанчын у прагулянках па Парыжы. Так, аплачваючы абеды і спектаклі, ён і пражыў гэты імклівы месяц. Ён пазычыў грошы ў прыяцеля і пачаў непакоіцца, але ўрэшце атрымаў ліст ад дзядзькі. У ім ляжалі дзве тысячы франкаў. То была вялікая палёгка. Студэнт вярнуў пазыкі і зрабіў падарунак сваёй каханцы. Адзін калекцыянер купіў "Сабор" і значна пазней адпісаў яго ў спадчыну Луўру.

Мінаў час і былы студэнт пастарэў, стаў знакамітым пісьменнікам. Толькі ж ягонае сэрца засталося маладым. Ён яшчэ спыняецца ў захапленні перад краявідам або перад жанчынай. Часам на вуліцы, выходзячы з дому, ён сустракае пажылую даму, што жыве па суседстве. Гэтая дама — ягоная былая каханка. Ейны твар да брыдасці атлусцеў, а вочы, некалі прыгожыя, падкрэслены мяшкамі; над ейнымі вуснамі сівыя валосікі. Яна ідзе з цяжкасцю і відавочна, што ў яе кепска з нагамі. Пісьменнік яе вітае, але не спыняецца, бо яму брыдка і непрыемна думаць, што ён некалі кахаў яе.

Час ад часу ён ідзе ў Луўр і падымаецца ў залу, дзе выстаўлены "Сабор". Пісьменнік доўга глядзіць на яго і ўздыхае.

НАРАДЖЭННЕ МЭТРА

Мастак П'ер Душ завяршаў нацюрморт: кветкі ў слоіку з-пад зёлкаў, баклажаны на талерцы, — калі раманіст Поль-Эміль Глез увайшоў у майстэрню. Глез некалькі хвілін паглядзеў, як працуе сябра, потым голасна выгукнуў:

— Не!.

Мастак ад нечаканасці падняў галаву і кінуў дамалёўваць баклажан.

— Не! — паўтарыў Глез. — Не! Ты ніколі не праб'ешся. Ты ведаеш сваю справу, маеш талент, ты — шчыры. Але твой жывапіс — аніякі, мой даражэнькі. Ён не выбуховы, не гарласты. У салоне, дзе пяць тысяч палотнаў, нішто не спыніць перад тваімі работамі заспанага наведвальніка... Не, П'ер Душ, ты ніколі не праб'ешся. А шкада.

— Чаму? — уздыхнуў шчыры Душ. — Я перадаю тое, што бачу: імкнуся выканаць тое, што адчуваю.

— Справа вось у чым, мой бедны сябра. У цябе жонка, трое дзяцей. Кожнаму з іх трэба па тры тысячы калорый штодня. Карцін больш, чым пакупнікоў, і прыдуркаў больш, чым знаўцаў. Ну і чым жа можа П'ер Душ вызначыцца ў натоўпе невядомых і няўдачнікаў?

— Працай, — адказаў мастак, — шчырасцю.

— Давай сур'ёзна. Адзіны сродак, П'ер Душ, каб растармасіць прыдуркаў, трэба зрабіць нешта надзвычайнае. Паведамі ўсім, што едзеш маляваць на Паўночны полюс. Хадзі апрануты пад егіпецкага цара. Накідай у сваю гаворку разумных слоў: экстэр'ерызацыя, дынамізм, падсвядомае, нон-фігуратыўнае, — змяшай іх і складай маніфесты. Адмоўся ад дзеяння там, дзе ўсталяваны спакой; ад белага, дзе ўсё чорнае; ад круга, дзе маецца квадрат. Вынайдзі неагеаметрычны жывапіс, які не ведае нічога, акрамя чырвонага і зялёнага, цыліндрычны жывапіс, актаганічны жывапіс, жывапіс у чатырох вымярэннях...

У гэты момант дзіўная і салодкая парфума нагадала аб прыходзе мадам Каснеўскай. Гэта была прыгожая полька, фіялетавымі вачыма якой захапляўся П'ер Душ. Яна выпісвала дарагія часопісы, у якіх маштабна рэпрадуцыраваліся шэдэўры трохгадовых дзяцей, а імя шчырага Душа яна там не сустракала і пагарджала ягоным жывапісам. Усеўшыся на канапе, жанчына зірнула на распачатае палатно, адкінула свае светлыя пасмы і ўсміхнулася трошкі зласліва:

— Я ўчора хадзіла, — прамовіла яна са сваім цякучым і спеўным акцэнтам, — глядзець выставу негрыцянскага мастацтва славутай эпохі. Ах! якая пачуццёвасць, пластыка, моц!

Жывапісец прынёс, каб паказаць ёй партрэт, якім ён быў задаволены.

— Звычайны, — сказала яна і расчараваная, рухавая, спеўная, у воблаку парфумы, знікла.

П'ер Душ закінуў палітру ў кут і паваліўся на канапу: "Я павінен быў стаць інспектарам ашчаднай касы, банкаўскім службоўцам, паліцэйскім. Жывапіс — апошняя з прафесій. Поспех у разявак дастаецца толькі рамеснікам. Замест таго, каб шанаваць мэтраў, крытыкі натхняюць варвараў. З мяне досыць. Кідаю гэтую справу".

Поль-Эміль, выслухаўшы яго, запаліў цыгарэту і пачаў нетаропка разважаць:

— Ці пачуваеш ты сілу, — уздыхнуў ён урэшце, — каб паведаміць з надзвычайнай сур'ёзнасцю Каснеўскай і некалькім іншым асобам, што год праз дзесяць збіраешся абнавіць манеру?

— Я?

— Паслухай... Я паведамлю нашай "эліце" ў парачцы добра зладкаваных артыкулаў, што ты засноўваеш ідэйна-аналітычную школу. Да цябе партрэтысты ў сваёй дзейнасці вывучалі чалавечы твар. Прыкрасць! Не, тое, што сапраўды прадстаўляе чалавека, гэта — ідэі, якія ён абуджае ў нас. Дык вось, партрэт палкоўніка — гэта сіне-залаты фон, перасечаны пяццю агромністымі пазументамі, конь у адным куце, крыж у другім. Партрэт фабрыканта — гэта фабрычны комін, сціснуты кулак на стале. Разумееш, П'ер Душ, што ты падорыш свету, дык ці можаш ты намаляваць мне за месяц дваццаць ідэя-аналітычных партрэтаў?

Жывапісец сумна ўсміхнуўся.

— Так раптоўна, — здзівіўся ён, — і што сумна, Глез, дык тое, што будзь я іншым чалавекам, гэта магло б атрымацца.

— Паспрабуем.

— Мяне не стае на красамоўства.

— Ну дык, мой даражэнькі, на любую просьбу патлумачыць, ты расцягнеш час, падпусціш дыму пад нос цікаўнаму і скажаш простыя словы:

"А вы ніколі не глядзелі на раку?"

— І што гэта значыць?

— Нічога, — паціснуў плячыма Глез. — Так яны будуць лічыць цябе вельмі моцным, а калі яны цябе адкрыюць, пачнуць аналізаваць, захапляцца, мы раскажам пра хітрык і пацешымся з іхняй разгубленасці.

* * *

Праз два месяцы вернісаж выставы Душа прайшоў трыумфальна. Спеўная, рухавая, ахутаная водарам прыгажуня мадам Каснеўская не адставала ні на крок ад свайго новага куміра.

— Ах! — паўтарала яна. — Якая пачуццёвасць! Пластыка! Моц! І як жа вы, даражэнькі, прыйшлі да гэтых непараўнальных сінтэзаў?

Жывапісец расцягнуў час, напусціў дыму і прамовіў: "Вы ніколі, мадам, не глядзелі на раку?"

Вусны прыгожай полькі затрымцелі, абяцаючы асалоду.

У паліто з трусіным каўняром малады і бліскучы Струнскі прамаўляў у атачэнні іншых: "Вельмі моцна! — казаў ён. — Вельмі моцна! Але скажыце, Душ, адкуль яно прыйшло да вас, натхненне? З маіх артыкулаў?"

П'ер Душ вытрымаў паўзу, пусціў яму пад нос трыумфальнае воблака дыму і выдыхнуў: "Вы ніколі, мой даражэнькі, не глядзелі на раку?"

— Цудоўна! — падхапіў той. — Цудоўна!

У гэты момант знакаміты гандляр карцінамі, прайшоўшыся па майстэрні, узяў мастака за рукаў і пацягнуў у кут.

— Душ, сябра, — зашаптаў ён, — вы — малайчына. На гэтым можна зарабіць. Дайце мне правы на вашую вытворчасць. Не мяняйце манеру, пакуль я вам не скажу, і я вам прадам пяцьдзесят карцін за год... Падыходзіць?

Душ, загадкава маўчаў, курыў, не даючы адказу.

Паціху майстэрня апусцела. Поль-Эміль Глез пайшоў зачыняць дзверы за апошнім наведвальнікам. На лесвіцы чулася ўсхваляваная гаворка, якая аддалялася. Потым, застаўшыся сам-насам з мастаком, раманіст радасна сунуў рукі ў кішэні.

— Ну што, мой даражэнькі! — сказаў ён. — Як мы іх? Ты чуў таго малога, з трусіным каўняром? А прыгожую польку? А трох маладых ладных дзяўчын, што паўтаралі: "Як нова! Як нова!" Ах, П'ер Душ, мне здавалася, што чалавечае глупства бязмежнае, але гэта пераўзышло мае спадзяванні.

Яго ахапіў прыпадак нястрыманага рогату.

Мастак насупіў бровы і пакуль той душыўся ў канвульсіях рогату, рэзка выкрыкнуў:

— Ты дурань!

— Дурань? — раззлавана выгукнуў раманіст. — Я ж здолеў падладзіць такую выдатную хохму, што нават Бісю...

Мастак з гонарам прабег вачыма па дваццаці аналітычных партрэтах і сказаў з націскам, які выдаваў перакананасць:

— Так, Глез, ты — дурань. Ёсць нешта ў гэтым жывапісе...

Раманіст разгублена ўталопіўся ў сябра.

— Вось гэта ты даў! — гаркнуў ён. — Душ, прачніся. Хто табе прапанаваў гэтую новую манеру?

А П'ер Душ вытрымаў паўзу і выпусціў з люлькі цэлае воблака:

— Ты ніколі, — прамовіў ён, — не глядзеў на раку?

Пераклаў з французскай Валеры БУЙВАЛ

АНКЕТА

1. Ці з'явіліся, на вашу думку, на парозе трэцяга тысячагоддзя ў сучаснай беларускай літаратуры мастацкія творы (кніжкі, публікацыі, літаратурныя праекты), што сталіся не толькі новымі, але і *знакавымі*. Калі — так, то што гэтаму паспрыяла, калі — не, то што перашкодзіла?

2. Мужчынская і жаночая літаратура... Ці ёсць насамрэч падобнае творчае падзяленне? Што б вы маглі сказаць адносна жаночага і мужчынскага творчага мыслення і вычування, а таксама схільнасці да той ці іншай літаратуры мужчын і жанчын, як патэнцыяльных чытачоў?

3. Маральнасць у творчасці сучасных літаратараў, як яна вамі разумеецца? Наколькі сёння гэтае пытанне з'яўляецца актуальным і як яно ўплывае на чалавечую духоўнасць і нацыянальную культуру?

4. Што вам падабаецца ў штотыднёвіку "ЛіМ", што не? Якія рубрыкі і чые аўтарскія публікацыі вас цікавяць найбольш? Што вы самі прапанавалі б дзеля паляпшэння формы і зместу газеты?

Ці падпісваецеся вы на "ЛіМ" (набываеце ў шапіках) альбо — не (прычына)?

5. Якія крокі насустрач з абодвух бакоў могуць, на ваш погляд, паспрыяць збліжэнню пазіцый раз'яднаных літаратурных груповак дзеля захавання аслаблай нацыянальнай культурнай і духоўнай прасторы (мовы, літаратуры, мастацтва, традыцый) — беларускай дзяржаўнасці агулам?

Іван ШАМЯКІН: нарадзіўся 30 студзеня 1921 года ў в. Карма Добрушскага раёна. Народны пісьменнік Беларусі з 1972 г. Выдаў шмат шырокавядомых на Айчыне і за яе межамі кніг і раманаў, многія з якіх экранізаваныя. Лаўрэат дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Герой Сацыялістычнай Працы (1981 г.). Жыве ў Мінску.

Іван ШАМЯКІН:

1. Анкета сур'ёзная. Адказаць на яе пытанні нялёгка. Адно першае пытанне патрабуе цэлага даследавання – для нашых літаратуразнаўцаў і крытыкаў.

У маім узросце, жывучы з адным вокам (і тое падслепаватае), я не чытаю і дзесятай часткі таго, што прачытваў дваццаць-трыццаць гадоў таму. Але ўсё ж чытаю. У першую чаргу паэзію ў перыёдыцы – яе лягчэй чытаць, лірыка дае станоўчыя эмоцыі. Дабіраюся зрэдку і да аб'ёмістай прозы. Са страхам. Але і з радасцю: літаратурны працэс не спыніўся! Расце добрая моладзь. Думаю, кіраўнікі дзяржавы разумеюць, што літаратура, кіно, тэатр, песня – самыя дзейсныя праваднікі дзяржаўнай ідэалогіі. За 200 гадоў і ў Расіі, і ў Францыі напісалі сотні гістарычных даследаванняў, успамінаў пра вайну з Напалеонам еўрапейскіх дзяржаў. Але без эпапеі "Вайна і мір" Льва Талстога шматлікія пакаленні ведалі б хіба сам факт, а не гісторыю вайны і яе герояў – Растовых, Балконскіх, Безухава, Каратаева.

Мая думка пра літаратуру нашага складанага часу... Мне здаецца, што свядома ці несвядома ідзе звужэнне грамадзянскай тэматыкі ў яе шырокім значэнні. У паэзіі гучаць тэмы чарнобыльскага болю і болю за лёс роднай мовы. Празаікі пачалі аддаваць перавагу гісторыі. Я разумею іх: у савецкі час тэма была амаль закрытая. А хочацца ведаць: хто мы? адкуль? які шлях прайшлі? Лагічна. Але калі гісторыя, то няхай будзе ўся: далёкая-далёкая, бліжэйшая і блізкая. Усе перыяды яе ў беларусаў багатыя і гераічныя. Аднак яўна адбываецца перакос: гісторыя самая-найсамая далёкая – X — XIII стст. Разумею аўтараў (сам грашыў): чым далей у глыбіню вякоў, адкуль не дайшлі летапісы, тым лягчэй фантазіраваць. Безумоўна, у пісьменніка ёсць права сачыняць любыя падзеі, любых герояў у любым часе. Але гэта ўжо, прабачце, не "Вайна і мір", і ў мяне, чытача, навязліва ўзнікаюць сумненні ў праўдзівасці сюжэтных ходаў такога твора, яго герояў. Грэшны, каюся. Але што казаць пра Вітаўта, калі з героямі Чэхава на сцэнах тэатраў, у тым ліку, нашых, робяць Бог ведае што. А больш выразнай мовай – апашляюць, апаганьваюць. Баюся, што такі лёс чакае "Паўлінку". Малю Вас, пане Раеўскі, не рабіць эксперыментаў з Купалам, Коласам, Крапівой, Макаёнкам! Эксперыментуйце з Курэйчыкам!

З'яўляюцца зрэдку раманы пра блізкую гісторыю – пра Вялікую Айчынную вайну, сведкі якой яшчэ жывуць, і сярод пісьменнікаў ёсць яны. І будуць сустракаць 60-годдзе вызвалення Беларусі, 60-годдзе Вялікай Перамогі. Але і тут адзін з "гісторыкаў" зрабіў пераацэнку ролі ката Кубэ, СД, паліцэйскіх. Дапісаліся! Далей ехаць няма куды. Хутка, як у Эстоніі і Латвіі, запатрабуюць паставіць помнікі эсэсаўцам.

Вельмі абмежаваная тэма сучаснасці. Адбываецца рэвалюцыя ці контррэвалюцыя (няма назвы працэсам, сведкамі якіх з'яўляемся). Бачым адно: вярнуўся капіталізм (І які! З кракадзілавымі зубамі!), грамадства хутка размяжоўваецца на бязмежна багатых і вельмі бедных, чаго не дапускалі буржуазная Швецыя ці Германія. Ёсць раманы, аповесці пра гэтыя гістарычныя зрухі, пра сытых "герояў" і галодных герояў? На жаль...

Ацэнкі не стаўлю ніводнаму прачытанаму твору – няхай паставіць гісторыя. Ёсць знакавыя! Але ёсць і бяззнакавыя! А якія знакі? Адзнакі? Па 10-бальнай сістэме? На днях міністр Расіі Швыдкой вёў па ТВ "культурную рэвалюцыю". Гаварылі пра літаратуру. Сучасных "класікаў", прысутных там, я ніводнага не ведаю. З савецкіх прызналі "знакавым" толькі Гросмана, Шолахава ўпамянулі, што ён спісаў "Ціхі Дон". Горкага (нават Горкага!), Лявонава, Фадзеева, Федзіна, Бондарава, Распуціна, Белова... – іх як і не было. Вось такая яна — гісторыя. Не будзем падрабляцца пад эстрадніка Швыдкога! Будзем сумленнымі ва ўсім, у палітыцы ў першую чаргу, а літаратура – таксама і палітыка.

2. Ёсць адметнасць жаночага прыгожага пісьменства. Адчуваю яе. Асабліва ў паэзіі. Люблю жаночую паэзію. У ёй больш чуласці, шчырасці, спагадлівасці, ласкавасці – усяго, што маюць нашы маці. І ў прозе гэта адчуваецца. У першую чаргу прачытваю жанчын. Прыгадваю, з якой цікавасцю, добрай зайздрасцю чытаў усё, што выходзіла з-пад пяра маёй равесніцы Алены Васілевіч. Радуюся таму, што шмат добрых дзяўчат ідзе ў літаратуру. Шырокай дарогі вам, унучкі мае! Апынуўся на сёмым небе, калі мая любімая ўнучка Маша адважылася прачытаць мне свае паэтычныя спробы. Жаночая творчасць патрабуе сур'ёзнага даследчыка!

3. Цалкам адмаўляю амаральнасць, цынізм, парнаграфію – усё, што падкінула нам хвалёная амерыканская культура, галівудскія фільмы. Лічу гэта ідэалагічнай дыверсіяй, страшнейшай за ўзрыў атамных станцый.

4. "ЛіМ" чытаю акуратна. Артыкулы пра літаратуру, нізкі вершаў, апавяданні, дзённікі падабаюцца. Артыкулы пра музыку здаюцца сумнымі. Але можа гэта таму, што мне, сыну лесніка, "мядзведзь наступіў на вуха".

"Испробовал все жанры..." Многія пасады. У газеце не працаваў. Таму ад парад, як палепшыць яе, устрымаюся.

5. Адзіны непадзельны Саюз пісьменнікаў, яго разумнае кіраўніцтва памагло б нам спыніць гэтыя "базарныя разборкі", якія раздзіраюць нас сёння. Што мы дзелім? Славу? Хопіць яе на ўсіх! Давайце шчыра і аддана служыць сваёй Дзяржаве, сваёй нацыянальнай культуры! Больш кантактаў з урадавымі органамі. Гэта тыя ж беларусы і, як правіла, разумныя, адукаваныя людзі – побач сядзелі за партамі ў школах, універсітэтах, інстытутах. Яны зразумеюць сваіх творцаў.

Матэрыяльныя нястачы – бяда агульная, ва ўсіх сферах эканомікі і культуры. Разбагацеем – і ўсё пойдзе на лад!

Анатоль ТРАФІМЧЫК нарадзіўся 14 лютага 1976 г. Скончыў: у 1998 г. філфак Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта (БрДУ); у 2001 г. аспірантуру пры Інстытуце літаратуры НАНБ. Зараз — вольны мастак. Выступае ў друку з крытыкай і паэзіяй.

Анатоль ТРАФІМЧЫК:

1. Вядома, не без гэтага. Усялякае развіццё мае здабыткі. А тое, што беларуская літаратура развіваецца, прычым не абы-як, відавочна.

Маладая генерацыя літаратараў тым і выдзяляецца, што творыць не дзякуючы, а насуперак. Хацелася б толькі, каб і надалей гэтае "насуперак" заставалася дыялектычным чыннікам і дазваляла плённа развівацца добрым пачаткам.

Што яшчэ хацелася б адзначыць? За апошнія некалькі гадоў рэалізавалася шмат праектаў-анталогій. Выдзяляць ці параўноўваць не буду. Маю на ўвазе перадусім тое, што іх шматлікасць азначае багацце літаратуры — не толькі колькаснае, але і якаснае.

З творчасці пэўных суполак не перастае звяртаць увагу "Другі фронт мастацтваў".

З твораў тут нялішне згадаць "постмадэрніста" Ігара Бабкова з яго ценямі. А таксама творчасць Андрэя Хадановіча.

Негатыву таксама шмат. Аднак жа пытанне было не пра гэты бок нашага літаратурнага дыскурсу.

2. Мужчынская і жаночая літаратура... Да мінулага года я не сумняваўся ў існаванні такога падзелу. Як здавалася, добра разбіраўся ў гэтай праблеме і адказаў бы з лёгкасцю на пастаўленае пытанне. Нават у "Маладосць" аддаў адмоўную рэцэнзію на творчасць паэткі Таццяны Барысюк (2003, № 3). Аднак яшчэ да выхаду рэцэнзіі лёс пачаў з мяне пасміхацца. У леташнім № 1 той жа "Маладосці" адна "маладая сям'я з аднаго чалавека" (Вольга Гапеева) надрукавала свой, прабачце, раман — і пасеяла ўва мне парасткі скепсісу адносна гэтай "вечнай" праблемы. А летам адкрыў для сябе шчэ й расійскую паэтку Ларысу Мілер. Гэтыя дзве аўтаркі сталі для мяне знакавымі ў маёй літаратуры 2003 г.

Сёння я не перастаю думаць па-ранейшаму, але мае пачуцці ўжо не супадаюць з думкамі.

Вельмі складанае пытанне. Бадай, я не змагу адказаць на яго дакладна. Але спроба не хвароба.

3. Літаратура, на мой погляд, неабавязкова павінна несці класічную маральнасць. Да гэтага паняцця ў кожнага свой, суб'ектыўны падыход. Не толькі С. Ясенін, але і многія іншыя, прытрымліваліся думкі, што няма брыдкіх слоў, а ёсць іх брыдкае разуменне. Сапраўдная, высокамастацкая літаратура можа быць (і, як вы ведаеце, ёсць такая) амаральнай. Аднак тое, што літаратура павінна быць гуманнай, з чалавекам як мерай усіх рэчаў, ні ў кога не павінна выклікаць сумненняў. А літаратура амаралізму не супярэчыць гуманізму, але дае адчуць подых тае жудасці, якая існуе ў чалавечай цывілізацыі.

Пытанне гэтае было і будзе актуальным. Вельмі важна, каб такая літаратура прыходзіла да чалавека і нацыі своечасова (на жаль, нават тэарэтычна мне гэта не ўяўляецца магчымым). У іншым выпадку творы такіх, як Генры Мілер, Жан Жанэ, Віктар Ерафееў, могуць мець адваротны гуманнаму эфект (найбольш яскрава ўздзеянне такога мастацтва можна прасачыць па музыцы). Чалавек і нацыя павінны выспець.

4. Не магу сказаць канкрэтна, што падабаецца ў вашай газеце, а што не. Зазначу, што з аўтараў яе не прамінаю рубрыкі "ЛеГалізацыя". Ва ўсялякім разе гэтыя публікацыі выдзяляюцца на фоне іншых, чытэльнасць якіх пакідае жадаць лепшага. А вось чаму — не ведаю. Па гэтай праблеме я далёкі ад кампетэнтнасці. Калі казаць размаіта, хацелася б нейкай жвавасці.

На "ЛіМ" зараз падпісаўся, каб падтрымаць газету (яна патрэбна, адназначна) і новага рэдактара. Дагэтуль купляў у шапіках, але нерэгулярна.

5. Шчыра кажучы, не ведаю. Відаць, павінна быць полілагічнасць паміж чытачамі, "тусоўкамі", газетай. Ліберальнасць. Дэмакратычнасць. Шырыня кругагляду. "Захаванне аслаблай нацыянальнай культурнай і духоўнай прасторы" не можа адбыцца пры закамплексаванасці на сваім матэрыяле, без погляду на знешні свет. Неабавязкова ехаць у Афрыку. Аднак з суседзямі ў нас ёсць пра што пагутарыць. Ёсць што ім паказаць, дый тым больш пра іх расказаць.

Алесь НАВАРЫЧ: «КОЖНАМУ ДНЮ ДОСЫЦЬ СВАЙГО КЛОПАТУ»

Сёння Алесь НАВАРЫЧ — адзін з самых прыкметных празаікаў пакалення 40-гадовых. Ён аўтар зборнікаў апавяданняў "Рабкова ноч" і "Ноч пацалункаў незалежнасці". Летась у часопісе "Маладосць" (№№ 4—6) быў надрукаваны ягоны гістарычны раман "Літоўскі воўк". За гэты твор Алесь Наварыч названы Лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне мастацкай літаратуры.

Гаворка карэспандэнта "ЛіМа" з пісьменнікам пачалася з традыцыйнага пытання пра ягоны шлях у літаратуру.

Фота А. ЗАБАЎСКАЙ

НАЙСМАЧНЕЙШЫ ХЛЕБ

— Студэнтам другога курса медінстытута трапіў на выставу Міхася Савіцкага і напісаў некалькі старонак сваіх уражанняў. Прыйшоў у "ЛіМ". Маладая супрацоўніца пахваліла. Сказала, трэба мову ўдасканальваць. Параіла чытаць Караткевіча. А я ў сёмым класе двойчы прачытаў "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" і быў у захапленні! Тым больш, што тады акрамя "Техники молодежи", "Юного натуралиста", "Науки и жизни" нічога болей не чытаў. А вось "Каласы пад сярпом тваім" прачытаў пасля яе падказкі. І дзіва-дзіўнае, пасля "Хрыста" яны падаліся мне вымучанымі, прыдуманымі, занадта рамантычна-гераічнымі, што проста не верылася аўтару. Мо, каб прачытаў у сёмым класе... А дваццацігадовага студэнта, які толькі што праглынуў "Уваскрошанне" і "Анну Карэніну" Талстога, "Каласы" не здзівілі, не ўразілі. Мо гэта здарылася ад вялікага чакання нечага незвычайнага? Так бывала са мною не раз. Але гэтае расчараванне ў "Каласах" было тым першым штуршком да задумы напісаць пра гэтыя ж падзеі нешта сваё, не так як у Караткевіча, без гераічнай узнёсласці. Ад цьмянай, невыразнай задумы да здзяйснення прайшло 24 гады...

А тады я пакінуў медінстытут і паступіў на філфак БДУ. Сур'ёзна захапіўся моваю. Бо тое, як я пісаў і гаварыў дома, вельмі замінала — у нас кажуць "вовк", "лавка", дзекання і цекання ў нас няма. Гэта ж Століншчына! Вёска Відзібор... Ды ніякі не "Відзібор", а ВЫДЫБОР! "Пыва пыв, чы не пыв?" Чыста па-беларуску ў нас на вёсцы гаварылі толькі дзве жанчыны — настаўніца белмовы і настаўніца біялогіі. Начальнікі гаварылі на сапсаванай расійскай і лічыліся вельмі культурнымі...

За тую першую нататку ў "ЛіМе" атрымаў 4.50, купіў бутэльку алжырскага сухача і, адстояўшы даўжэзную чаргу, паўбатона варанай кілбасы. 80-ы год! Пачаставаў сяброў па інтэрнацкім пакоі. Адзначыў такім чынам першы літаратурны заробак. Якраз тады вычытаў у Талстога "формулу людскога шчасця" — шчаслівы той чалавек, што корміцца любімай справай. Таму пісьменніцкі хлеб мне падаўся смачнейшым. Найсмачнейшым! Гэта ж дзіва, ты фантазіруеш, пішаш, атрымліваеш насалоду, а табе за гэта яшчэ і грошы плацяць!

— А нешта ад сябе дадаць да талстоўскай фармулёўкі хацеў бы?

— Людзі ўсё жыццё шукаюць гэтую формулу шчасця і не знаходзяць... Ну, для мяне, мусіць, шчасце — сядзець з вудаю на беразе ракі і каб ніхто не чапаў! (Смяецца.) Шчасце гэта ж не працэс, а імгненны стан душы, медытацыя...

ЯГОНЫЯ УНІВЕРСІТЭТЫ

— Аканом Ежы Урбановіч, адзін з галоўных герояў "Літоўскага ваўка", мае сваю філасофію: "Любыя рэзкія рухі прыводзяць да беспарадку... Рэвалюцыя, бунт ёсць зменлівая форма хаосу... Час гаварыць пра радзіму, пра вольнасці неспрыяльны..." А як пісьменнік Алесь Наварыч ставіцца да раптоўных перамен у жыцці?

— Жнівень 91-га не быў для мяне нечаканасцю. Для мяне ўсё адбылося значна раней. Бацька быў перакананым антыкамуністам (ён працаваў у сельсавеце начальнікам ваенна-ўліковага стала). І ў сям'і свае погляды не хаваў — на людзях гаварыць, што думаеш, было небяспечна. Гэты ягоны антыкамунізм фармаваўся падчас вайны. У нашу вёску часта наведваліся хлопцы з украінскіх нацыяналістычных груп. Бандэраўцы, як тады казалі. Яны шасталі па нашых лясах, забівалі немцаў і камуністаў, гаварылі праўду пра бальшавізм. Некаторыя з нашых вяскоўцаў далучаліся да іх. Тыя бандэраўцы і пасля вайны, амаль да 50-га года прыходзілі...

Паводле акупацыйнага падзелу ўсё Палессе ніжэй Прыпяці адносілася да гэбітскамісарыята Украіны. У нас на чыгуначнай станцыі ў час вайны працавала ўкраінская школа, у якую хадзіў бацька. Там вялася магутная прапаганда супраць савецкай улады. Непадалёку быў славуты Камень-Кашырскі — цэнтр паўстанцкага ўкраінскага руху, там выходзіла газета, дзе бацька друкаваў пад псеўданімам свабодалюбівыя вершы. Яму на той час ішоў 15-ты год, клікалі яго з сабою паўстанцы, ды не пайшоў — дзед быў пры смерці. Ну, а бандэраўцаў амаль усіх пабілі энкавэдэшнікі, мала хто ногі панёс...

Адным словам, бацька мне заўсёды казаў, што Саветы рана ці позна гегнуцца. Ён тры месяцы не дажыў да жніўня 91-га, калі яны такі гегнуліся.

— І як табе з такім выхаваннем жылося?

— Сам ведаеш, у школе камвыхаванне было дай бог! Акцябраты, піянеры... У камсамол не ўступаў, пакуль не сказалі — не ўступіш у камсамол, не паступіш у ВНУ. Праўда, быў вельмі вушлы настаўнік гісторыі Міхась Лявонцьевіч Наскевіч, ён сам быў добрым дысідэнтам (кульгавы, дык яго не чапалі). Праўда, змушалі ўступіць у партыю, дык ён райкамаўцам так мазгі запляце, што на яго махнулі рукой... Ну, а ў школе з ім можна было весці гавэнды на любую тэму.

Калі надышла Перабудова і на нас абрынулася столькі выкрываўчай літаратуры, то бальшыню з гэтага я ўжо ведаў — і пра Леніна, і пра Катынь... Быў толькі страх, што Перабудова скончыцца, і зноў пачнецца калатнеча, арышты, лагеры альбо грамадзянская вайна. Яшчэ адной рэвалюцыі наша зямля не вытрывала б.

У той час я працаваў у "Вожыку", быў актыўным сябрам "Тутэйшых", удзельнічаў ва ўсіх тусоўках, мітынгах, лісты пісалі Гарбачову ў падтрымку... Меў неаднаразовыя гутаркі з "людзьмі ў цывільным", яны пераконвалі, што Гарбачоў агент імперыялізму і хоча развяліць СССР. А я разумеў, што камуністычная ідэалогія на той час састарэла, яна ўжо была непрадуктыўнай...

— Яна, мусіць, нарадзілася мёртвай...

— Няпраўда! Тут я не пагаджуся. Перакананы, што на пачатку 20-га стагоддзя Марксава ідэя была прагрэсіўнай. Але пры бальшавіках гэтая ідэя, як пісаў Эрых Фром, дэградзіравала да пачварнай ідэалогіі. Па-другое, Марксава ідэя была чужароднай для насельнікаў усходнееўрапейскіх ды еўразійскіх прастораў. У заходняй Еўропе, з яе дэмакратычнымі традыцыямі, гэтая сацыяльная ідэя ў форме эвалюцыі прыжылася. Узяць хоць бы Швецыю?! Там сапраўдны рынкавы сацыялізм...

АДНОЙЧЫ, СЫШОЎШЫ З ЦЯГНІКА

— Незадаволенасць Караткевічавымі "Каласамі" была штуршком да задумы "Літоўскага ваўка". Дваццаць тры гады душа працавала на гэтую задуму. "Воўк" — гэта і не адказ, і не супрацьстаўленне Караткевічу. Ці сваё бачанне падзей і людзей таго часу?..

— Хутчэй за ўсё гэта спроба пры дапамозе ўяўлення і фантазіі пранікнуць у атмасферу тых падзей. Толькі спроба. Адсюль іронія ў адносінах да герояў твора, іхніх учынкаў, іхніх думак і памкненняў. "Літоўскі воўк" — раман не пра Паўстанне, а пра адносіны герояў рамана да Паўстання. У ім няма баталічных сцэнаў, акрамя аднаго бою, і той пададзены ў пераказе ўдзельніка. Ды гісторыкамі і па сённяшні дзень не дадзена адназначнай ацэнкі тых падзеяў! Праўда, для рамана тая адназначнасць і не патрэбна. Хацелася напісаць для падлеткаў раман з рамантычным каханнем беларуса Артура Буевіча да беларускі Аксаны Урбіновічавай. Каб бралі прыклад з іх, а не з герояў фільма "Тытанік". Нешта накшталт "Ваніна Ванінні" Стэндаля, з каханнем гераіні да гарыбальдзійца... Стварыць такую эратычную пару цалкам не атрымалася. Мараль не дала замужнюю Аксану зрабіць каханкай інсургента. Інтрыжка завяршылася нічым. Шкада. Ды і Артур — тая ж літаратурная схема, што і Андрэй Загорскі ў Караткевіча. Узняцца над схемай — звышзадача пісьменніка. А звышзадачы вымагаюць звышталенту...

Ды ці варта пытаць у пісьменніка, што ён хацеў сказаць у сваім творы! Якія ідэі ім рухалі. Што напісана, тое напісана. Больш нічога не дадаць, не адняць. Застаецца толькі аддацца ва ўладу чытачу.

— Мне заўсёды падабаўся літаратурны прыём паралельных сюжэтаў. Такім, паралельным чалавечым лёсам, у цябе выпісаны лёс прыручанага ваўка Інсургента. Ён праходзіць праз увесь твор і нясе на сабе шмат падтэкставага зместу, нават галоўную ідэю рамана...

— Ды тую ідэю можна, так бы мовіць, выказаць вядомай прыказкай — колькі ваўка не кармі, а ён усё роўна ў лес глядзіць! Адным летнім ранкам 92-га года, сышоўшы з пасажырскага цягніка "Санкт-Пецярбург — Львоў", пакіраваў я ў бок свайго Відзібора і раптам... на сельсавецкім франтоне ўбачыў нацыянальны сцяг! Божа ж мой, гэта той сельсавет, дзе ў бакоўцы яшчэ, мусіць, пыляцца партрэты Сталіна... Гэта мяне так ашаламіла! У гістарычнай рэтраспекцыі гэты сцяг у 1863-м мог лунаць (і таму ёсць сведчанні!) недалёка ад Відзібора, ля вёскі Калоднае, над полем бітвы інсургента Рамуальда Траўгута з царскімі жаўнерамі. У той момант гістарычныя падзеі закальцаваліся для мяне, зрабіліся такімі блізкімі ў часе, такімі рэальнымі і відушчымі, што хоць рукамі памацай! Тут і знайшоўся сюжэтны ход будучага рамана. Ды ўсё ж пісьменніку наканавана перажыць разам з героямі эмоцыі сённяшняга дня — як бы не намагаўся ён заглыбіцца ў падзеі і эмоцыі тых часоў, усё роўна яны будуць асветлены ягонымі надзённымі перажываннямі. Вось чаму эмоцыі той раніцы перакінулі мяне ў эпоху Траўгута, далі разуменне той прагі вольнасці ды незалежнасці...

— Дык хто ён, літоўскі воўк?

— Напісаўшы вялікую рэч, якою жыў некалькі апошніх гадоў, намагаюся як хутчэй пазбавіцца тых думак і эмоцый, што жывілі мяне падчас напісання рамана, забыцца на герояў, іх праблемы, каб ачысціць душу і мазгі для новага твора, для новых перажыванняў і думак. Атрэсці пыл тых дарог, па якіх мяне вадзілі героі рамана. Таму мне зараз цяжка гаварыць пра "Ваўка", я паспяхова забываю чым хварэў, што мне навязліва карцела, вярэдзіла душу. Не хочацца вяртацца ў той стан часовага ачмурэння... А ты пытаеш, хто ён, літоўскі воўк! Гэта і ты, і я, і... Гэта вобраз беларуса, якога нельга прыручыць. Колькі будзе гэтая зямля, столькі будуць нараджацца ў хатах беларусы (а ў лесе ваўкі), і ў якія мундзіры іх не апранай, мы былі, ёсць і будзем тымі, кім нас нарадзіла Беларусь. Хімічны склад глебы такі! Смак хлеба, яблыка, бульбы такі! Калі жыць ля мірскага замка, ля гродзенскай Каложы, ля наваградскай камяніцы, ля полацкай Сафіі і кожны дзень дзівіцца на іх, хіба не нарадзіцца ў душы пачуццё годнасці і гонару за родную зямлю?!

У ПОШУКАХ БОГА І СЯБЕ

— Незнаёмым людзям, гледзячы на тваё заўсёды пахмурнае аблічча, можа падацца, што ты — чалавек, які нечым незадаволены, з'едлівы, дакучлівы... Нэндза, адным словам, і сугней!

— Ну во, здароў быў! Ды я на белы свет гляджу з замілаваннем! Як бязгрэшнае дзіцё! Праўда, медычна-матэрыялістычнае мінулае, захапленне псіхалогіяй змушае штохвіліны аналізаваць асяродак ды ўчынкі людскія. А гэты гарадскі асяродак такім чынам пластыфікуе, лепіць чалавечы характар, што на паверхні выяўляюцца не самыя лепшыя ягоныя рысы. Урбанізацыя не даспадобы беларусу, ён Богам і нашаю прыродаю задуманы хутчэй лірыкам ды філосафам.

Грамадства павінна ствараць такія сацыяльныя інстытуты, якія б накіроўвалі чалавечую адвечную агрэсію ў гуманістычнае рэчышча. Закон, мараль, вера ў Бога — гэта тыя цуглі, што дапамагаюць людзям трымацца ў абсягах чалавечнасці. Але чалавеку трэба абавязкова пакінуць права выбару! Гэта ягоная ўласная справа — быць чалавекам альбо жывёлай...

— Маеш патрэбу ў нейкіх цуглях?

— Ды я, хутчэй, падобны да таго асла, якому трэба для прынады вешаць на палцы паперадзе моркаўку ці жмук сена (смяецца)! Стымул? Дык гэта ж кій, якім торкаюць аслу пад хвост, каб бег жвавей! Я гэтага не люблю. Адразу пачынаю брыкацца ды агрызацца. Моркаўка мне больш даспадобы...

— Гэтая моркаўка розная бывае. Улада, слава, жаночая мілосць — ты якую выбіраеш?

— Пытанне на засыпку (уздыхае, доўга маўчыць). Да нядаўняга часу ўсё гэта мяне яшчэ цікавіла... І слава, і дабрабыт, і жаночыя звабы...

— А божачкі, што здарылася?! Не палохай ты мяне!

— Ды не (смяецца), усё нармальна. Проста, з 18-ці гадоў захапляўся экзатычнымі рэлігіямі, быў нешта блізка да крышнаітаў. Змарнаваў на гэта дзесяцігоддзі, хацеў пры жыцці дасягнуць прасвятлення, хацеў нейкіх дарункаў, праяў дабрадаці Божай. І нічога з гэтага не атрымалася. Пакуль блукаў у поцемках, зразумеў толькі, што ўсведамленне сваёй грахоўнасці ды імкненне да праведнасці гэта ўжо і ёсць элемент праведнасці. Што рэлігія ёсць прыкладная (ужытковая), штодзённая філасофія. А што гэта, калі не наша, вякамі спавяданае маімі продкамі, хрысціянства?! Вяртанне да хрысціянства зрушыла маю душу да прагрэсу — неба зрабілася сінейшым, вышэйшым і чысцейшым. І людзі з паклёпнікаў ды зайздроснікаў, падхалімаў ды здраднікаў зрабіліся Божымі стварэннямі, якіх трэба любіць, хоць яны і грэшныя — кляпаюць адзін на аднаго, зайздросцяць, здраджваюць — але ж імкнуцца, каб душа іхняя зрабілася храмам Божым... І мне лёгка ўздыхнулася, і жыць стала цікавей. Зразумеў, пісаць трэба так, каб творчасць твая адкрыта служыла дабру, святлу...

— ...уладзе. Як ты ставішся да праблемы "мастак і ўлада"?

— Апостал Пётра сказаў, цытую: "Упакорлівайцеся ўсялякай людской уладзе дзеля Госпада — хай тое цару, як найвышэйшай уладзе, хай тое і намеснікам, як ад яго пасланым, на пакаранне злачынцам і на заахвочванне дабрачынцаў. Бо такая ёсць воля Божая, каб мы, робячы дабро, замыкалі вусны невуцтву неразумных людзей. Як вольныя, а не як тыя, што карыстаюцца воляй, каб прыхаваць зло..." Канец цытаты!

— І гэта цябе сёння мірыць з рэчаіснасцю?

— Каб мяне гэта мірыла, дык я ўжо сёння пачуваў бы сябе святым! Ідзе змаганне: розум мусіць мірыцца, а плоць бунтуе. Ды Богам нам дадзена, што заслужылі. Калі ў люстэрку нам не падабаецца ўласны нос, дык што — адшчыкнуць яго?! І адварочвацца нельга. Трэба разглядаць сябе з цікаўнасцю ды рабіць разумныя высновы, што лепшых часоў не бывае і трэба жыць сённяшнім днём. "Не турбуйцеся заўтрашнім днём, бо заўтрашні сам пра сябе патурбуецца. Досыць кожнаму дню свайго клопату". Апостал Пётра. Канец цытаты...

Гутарыў Алесь ГАЎРОН

У АРХІЎНЫХ ДАКУМЕНТАХ — ГІСТОРЫЯ КРАІНЫ І ЛЁСЫ ЛЮДЗЕЙ

Лічаныя месяцы засталіся да далучэння Літвы і Польшчы — краін, з якімі мы так многа маем агульнай гісторыі — да Еўрапейскага Саюза, што шмат каго ў Беларусі і палохае. Але толькі не беларускіх архівістаў. Даўно ўсталяваныя сувязі паміж дакументальнымі службамі краін нічога не згубяць ад пашырэння эканамічнай супольнасці. Так лічыць старшыня Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце міністраў Беларусі Уладзімір АДАМУШКА. Міжнароднае архіўнае супрацоўніцтва, камерцыйная дзейнасць архівістаў і праблемы галіны — вось тэмы, цікавыя чытачам "ЛіМа".

АБ УЗНАГАРОДАХ І ПРАЕКТАХ

Але пачынаць гутарку давялося з віншаванняў, і невыпадкова. Беларускія архівісты, і Уладзімір Адамушка ў тым ліку, нядаўна сталі лаўрэатамі Дзяржпрэміі за выданне "Беларускія остарбайтэры".

— Гэта пяць кніг, з якіх адна — аналітычнае даследаванне, а астатнія чатыры — зборнікі дакументаў, якія тычацца праблемы вывезеных на працу ў Германію беларусаў падчас Другой сусветнай вайны. Хацеў бы сказаць, што ні ў Еўропе, ні ў свеце нічога падобнага па гэтай тэматыцы яшчэ не выдавалася. Некаторыя даследаванні па праблеме праводзіліся і на захадзе, і на ўсходзе, аднак нашае выданне — самае грунтоўнае. Праца над ім пачалася яшчэ ў 1993 годзе. Сюды ўвайшлі матэрыялы архіваў Беларусі, Германіі, Расіі і Латвіі. Дзякуючы добрым кантактам, атрымлівалі ўсе патрэбныя дакументы без аніякіх перашкод. Дарэчы, ужо пасля атрымання Дзяржаўнай прэміі, мы зрабілі падобнае выданне разам з аўстрыйцамі — "Беларускія остарбайтэры ў Аўстрыі". Яно выйшла як сумеснае.

Што тычыцца праблем Другой сусветнай вайны, то сёння, ідучы насустрач 60-годдзю вызвалення Беларусі, мы многа працуем над спецыяльнымі архіўнымі выданнямі. Нядаўна ўбачыў свет даведнік "Месцы прымусовага ўтрымання ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі"; у лютым, спадзяёмся, выйдзе зборнік дакументаў "Лагер смерці Трасцянец". Вядома, што гэта — трэці ў свеце лагер па колькасці знішчаных асоб грамадзянскага насельніцтва, і тым не менш, да гэтага часу сур'ёзнай распрацоўкі гэтай тэмы не было. Да вызвалення Беларусі таксама рыхтуем зборнік матэрыялаў "Вызваленая Беларусь".

— Кажуць, не так даўно быў уведзены знак "Ганаровы архівіст Беларусі"...

— На самай справе, ён зацверджаны Указам Прэзідэнта яшчэ ў ліпені мінулага года. І яго ўжо атрымалі сем лепшых архівістаў краіны. 21 студзеня, на выніковай калегіі Камітэта па архівах і справаводстве і адбылося першае ўзнагароджанне нашых найбольш сталых архівістаў.

ПРАПАНОВА ВЫЗНАЧАЕ ПОПЫТ?

— Рэаліі новага часу дыктуюць попыт на рарытэты сярод крымінальных структур. Якая вядзецца праца па ўдасканаленні іх аховы?

— Ёсць многа традыцыйных спосабаў. Па-першае, гэта доступ да архіваў: акрамя адказных за асабліва каштоўныя сховішчы, у іх не мае права ўваходзіць ніхто, нават іншыя супрацоўнікі архіва. Самая вялікая праблема — праца даследчыкаў з дакументамі ў чытальных залах. Але ў шэрагу нашых устаноў ужо ўсталяваныя сістэмы відэаназірання, якія даюць магчымасць сачыць за захаванасцю архіваў. Што да дакументаў XIV—XVI стагоддзяў, то даследчыкі працуюць з фондам карыстання — з копіямі, калі іх, канечне, можна зрабіць.

— Але існуе і адваротны бок медаля: трэба забяспечыць доступ да архіваў усім зацікаўленым. Ці з'яўляецца камп'ютэрызацыя архіваў дасканалым выйсцем з сітуацыі?

— У людзей нашай прафесіі тры асноўныя клопаты: гэта камплектаванне архіваў дакументамі, забеспячэнне захаванасці і навуковае іх выкарыстанне. Зараз мы працуем над тым, каб на кожным з этапаў максімальна эфектыўна скарыстаць новыя інфармацыйныя тэхналогіі. У шэрагу архіваў камп'ютэрная тэхніка ўжо выкарыстоўваецца для навукова-даведачнага апарата, але яшчэ трэба многа зрабіць, каб перавесці самі архівы на электронныя носьбіты. Тут, на жаль, ёсць праблемы.

Вядома, што, скажам, на плёнцы інфармацыя можа захоўвацца да ста гадоў — але яшчэ ніхто ў свеце дакладна не вызначыў гэты тэрмін для новых носьбітаў — дыскет, кампакт-дыскаў. Гэтымі праблемамі, дарэчы, займаецца Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі.

А што рабіць з тымі дакументамі, якія зроблены справаводствам у XIV—XVI стагоддзях? Адна справа можа налічваць 3-4 тысячы старонак, і сёння яшчэ свет не прыдумаў, як жа "зняць" гэтыя справы звычайнымі сканерамі. Чыста тэхнічная дэталь: калі разгортваеш сучасную кнігу, не заўсёды зробіш 180 градусаў; а тыя фаліянты сшытыя адмыслова — і як іх разгарнуць, каб зрабіць здымкі? А калі расшываць гэтыя справы, мы можам іх пашкодзіць.

— Наколькі запатрабаваная архіўная інфармацыя ў краіне сёння?

— У апошняе дзесяцігоддзе, пасля атрымання суверэнітэту, былі рассакрэчаны і выпушчаны ў навуковы ужытак шматлікія партыйныя архівы. Як следства, узнікла патрэба ў іх вывучэнні. Прывяду прыклад: у Нацыянальным гістарычным архіве памяшканне чытальнай залы, на наш погляд, зусім не малое; але часам месцаў усім жадаючым не хапае.

— А ўвогуле, ці сапраўды павялічылася наша цікаўнасць да сваіх родавых каранёў? Ці імі больш цікавяцца замежнікі, продкі якіх былі беларусамі?

— Я б не падзяляў на тутэйшых і замежнікаў: і тыя, і тыя цікавяцца сваімі каранямі. Але пачатак гэтаму, мусіць, паклалі замежнікі. Трэба сказаць, што гэтая паслуга ў нас платная.

Кожны грамадзянін мае права прыйсці і саставіць генеалагічнае дрэва самастойна. Праўда, мы ўсё роўна возьмем плату за аказанне кансультацыйных паслуг.

ДАЛІКАТНАЕ СЯБРОЎСТВА

— Як ажыццяўляецца супрацоўніцтва з архіўнымі службамі іншых краін, у першую чаргу тых, з кім мы маем агульную гісторыю, а значыць і шмат агульных дакументаў?

— У 2003 годзе ў мяне адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі архіўных служб Літвы і Польшчы, хаця дагэтуль мы не сустракаліся некалькі год. У нас даволі моцныя і добрыя кантакты з архіўнымі службамі гэтых краін, а таксама Украіны і Расіі. Сёння мы можам атрымаць любы дакумент, які тычыцца беларускай гісторыі. Размова ідзе толькі пра копіі, таму што ёсць сусветнае архіўнае правіла "недзялімасці фонду": што ўжо ёсць на пастаянным захоўванні, на тое нельга прэтэндаваць. Толькі асобныя міждзяржаўныя дамоўленасці могуць стаць выключэннем з гэтага правіла.

Ёсць сумесныя праекты. Зараз з архівістамі Польшчы робім даведнік па фондах Радзівілаў, — таксама першы ў свеце. З архівістамі Расіі рыхтуем зборнік дакументаў "Вызваленая Беларусь", з украінскімі калегамі ў гэтым годзе будзем таксама сустракацца па пытаннях сумесных праектаў. Што датычыць архівістаў Расіі, то ў нас нават існуе такі орган, як сумесная калегія, якая праходзіць адзін раз на год ці ў Расіі, ці ў Беларусі. Апошняя адбылася ў лістападзе мінулага года. На ёй мы зацвердзілі план сумесных дзеянняў на 2004—2006-ы гады.

— У гэтым годзе Літва і Польшча ўступаюць у Еўрасаюз. Ці прадбачацца нейкія перашкоды супрацоўніцтву?

— Я не думаю, што гэта стане нейкай перашкодай. Разумееце, стасункі архівістаў былі не толькі пасля 1991-га года. Можа, цяпер яны больш інтэнсіўныя сталі, але заўсёды ў нас ішлі абмен дакументальнымі матэрыяламі ці праца над сумеснымі праектамі.

— Вядома, што шмат каштоўных архіваў падчас Другой сусветнай вайны былі вывезены за межы Беларусі, у тым ліку ў Расійскую Федэрацыю. Ці з ахвотай адгукаюцца калегі на запыты аб вяртанні нацыянальнага скарба?

— Дзе, што, чаму, як, пры якіх умовах аказалася — гэта трэба высвятляць. Разам з Беларускім фондам культуры ў гэтым годзе мы выдаём зборнік дакументаў "Вяртанне-8". Гэта адзін з праектаў, мэта якога — паказаць, што ёсць на архіўных дакументах беларускай гісторыі, якія знаходзяцца за мяжой.

Праблема рэстытуцыі — гэта дзяржаўная праблема. Гэтая справа даручана Міністэрству культуры, і працы яму тут хопіць на доўгія гады. Справа вяртання каштоўнасцей даволі далікатная. Магчыма, тыя ведамствы, у якія мы часам накіроўваем запыты, і сапраўды не маюць дакладнай інфармацыі; ды і не заўсёды можна па тым ці іншым дакуменце прасачыць шлях рарытэта. Магчыма, многія даўно ўжо ў прыватных калекцыях...

КАДРЫ, ЯКІЯ ВЫРАШАЮЦЬ...

— Вядома, што ў краінах былога Саюза зараз вельмі сур'ёзна паўстае праблема падрыхтоўкі архіўных кадраў. Ці актуальна яна для Беларусі?

— Раней архіўныя кадры для Беларусі рыхтаваліся Маскоўскім дзяржаўным гісторыка-архіўным інстытутам. То была своеасаблівая школа савецкай, а то мо і еўрапейскай архіўнай справы. Але са зменай эканамічных адносін гэтае пытанне паўстала перад намі.

На гістарычным факультэце БДУ адкрыта архіўнае аддзяленне. Існуе стацыянар і завочная форма навучання. Трэба дадаць, што тры гады таму на гістфаку адкрылася новае аддзяленне, якое займаецца выключна праблемамі дакументазнаўства і інфармацыйным забеспячэннем кіравання. Дарэчы, конкурс там даволі высокі, ды й аддзяленне невялікае — усяго 15 чалавек.

Што тычыцца далейшай падрыхтоўкі, пры Беларускім навукова-даследчым інстытуце дакументазнаўства і архіўнай справы існуе аспірантура. Некаторы час існаваў і свой савет па абароне кандыдацкіх дысертацый, зараз мы працуем над тым, каб яго ўзнавіць.

— Не адбываецца дэфіцыту кадраў, ці наадварот, іх перападрыхтоўкі?

— Пакуль мы ўсіх выпускнікоў бюджэтнай формы навучання забіраем да сябе на працу па размеркаванні. Бо патрэба ў спецыялістах ёсць. Магчыма, больш нам не трэба адкрываць дадатковых аддзяленняў.

P.S. Гэта можа падацца залішнім пафасам, але роля архіваў у жыцці краіны сапраўды недаацэненая. Штогод архіўныя службы Беларусі выконваюць да 40 тысяч запытаў сацыяльна-прававога характару, якія тычацца жыцця чалавека; і такім чынам, па словах спадара Адамушкі, перш за ўсё працуюць для людзей. Чалавек нарадзіўся, ажаніўся, памёр — усё гэта праходзіць у дакументах праз архіўную службу.

Мікалай АНІШЧАНКА

ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА ЦІ ПОЛАЦКАЯ РУСЬ?

Працэсы дзяржаўнага будаўніцтва абумоўліваюць вострую неабходнасць больш глыбокага даследавання гісторыі фарміравання беларускай дзяржаўнасці на пачатковым этапе. Паводле тэорыі маскоўскага даследчыка прафесара В. Сядова, тэрытарыяльныя, этнаграфічныя і моўныя прыкметы, уласцівыя беларускай народнасці, пачалі складвацца яшчэ ў перыяд славянскага асваення Верхняга Падняпроўя, Падзвіння і Панямоння, пачынаючы з VII—VIII стагоддзяў.

Каланізацыя велізарнейшых абшараў зямель усходнееўрапейскай раўніны характарызавалася з'яўленнем першых гандлёвых цэнтраў, стварэннем устойлівай сістэмы гандлёвых шляхоў, старажытных гарадоў.

І хоць гэтыя змены ішлі даволі марудна, яны істотна ўплывалі на ўзрастанне эканамічнай і палітычнай ролі роду-племянной знаці, баярства ў асобных землях. Пачаўся працэс утварэння зямель-княстваў, які канчаткова замацоўваў вярхоўную ўладу за прадстаўнікамі пэўнага роду.

Кожнай зямлі патрэбны быў свой князь, які б мог абараніць інтарэсы землеўладальнікаў, гандляроў, насельніцтва ад знешніх і ўнутраных рабаўнікоў. З'яўляючыся носьбітам вярхоўнай улады, князь меў свой стол (сталіцу), збіраў падаткі (даніну) і ваенныя ўзброеныя сілы з усёй зямлі. Тут на месцах (удзел) кіруючае становішча паступова займалі яго браты, сваякі, альбо малодшыя васальныя князі.

Агульна прызнана, што першымі буйнымі гарадамі ўсходніх славян былі Ноўгарад, Полацк і Кіеў. Яны сталі аб'яднаўчымі цэнтрамі трох раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў — Наўгародскай, Полацкай і Кіеўскай Русі. Узнікненне гэтых дзяржаў нагадвае працэсы развіцця нямецкіх зямель. Як у Германіі, так і на Русі былі створаны суверэнныя дзяржавы-княствы, на тэрыторыях якіх уладальнікі мелі фактычна ўсе поўныя прэрагатывы дзяржаўнай улады, самастойна вырашалі шырокі круг пытанняў унутранай і знешняй палітыкі.

Добра вядома, што адным з самых старажытных гарадоў усходніх славян быў Полацк (Полотеск). Полацкае гарадзішча, на думку археолагаў, заснавана ў III — IV стагоддзях н. э. Першымі жыхарамі Полацка летапісцы называюць крывічоў. Цалкам абгрунтавана думка, што назва палачане (Полата) мае не этнічнае, а дзяржаўнае паходжанне (па назве дзяржавы, існаваўшай з самых старажытных часоў). У яе складзе было некалькі племянных аб'яднанняў усходніх славян, уключаючы крывічоў, дрыгавічоў, часткова велетаў-люцічаў, славеняў, угра-фінаў.

Аб пачатковым этапе фарміравання дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі ў гэты час можна гаварыць даволі ўпэўнена. У IX стагоддзі Полацк стаўся адміністратыўным цэнтрам дзяржавы, якая мела свайго князя. А той у сваю чаргу прызначаў, або зацвярджаў мясцовую кіраўнічую бюракратыю (баяры, пасаднікі, старасты), ствараў узброеныя сілы (дружыну), будаваў пагосты-крэпасці па зборы даніны.

Яскравым сведчаннем з'яўляецца адмова Полацкай зямлі ўдзельнічаць у «Вялікім пасольстве» (862 г.), калі «Полата» перадумала паслаць свайго прадстаўніка «мужа знатнага» за мора, бо не хацела ў будучыні падпарадкоўвацца князям і намеснікам прышэльцаў. Моцнае супраціўленне-сустрэў тут наўгародскі князь Рурык. На працягу дванаццаці гадоў ён вымушаны быў весці напружаную барацьбу з «всеполотьским князем Рославом», а потым — Усямірам. Таму была Полацкая зямля Рурыку, «як костка ў горле». У 879 г. адправіўся ён у ваенны паход каб «канчаткова прымучыць Полату» і авалодаць верхнім цячэннем Дняпра, Прыпяццю, Дзвіной, ды нечакана памёр.

Князю Алегу (879 — 912 гг.) не ўдалося адразу падпарадкаваць Полацкую зямлю. Толькі пасля смерці Усяміра (903 г.), калі палачане не змаглі дамовіцца аб дастойнай замене князю, Алег сілай навязаў свайго стаўленніка, («быў не клікнут вечам»), Гудыма.

Аб існаванні дзяржавы на тэрыторыі Беларусі ў часы Кіеўскай Русі можна гаварыць адназначна. З 970 года ў Полацку самастойна княжыў Вялікі князь Рагвалод. Яго выключнае становішча сярод іншых князёў летапісец Нестар падкрэсліў словамі: «Трымаў Полацкую зямлю і валодаў ёю, і княжыў у ёй». Маскоўскі летапісец удакладняе, што Рагвалод вярнуўся ў Полацк у дні пачатку княжэння Святаслава Ігаравіча і спешна заняўся ўмацаваннем сталіцы. Хутка ставіўся новы горад са сценамі з дуба, абарончымі вежамі, дазорнымі башнямі, ровам з вадою.

Засяляў Рагвалод Полацк людзьмі, якія былі ўмельцамі ў розных рамёствах: варыць жалеза і сталь, абцёсваць камяні, каваць мячы, кляпаць ралы, косы, сярпы, нажы, ляпіць гаршчкі і посуд, ладзіць збрую коням, шыць вопратку і абутак, рубіць ладдзі і стругі, будаваць церамы і палаты, масціць дарогі і вуліцы, насцілаць гаці і масты.

Удала скарыстаў Рагвалод імперскія намаганні Кіева ў бок Балкан і Дуная. Да 980 года больш чым у два разы пашырыў межы дзяржавы, ахапіў уладай землі ад Балтыйскага мора і Фінскага заліва да Буга, Прыпяці, Нёмана, уключаючы вярхоўі Волгі і Дняпра. У гэты час Полацкае княства — моцная раннефеадальная дзяржава з усімі адпаведнымі атрыбутамі: суверэнная ўлада князя і абмежаваная — народнага веча, дзяржаўная адміністрацыя, прызнаная ўсімі сталіца, зачаткі грашовай сістэмы, дзяржаўнае падаткаабкладанне, мясцовае кіраванне.

Улічваючы геапалітычныя намаганні Полацка ў бок Балтыкі і падначаленне шэрага прыбалтыйскіх плямёнаў, інтарэсы ў Карэліі, Скандынавіі, шырокі гандаль з Візантыяй, Полацкую дзяржаву, на маю думку, трэба разглядаць на аднолькавым узроўні з Кіеўскай. Да сярэдзіны X стагоддзя Полацкая зямля была асобнай дзяржавай са сваёй княскай дынастыяй, моцным войскам, сваім ладам жыцця.

Побач з Кіеўскай Руссю, дзе дзяржаўны лад хутка набываў жорсткую цэнтралізаваную еўрапейскую форму феадальнай манархіі, гістарычна непазбежна павінна была ўзнікнуць дзяржава з шырокай аўтаноміяй для ўваходзіўшых у яе склад зямель, дзе важкім органам улады доўга заставалася народнае веча. Такую задачу ў IX—XI стагоддзях выканала Полацкая Русь. Гэтая дзяржаўная назва мае поўнае права на ўжытак, як у сістэме народнай адукацыі, так і ў навуцы.

Генадзь ЖЫЛІНСКІ,
кандыдат гістарычных навук

ДАБРАЧЫННАЯ АКЦЫЯ

Васіль ГАДУЛЬКА

КРЫТЫЧНЫ ЎЗРОСТ

(актавы)

I

Крытычны ўзрост —
пражытых дзён суддзя —
не мог для нас прыдумаць іншай кары,
як даць нам зразумець,
што сэнс жыцця —
не ў намаганнях здзейсніць тыя мары,
дзеля якіх з нас кожны, як дзіця,
праз лес расчараванняў, праз ахвяры
ўсляпую ўпарта свой пракладваў шлях,
якому ў безвыходнасці працяг.

II

Шлях да здзяйснення мары —
шлях бясконцы.
Мінулае на кожнай, наўздагад
разгорнутай, гісторыі старонцы
прыводзіць прыклады злачынстваў, здрад,
якіх і ты — гвалтоўна ў дзёрзкай гонцы
ламаючы заведзены расклад —
ахвярай стаў, бо спатыкаўся ў спешцы
і зноў працягваў гэты бег на месцы.

III

Знясілены, цяпер — калі б ты мог
яшчэ раз паўтарыць сябе самога —
адмовіўся б ад пройдзеных дарог
і марных спроб прыспешыць волю Бога;
як зрэнку вока ты б цяпер бярог
недаўгавечны скарб жыцця зямнога
і з часам, дзеля сціплай мэты — жыць,
імгненнем навучыўся б даражыць.

IV

На свеце ж не існуе — і не трэба —
нічога больш надзейнага, апроч
таго, каб здабываць кавалак хлеба;
каб сонечным быў дзень і зорнай ноч;
каб на зямлі свайго мець кроплю неба —
святла ў жывых крынічках родных воч;
каб, не зважаючы на ўсе напасці,
шчаслівым быць, не марачы аб шчасці.

V

Няпросты стан душы — крытычны ўзрост:
тупік, з якога ты павінен выйсці,
але да мэты прывіднай наўпрост
цяпер ты ўжо не зможаш, як калісьці,
узяць і ў думках перакінуць мост,
бо ўжо адчуў у дзён пажоўклым лісці
шчымлівы халадок, а ў сэрцы — сум
і горыч тых, няздзейсненых, задум...

Сталыя чытачы "ЛіМа", пэўна, памятаюць, што ў верасні мінулага года мы публікавалі ўспаміны пра заўчасна адышоўшага паэта з Берасцейшчыны **Васіля ГАДУЛЬКУ**. Пасля таго як былі выдрукаваныя яго лепшыя вершы, паўстала пытанне не толькі пра выданне зборніка паэзіі, але і пра ўсталяванне на могілках вёскі Федзькавічы Жабінкаўскага раёна надмагільнага помніка на месцы пахавання паэта і яго бацькоў. Так ужо склалася трагічнае жыццё гэтай сялянскай сям'і. Многа рупіўся, рваў душу і сэрца, каб хоць як "увекавечыць" непрызнанага сябра паэт Васіль Сахарчук, дзякуючы якому і захавалася пераважная большасць літаратурнай спадчыны Васіля Гадулькі (рукапіс так і невыдадзенага зборніка пры бібліятэцы часопіса "Маладосць" захоўваецца ў мяне, а асноўная частка архіва, са слоў А. Каско, у Берасцейскім выдавецтве С.Лаўрова).

Ужо больш за дзесяць гадоў як няма з намі Васіля Гадулькі. Сышоў з гэтага свету, так і не прабіўшы глухую сцяну непаразумення, Васіль Сахарчук, адзіны яго сябар ... і памяць пра паэта пачала зарастаць травой абыякавасці...

(Я ўжо прапаноўваў неяк цяперашнім кіраўнікам СБП арганізаваць разам з вядомымі літаратарамі вечарыну прысвечаную жыццю і творчасці паэта ў Жабінцы пры падтрымцы выканкама, і пры яго ж матэрыяльнай дапамозе ўсталяваць хоць які сціплы хрысціянскі помнічак на чатырох безымянных грудах сям'і Гадулькаў...)

І вось на днях зазірнуў у рэдакцыю "ЛіМа" паэт Алесь Разанаў, ухваліў нашу публікацыю ўспамінаў пра нязнанага ім Васіля Гадульку: *"Паэт класічнай школы. Такіх у нас было і ёсць нямнога, а каб яшчэ лёс даў яму выявіцца напоўніцу?! Можа, абвясціць дабрачынную акцыю: хто колькі можа..."* — і тут жа, не адыходзячы, зрабіў свой важкі унёсак.

Але не так ужо важная сума нашага ўнёску — пяцьсот рублёў, тысячу, пяць тысяч — наколькі важны наш душэўны ўклад у агульную скарбніцу па захаванні нашай нацыянальнай памяці. Глядзі ж, адгукнуцца не толькі асобныя прыхільнікі беларускай літаратуры, але і грамадскія ды камерцыйныя арганізацыі і ўстановы, і — мала-паціху айчыннай грамадой на ўгодкі паэта (нарадзіўся Васіль Гадулька 17 траўня 1946 года) і яго адзіную кніжачку выдадзім і помнічак беларускім людзям паставім...

Паэт варты нашай пашаны. У гэтым, спадзяюся, вы ўпэўніцеся прачытаўшы і выдрукаваныя тут яго актавы.

Леанід ГАЛУБОВІЧ

(Імёны ўсіх, хто зробіць свой пасільны ўнёсак будуць перыядычна друкавацца ў нашым штотыднёвіку.

Кантактны тэлефон: 284-44-04.)

Ахвяравалі на ўшанаванне памяці паэта Васіля ГАДУЛЬКІ:
А.Разанаў, А.Казлоў, В.Шніп, У.Саламаха, Л.Галубовіч, В.Патапенка, М.Мятліцкі, У.Марук, П.Гаспадыніч, А.Бадак, А.Федарэнка, К.Камейша, Ю.Станкевіч, А.Брава...

Аляксей КАЎКА:

"...слова роднае такі прабілася да жыцця з-пад іншамоўных стыхій і трывала замацавалася на літаратурнай карце новага часу. Можна, аказваецца, з сумнай мінуўшчыны чэрпаць аптымізм: як там ні было — і цяжка і безнадзейна, але ж вытрываў, не здаўся беларус. Янка Брыль вельмі трапна, па-ўзнёсламу хораша прыкмеціў неадольную жыццядайную сілу нашага роднага парастка: "...пралез паміж дзвюма стыхіямі, рускай і польскай, насуперак усім... пралез і вырас са сваім і зрэбным, і глыбока, панароднаму, па-хлебнаму свежым беларускім словам. І славы не было, а толькі адчуванне абавязку".

Пятро ВАСЮЧЭНКА. *"Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі"* (казачныя аповесці, для сярэдняга школьнага ўзросту; Мінск, выд-ва "Мастацкая літаратура", 2003г., мастак У.Лукашык, рэдактар Н.Філіповіч, 2000 экз., 100 стар з іл., кошт 5540).

Даволі часта ў гэтай сваёй рубрыцы я крытыкаваў аўтараў сучасных дзіцячых кніжак, найперш за тое, што яны як бы не патрапляюць за ходам часу і палётам падлеткавай фантазіі... І што ж, здавалася б, змушаны я казаць зараз, прачытаўшы вышэй азначаныя казачныя аповесці Пятра Васючэнкі? "Беларускі мезазой" ды годзе! Але то павярхоўны погляд.

Бо насамрэч даўно я не чытаў дзіцячай кніжкі з такой насалодай.

Па-мастацку *выштукаваны* тэкст, поўны дзівосных алегорый, не пакідае чытачу роздыху на рызыкоўныя супастаўленні, паколькі ў прамым і ў пераносным сэнсе *задушвае* непадробным гумарам ды самавітай аўтарскай іроніяй. Адточаная беларуская мова, гарманічна спалучаная з фальклорам і "трасянкай", ані не выпадае з сучасных лінгвістычных канонаў.

— Шаноўныя мамзелі, хто хоча пастрыгчыся па апошняй французскай модзе, валі сюды.

Дзеўка Дрыпа стала насупраць будана губу адвесіўшы. А панок, прыкмеціўшы яе, пытае:

— Чаго зяпу раскрыла, шаноўная мамзеля?

— Выбачайце, спадарыку, — нясмела кажа дзеўка Дрыпа, — ці не вашэць летась стрыгла авечкі ў тутэйшага пана Кіндзюшкі?

— Не, гэта не я! — спрытна адказвае панок. — Я з Парыжа, французскі цырульнік, гэта павашаму пастрыгач. Магу й цябе пастрыгчы, шаноўная мамзеля, — станеш вочынна красівая, вужасна прыўкрасная!

У якім часе мы тут апынаемся, **што** і **каго** парадзіруе аўтар?! Тота! Вышэйшы літаратурны *пілатаж*.

І хоць рэч у кніжцы вядзецца пра шляхту, што як бы само сабой (яшчэ са школы ўбітае ў галовы) падразумевае негатыўнае стаўленне да герояў, аднак пытанне набывае двуякі ракурс, калі ўспамінаеш, што нават за саветамі беларускі калгаснік на фоне, прынамсі, расейскага — выглядаў *шляхціцам* (у нармальным сэнсе гэтага слова), асабліва ў адносінах да працы, свайго побыту і культуры. Таму абсалютна не здзіўляе пасляслоўная аўтарская "наводка" (для дзятвы, пэўна, неабходная): *"Вось распавёў вам пра неверагодныя прыгоды паноў Кубліцкага ды Заблоцкага. Казаў, як было, не маніў, ані. Каб я надумаўся прылгаць, дык прыдумаў бы ў гэтай аповесці іншы канчатак. Я б напісаў, што паны перавыхаваліся, развіталіся са сваім шляхецтвам ды ўступілі ў калгас. Вядома, бывае і такое, свет вялікі. Але мае паны засталіся тымі, што й былі, адно што пыхі ў іх крыху паменела..."*

Нехта можа падумаць, што аўтар адкрыта "здзекуецца" са сваіх суайчыннікаў, *вымалёўваючы* іх унутраны і вонкавы свет жыцця такімі карыкатурна-скамарошнымі *фарбамі* (і тут бы мне не забыцца адвесіць пашанотны паклон таленавітаму мастаку гэтай кніжкі Уладзіміру Лукашыку). Але ж паралельна (а то і адначасна) аўтар паказвае і кемнасць, і жывучасць, і ўпартасць, а, у рэшце рэшт, і сапраўдную шляхетнасць (інтэлігентнасць і генную духоўнасць) сваіх герояў.

Асабліва ўражвае кот Буркун, любімец паноў, які, аднойчы пакрыўдзіўшыся, ўсё ж пакідае іх, але ж — як, заўважце:

— ...Пайду. Мне ўжо даўно хацелася свет паглядзець, сябе паказаць. Здаровы бывайце, мяне не забывайце.

Яшчэ раз махнуў хвастом на развітанне і пайшоў. Мышы хацелі былі за ім увязацца, але ён ім не дазволіў.

— Заставайцеся тут, — загадаў ён ім. — ***Трэба быць патрыётамі роднай хаты.*** (Выпучэнне маё — **ЛеГал.**)

Казачныя аповесці для дзяцей Пятра Васючэнкі будуць карыснымі для ўсіх. Гэта своеасаблівая, агулам *падрахаваная* характарыстыка беларускай нацыі (дзе наўпрост, дзе намёкамі ды штрыхамі) ад яе даўніх да сённяшніх дзён.

Адным словам, пакуль паны *"вымышляюць"*, як на свае таленты ў Смургонях замежны "віскас" купіць, ад іх трэба чакаць новых прыгодаў. *"Не турбуйцеся! — запэўнівае нас аўтар. — Яны будуць! З такімі шалапутамі, як вы, яны заўсёды будуць здарацца..."*

М.Р.Ярош. *"Пясняр роднай зямлі"* (манаграфія жыцця і творчасці Янкі Купалы; Мінск, выд-ва "Беларуская навука", 2003г., прадмова В.Жураўлёва, рэдактар Г.Малахава, 2500 экз., 340 стар., кошт 2210).

Аўтар гэтай перавыдадзенай (першае выданне 1982г.) кніжкі — Міхаіл Рыгоравіч Ярош — мой зямляк. Нарадзіліся мы з ім у сумежных вёсках, раздзеленых трохкіламетровым лесам. На жаль, ён ужо нябожчык. А пры жыцці мы з ім так і не ўбачыліся...

І вядома, што не з рукі мне крытыкаваць гэтую кніжку. Зрэшты, да яго — таленавітага літаратуразнаўцы, які па тым часе напісаў пра Янку Купалу ў межах *дазволенага* — у мяне няма аніякіх прэтэнзій.

У мяне ёсць прэтэнзіі да тых, хто даў "дабро" на выхад гэтай кніжкі ў свет, тым самым *скампраметаваўшы* ў вачах сучаснай інтэлігенцыі не толькі самога аўтара, але ўскосным чынам і вобраз вялікага класіка нацыянальнай літаратуры.

Прамінула ледзь не дваццаць гадоў, як пачаў *рэстаўрыраваца* ад налёту бальшавіцкага ідэалагічнага фальшу жыццёвы шлях і творчы плён Янкі Купалы. І раптам — гэтая кніжка, **"разлічаная на выкладчыкаў ВНУ, студэнтаў, настаўнікаў"**, з двума раздзеламі, якія гавораць самі за сябе нават сваімі назовамі: *"Рэвалюцыю ўслаўляючы"* ды *"Песні сацыялістычнаму абнаўленню"* (дзе нават не згадваецца, а хутчэй замоўчваецца, спроба самагубства паэта ў 1930-м і многія іншыя цяпер ужо афіцыйна "рассакрэчаныя" факты).

"Купала быў цвёрда перакананы, што "дыктатура працы" зруйнуе "свет рабаўласнікаў і турмаў", што "настане такая часіна", калі "развеюцца ў попел кароны і троны". ***Веру паэта жывіла сама савецкая рэчаіснасць"*** (выпучэнне маё — **ЛеГал).** І ўсё астатняе прыкладна ў гэткім жа стылі. І як жа сёння, скажыце мне, успрымаць падобную ідэалагічную дыдактыку сучасным абазнаным выкладчыкам і студэнтам?! (Дарэчы, калі рэдактара гэтага выдання, доктара філалагічных навук П.Дзюбайлы ўжо няма ў жывых, як і аднаго з рэцэнзентаў, вядомага крытыка В.Бечыка, то як адрэагуе на перавыданне кніжкі другі не менш вядомы рэцэнзент А.Лойка, сказаць пакуль цяжка...)

Дзеля таго, каб змікшыраваць сітуацыю з перавыданнем, прыкладаецца да яго прадмова загадчыка аддзела гісторыі беларускай літаратуры XX ст. Інстытута літаратуры НАН Беларусі, доктара філалагічных навук В.П.Жураўлёва.

Адразу скажу, што яна (прадмова) *каштуе* добразычлівых чытацкіх слоў. Напісана дасціпна, разумна, у кантэксце сучаснага літаратурнага (і не толькі беларускага, што робіць гонар вучонаму) працэсу. Безумоўна, што сам гэты артыкул прыдаўся б для публікацыі ў любым літаратурна-мастацкім выданні.

Але ж вось не пакідае даймаць неадступнае пытанне: навошта *адвакатура* там, дзе можна было б пазбегчы нават замаху на *злачынства*? Прашу прабачэння за крымінальную лексіку.

"У некага могуць узнікнуць пытанні, а можа, нават пярэчанні і сумненні: а ці варта было наогул перавыдаваць літаратуразнаўчую кнігу даволі паважанага ўзросту, якая ў параўнанні з новымі, лепшымі працамі пра купалаўскую творчасць апошняга часу мае ў чымсьці і відавочныя мінусы? Так, час робіць нас мудрэйшымі і разумнейшымі, больш дальнабачнымі і відушчымі. Аднак пагодзімся з тымі крытыкамі і літаратуразнаўцамі, якім і сапраўды ўдалося ўзняцца на новую ступень разумення складаных літаратурных з'яў, але яшчэ мацнейшай стала і іх ад гэтага перакананасць у тым, што літаратурная сучаснасць у сваіх дасягненнях у многім і многім абавязана духоўна-эстэтычнай сіле традыцый і пошукавым намаганням вытлумачыць і спазнаць ісціну ў ***найбольш аптымальных варыянтах яе існавання"*** (выпучэнне маё — **ЛеГал).** Вельмі дзіўная пазіцыя, карыстаючыся прынцыпамі якой можна давесці *жыццёвасць* нават *аджыўшых* рэчаў.

Аднак нават высакакласны адвакат з імем не можа выйграць справу, калі яна пройгрышная ў сваім зародку. І як у дадзеным выпадку не пагадзіцца з высновай В.Жураўлёва, што *"патрэбны былі немалыя творчыя высілкі і прафесійная сканцэнтраванасць аналітычнай думкі, каб убачыць* ***сапраўднага Купалу".***

Каб зноў жа, пагаджаючыся з адвольнай, але дасціпнай і *смелай* трактоўкай В.Жураўлёва некаторых радкоў з дзіцячага верша Я.Купалы "Хлопчык і лётчык", не забываліся і мы ў сваёй звыклай аднадзённасці *"паглядзець... на іншы парадак і лад".*

"Пачынальнікі" (з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст.; Мінск, выд-ва "Беларуская навука", 2003г., укладальнік Г.Кісялёў, рэдактар А. Міхайлічэнка, 2500 экз., 550 стар., кошт 4680).

"Славутыя імёны Бацькаўшчыны" (зборнік, выпуск другі, Мінск, выд-ва "Беларускі фонд культуры", 2003г., уклад. У.Гілеп і інш., гал. рэд. рэдак. калегіі А.Грыцкевіч, рэдактар З.Лысенка, 2000 экз., 380 стар., кошт 9770).

Алесь МАРЦІНОВІЧ. *"Як Гурка ворагаў граміў"* (нарыс, для сярэдняга школьнага ўзросту; Мінск, выд-ва "Мастацкая літаратура", 2003г., мастак У.Аніська, рэдактар Н.Філіповіч, 2000 экз., 135 стар., кошт 4150).

Часта бываючы ў кнігарні, заўважаю, што цяпер выдаецца даволі шмат цікавых і неабходных кніг гістарычнай тэматыкі. Прычым выходзяць яны ў свет у добрым, а падчас і проста шыкоўным афармленні. Пераважная іх большасць вызначаецца адметным навуковым зместам і добрым літаратурным стылем.

Шкада толькі, што няпэўнасць ідэалагічнай палітыкі ў нашай дзяржаве прывяла да "ахаладжэння" адраджэнскіх парыванняў у многіх людзей малодшага пакалення і, на маю думку, прыгасла цікавасць да нацыянальнай гістарычнай літаратуры. Ці не таму сітуацыя нярэдка выглядае так, што кнігі гэтай тэматыкі ёсць, а чытач на іх не заўжды знаходзіцца (і не толькі з вышэй згаданай прычыны). Будзем спадзявацца, што час усё ўраўнаважыць...

Усе кніжкі, апроч напісанай А.Марціновічам, пра якія тут згадваецца, выдадзеныя пад рэдакцыяй вядомых нашых вучоных А.Грыцкевіча, Г.Кісялёва ды інш. Яны — на кожны дзень, як для дарослых, так і для школьнікаў. Біяграфіі знакамітых беларускіх людзей, іх жыццёвыя і творчыя шляхі — усё гэта даходліва, а іншым разам у новай інтэрпрэтацыі і з дагэтуль невядомых навуковых пазіцый выкладаюць аўтары артыкулаў у кнізе "Славутыя імёны Бацькаўшчыны": С.Тарасаў, Г.Галенчанка, І.Саверчанка, Я.Янушкевіч, У.Мархель, А.Бутэвіч, В.Скалабан... А зборнік "Пачынальнікі", складзены з дакументаў і архіўных матэрыялаў аб жыцці і творчай дзейнасці В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, Я.Чачота, А.Вярыгі-Дарэўскага, А.Гурыновіча, А.Абуховіча, Я.Лучыны... Да прыкладу, сам я з цікавасцю прачытаў невядомыя мне *следчыя пратаколы адносна Крошынскай школы і прачытаных П.Багрымам вершаў...*

У пазнавальна-займальным стылі выкладзены А.Марціновічам жыццё і ваенныя подзвігі генерал-фельдмаршала рускай арміі Іосіфа Гуркі, ураджэнца вёскі Бурнеўка, што на Кругляншчыне ў кніжцы для падлеткаў "Як Гурка ворагаў граміў". Любіў гэты Гурка, між іншым, Аляксандра Суворава і паспяхова пераймаў яго вопыт пераходу Альпійскіх перавалаў... Служыў вялікай імперыі — любіў малую бацькаўшчыну. Бывае, асабліва з беларусамі...

Уласна я, гартаючы старонкі кнігі "Славутыя імёны Бацькаўшчыны", нечакана для сябе даведаўся, што жывучы на вуліцы Кастуся Каліноўскага, маю не зусім правільна афармлены ў дакументах адрас уласнага пражывання, бо толькі пасмяротна было навязанае *"імя Кастусь герою і кіраўніку нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 года ў Беларусі і Літве Вікенцію (Вікенцію Канстанціну) Каліноўскаму"*. Аказваецца, перайменаваў яго член бюро ЦК КПБ Усевалад Ігнатоўскі ў сваім "Кароткім нарысе гісторыі Беларусі", каб таго не лічылі палякам, хаця сам Каліноўскі ва ўсіх сваіх асабістых дакументах ужываў імя Вікенці. Імя Кастусь спатрэбілася Ігнатоўскаму, каб *зрабіць* паўстанне сялянскім, якое такім па сутнасці з'яўлялася. Вось так.

Чытайце і, мажліва, даведаецеся, што вы таксама пражываеце па не зусім правільным адрасе.

Шаноўныя чытачы, усе гэтыя кніжкі вы можаце набыць у "КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА", (Мінск, вул.Казлова, 2).

ЛіМ

Выходзіць з 1932 ГОДА
У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Леанід ГАЛУБОВІЧ,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Вольга КУРТАНІЧ,
Віктар ПАТАПЕНКА — намеснік галоўнага рэдактара,
Віктар ШНІП — адказны сакратар.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19
ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-6673
намеснік галоўнага рэдактара — 284-4404
адказны сакратар — 284-6673

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-7965
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7965
літаратурнага жыцця — 284-7965
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7965
паэзіі і прозы — 284-7965
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно — 284-8153
выяўленчага мастацтва — 284-8153
карэктарская — 284-8091
бухгалтэрыя — 284-6672
Тэл./факс — 284-84-61

Электронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 1650
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 18.02.2004 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715

Заказ 300

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12